КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №48 (176)
◂ 24 СНЕЖНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**АЛЕСЬ БЕЛЯЦКІ**

Стар. 6

**БЕЛАРУСЬ–2009**

Прыгадаем, чым жыла краіна і мы разам з ёй у гэтым годзе. Топ падзей палітычнага жыцця краіны ў 2009 годзе

Стар. 5

**РАСІЯ СЫХОДЗІЦЬ У АКІЯН**

Новаму праекту ўжо нават прыдумалі назву — Ціхаакіянская Расійская Федэрацыя (ТоРФ)

Стар. 21

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–16

## ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Наступны нумар газеты выйдзе 15 студзеня 2010 года

АД РЭДАКЦЫІ

## З КАЛЯДАМІ І НОВЫМ ГОДАМ!



Фота Юрыя Дзядзінкіна

З Калядамі і Новым годам ад актывістаў грамадскіх арганізацый. Кампанія STOP 193.1

У кожнага з нас быў свой 2009 год. Са сваім зместам, радасцямі і непрыемнасцямі, дасягненнямі і няўдачамі, віражамі і ўзлётамі, сустрэчамі і растаннямі.

І будзе свой 2010-ы.

Падводзім вынікі. Плануем новае.

Што адбылося і прайшло — не перайначыць і наноў не пражыць. Тое, можа, і добра. Мінулае — мінуламу. А вось тое, што з года сышоўшага будзе мецьпрацяг у годзе новым, у кожнага з нас ёсць шанец адбудаваць па-новаму.

Можа, якраз за гэта — за магчымасць расквітацца з нядобрым у мінулым, выправіць хібы і вывесці сваё жыццё (хоць у малым, хоць у вялікім) на новую траекторыю — мы так і любім гэту ўмоўную дату на шкале часу, надыход новага года. І яшчэ за чаканне і за магчымасці перамен да лепшага.

У перакрыжаванні свята Раства Хрыстова і свята Новага года — найвышэйшая сімволіка. Да нас сказана: «Бог дапамагае тым, хто дзейнічае».

З пажаданнем актыўнага і дзейнага жыцця рэдакцыя «Новага часу» і віншуе сваіх чытачоў з Раством і Новым годам. У міры з сабой і навакольным светам.

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### АСТРАВЕЦ. ВІЛІЯ ЗАСТАНЕЦЦА БЕЗ ВАДЫ

Сябры Грамадскага каардынацыйнага экалагічнага Савета пры Міністэрстве прыроды даследавалі праблему Віліі ў выпадку пабудовы АЭС на Астравеччыне. Згодна праекта, прадугледжана татальная эксплуатацыя ракі. Штодня будзе забірацца 220 000 кубаметраў вады, а вяртацца толькі 110 000 кубаметраў. У афіцыйнай Справаздачы па ўплыву на навакольнае асяроддзе адсутнічаюць дадзеныя пра хімічны і тэмпературны склад адпрацаванай вады. Няма таксама звестак, куды патрапяць яшчэ 110 тысяч кубаметраў адпрацаванай вады. Эколагі лічаць, што рака можа згубіць шэраг прытокаў. Літоўскія эксперты занепакоены яшчэ тым, што рака працякае праз іх сталіцу, і з пабудовай АЭС на Беларусі тут можа ўзнікнуць шэраг прамых і ўскосных экалагічных праблем. Як сведчыць мясцовы праваабаронца Іван Крук, сусветная супольнасць паступова паўстае супраць рэалізацыі гэтага праекту.

### АШМЯНЫ. АРЫГІНАЛЬНАЯ НАВАГОДНЯЯ ЕЛКА

Два гады збіраў бутэлькі з-пад шампанскага жыхар райцэнтра Віктар Сінкевіч. Сабраўшы амаль дзве тысячы штук, ён зрабіў з іх навагоднюю елку. Два месяцы пайшло на пабудову: галінкі з бутэлек, а ствол давялося зрабіць з дроту. Зялёная прыгажуня ўжо стала мясцовай выбітнасцю. Сам аўтар праекту мае намер пабудаваць хату з бутэлек.

### БРЭСТ. ВЕЧАРЫНЫ ДЛЯ МОЛАДЗІ

21 снежня адбылося шоу з нагоды 10-годдзя культурна-асветніцкай арганізацыі «Дзедзіч». На «Дзедзіч-Party» ўдзельнікаў чакала сучасная беларуская музыка розных стыляў, беларускія тэксты, аранжыроўкі і беларускамоўны дыджэй. У праграме вечарыны былі забаўляльныя конкурсы з прызамі, феерычнае неон-шоу ад шоу-тэатра «Бліскавіца», майстар-клас па традыцыйных і старажытных беларускіх танцах і дыскатэка.

### ГРОДНА. КАЛЯНДАР З ЮБІЛЯРАМІ

Пабачыў свет перакідны каляндар на 2010 год. У ім змешчаны звесткі пра знакамітых людзей краю як мінулага, так і сённяшняга дня, якія ў будучым годзе адзначаюць круглыя даты. Укладальнікам выдання выступіў прафесар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы Аляксей Пяткевіч. Рэдагаваў каляндар лідзянін Станіслаў Суднік.

З НАГОДЫ

## КАБ ХРЫСТУС НАРАДЗІЎСЯ Ў СЭРЦАХ

**Вольга ХВОІН**

**Падчас візіту беларускіх біскупаў у Ватыкан, які адбыўся 11–17 снежня, Папа Рымскі Бенедыкт XVI звярнуў увагу, што Касцёл у сённяшнім свеце мусіць надаваць увагу такім праблемам, як трываласць сям'і, маральны стан грамадства, а таксама хрысціянскай фармацыі веруючых, асабліва моладзі.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Як расказаў арцыбіскуп мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч, Папа заклікаў Рымска-каталіцкі касцёл у Беларусі да больш цеснага супрацоўніцтва прыходаў і дыяцэзій, супрацоўніцтва з Беларускай праваслаўнай царквой, каб разам адказваць на выклікі часу. Бенедыкт XVI выказаўся за падпісанне дамовы Ватыкана з Беларуссю і засведчыў Рымска-каталіцкаму касцёлу ў Беларусі штодзённую падтрымку.

Па словах Кандрусевіча, сустрэча з пантыфікам была вельмі важная для яго асабіста — гэта магчымасць лепш азнаёміцца з жыццём дыяцэзій і апостальскай сталіцы. Справаздачы, якія рабілі беларускія біскупы, яго эселенцыя лічыць своеасаблівым рахункам сумлення святароў. Пасланне пантыфіка да біскупаў мусіць стаць падмуркам дзейнасці Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі на бліжэйшыя пяць гадоў.

Сярод важных падзей года ў Касцёле ў Беларусі мітрапаліт назваў перыгрынацыю абраза Ісуса Міласэрнага, будслаўскі фэст, II малітоўную сустрэчу моладзі, а таксама караванні цудатворных абразоў Маці Божага Тракельскай і Маці Божай Уладаркі Азёр. Таксама Тадэвуш Кандрусевіч падкрэсліў важнасць пілігрымак, якія з'яўляюцца сведчаннем веры для іншых людзей, ды свае візіты ў прыходы, што дазволіла лепш спазнаць жыццё Касцёлу ў Беларусі.

Напярэдадні свята Божага Нараджэння мітрапаліт звярнуўся да вернікаў, заклікаўшы іх канцэнтраваць сваю ўвагу не толькі на набыванні падарункаў родным і блізкім, але і не забывацца на сутнасць самой падзеі. «Хачу пажадаць, каб Езус Хрыстус нарадзіўся ў сэрцах людзей, адарыў нас сапраўдным супакоем, а святы былі святамі Божай ласкі, жыцця, і каб Бог вёў нас сваім шляхам у новым годзе», — сказаў Тадэвуш Кандрусевіч.

АКЦЫЯ

## У ПАДТРЫМКУ ШАПУЦЬКІ

**Нямецкая праваабарончая арганізацыя Libereco — Partnership for Human Rights праводзіць акцыю ў падтрымку адлічанай з БДУ Таццяны Шапуцькі.**

Праваабаронцы распаўсюдзілі заяву, у якой прапанавалі накіроўваць на імя рэктара БДУ Сяргея Абламейкі і міністра адукацыі Беларусі Аляксандра Радзькова заклікі аднавіць на вучобе Шапуцьку.

Нагадаем, прэс-сакратар «Маладога фронту» (зарэгістраваны ў Чэхіі) Таццяна Шапуцька вучылася на юрыдычным факультэце БДУ па спецыяльнасці «Паліталогія». Прычынай адлічэння стаў яе ўдзел у Форуме грамадзянскай супольнасці праграмы «Усходняе партнёрства» ў Бруселі 16–17 лістапада без дазволу дэканата. Пра магчымасць адлічэння стала вядома ў першы дзень форуму. 3 снежня Шапуцька была адлічана з БДУ.

Пытанне наконт выключэння дзяўчыны з ВНУ ўзнімалася на сустрэчы прадстаўнікоў ЕС і беларускіх уладаў. Кіраўнік МЗС Швецыі, якая старшынствуе ў Еўрасаюзе, — Карл Більд заявіў, што будзе «абсалютна не прымальна», калі адлічэнне з БДУ адбылося з-за ўдзелу Шапуцькі ў Форуме грамадзянскай супольнасці.

**Паводле БелаПАН**

АДС

## ПАДСУМАВАЛІ ВЫНІКІ

**Генадзь КЕСНЕР**

**Падвядзенню вынікаў сваёй дзейнасці ў 2009 годзе была прысвечана частка on-line канферэнцыі лідэраў АДС 22 снежня.**

На дзесяткі пытанняў наведнікаў сайта АДС (*www.udf.by*) адказалі старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, сябра Сойму Партыі БНФ Вінцук Вячорка, лідэр Беларускай партыі аб'яднаных левых «Справядлівы свет» (былая Партыя камуністаў Беларуская) Сяргей Калякін, а таксама кіраўнік Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Ляўковіч і генеральны сакратар БСДП (Г) Мечыслаў Грыб.

Адказваючы на пытанне аб галоўных дасягненнях АДС, Сяргей Калякін адзначыў: «Найважнейшым з'яўляецца тое, што, насуперак заявам Аляксандра Лукашэнкі, нібыта найбліжэйшым часам апазіцыя ў Беларусі знікне, яна працягвае існаваць і дзейнічаць. Сёння выходзяць дэмакратычныя газеты, існуюць дэмакратычныя сайты, працуюць палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні, яны працуюць з людзьмі, даводзяць ім праўду».

«Найбольш эфектыўнай і перспектыўнай, хоць і не скажу, што пераможнай, была наша дамоўленасць ісці на прахадныя, ісці ў тыя гарады, дзе ёсць праблемныя прадпрыемствы, так званыя монаіндустрыяльныя гарады з горадаўтваральнымі прадпрыемствамі, ісці да рабочых і работнікаў мінскіх заводаў, размеркаваўшы пры гэтым адказнасць, геаграфію, забяспечыўшы выданне адмысловых спецвыпускаў незалежных выданняў і самі іх раздаючы, — лічыць Вінцук Вячорка. — Такая супольная акцыя, безумоўна, ёсць інвестыцыяй у будучае ўсведамленне людзьмі сапраўдных прычын эканамічнага крызісу».

«Поспех — гэта тое, што паддаецца вымярэнню. У ліпені 10 % грамадзян Беларусі заявілі, што яны чыталі Антыкрызісную платформу АДС. Гэта прыкладна 750 тысяч грамадзян, з якіх больш за 90 % станоўча ставяцца да гэтага дакумента. АДС сёння — гэта палітычная група, якая мае адказ на злабадзённыя пытанні, адказ, які не дае нават беларуская ўлада», — мяркуе Анатоль Лябедзька.

Вячорка адзначыў, што скаардынаваная міжнародная палітыка беларускіх аб'яднаных дэмакратычных сіл раней давала плён, а як толькі пайшла дэкаардынацыя, на жаль, пачаўся сыход з каштоўнаснай пазіцыі ў некаторых еўрапейскіх палітыкаў. «Пры канцы года яны пачынаюць усведамляць, што спадзяванні лібералізаваць Лукашэнку выніку не далі, і мы ўжо чуем з вуснаў Беніты Ферэра-Вальднер, Яцэка Пратасевіча, што гэта, маўляў, сама беларуская апазіцыя прасіла нас навязаць беспасярэдніцкія прамыя кантакты з Аляксандрам Лукашэнкам. АДС гэтага не рабілі», — заявіў сябра Сойму Партыі БНФ.

Пры гэтым усе ўдзельнікі on-line канферэнцыі зрабілі акцэнт на тым, што чуткі пра «смерць АДС» не адпавядаюць рэчаіснасці, і на сённяшні дзень ёсць некалькі дэмакратычных арганізацыяй, якія выказалі жаданне ўступіць у кааліцыю Аб'яднаных дэмакратычных сіл. Пытанне прыёму новых сяброў у кааліцыю будзе вырашаць Палітрада АДС, якая збярэцца на сваё паседжанне ў пачатку наступнага года.

СПАДЧЫНА

## САЙТ ДЛЯ АХОВЫ ПОМНІКАЎ

**З'явіўся сайт Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры — www.pomniki.budzma.org.**

Сайт створаны пры дапамозе агульнанацыянальнай кампаніі «Будзьма беларусамі!».

На новым электронным рэсурсе падаюцца навіны, нарматыўна-прававыя акты і метадычныя дакументы, звязаныя з аховай нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны. Акрамя таго, наведвальнікі змогуць знайсці неабходныя звесткі ў рубрыках «Актуаліі», «Вайсковы пошук», «Даследаванні», «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь», «Партнёры», «Рэгіёны» і «Таварыства».

Грамадскае аб'яднанне «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» — адна з найстарэйшых арганізацый Беларусі. Заснавана ў 1966 годзе. За гады існавання прайшла шлях ад дзяржаўна-грамадскай інспекцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і фонду, які фінансаваў рэстаўрацыю шматлікіх помнікаў, у тым ліку Сафійскага сабора ў Полацку, кальвінскіх збораў у Заслаўі і Смаргоні, да грамадскага, цалкам незалежнага ад дзяржавы аб'яднання.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

## ШЧОДРЫ ВЕЧАР

**7 студзеня 2010 года ў Чырвоным касцёле адбудзецца Вечарына-прэзентацыя першага нумара новага літаратурна-мастацкага часопіса «Верасень».**




У імпрэзе бяруць удзел: Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Леанід Дайнека, Алег Трусаў, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Рыгор Сітніца, Барыс Пятровіч, Настасся Кухарэнка, Віталь Рыжкоў, Наста Кудасава, Воля Чайкоўская, Лізавета Дамініка Панамарова.

Сваімі спевамі калядны вечар прыўкрасяць: Эдуард Акулін, Таццяна Беланогая, Алеся Сівохіна і Народны вакальны гурт «Пліса» пад кіраўніцтвам Кастуся Герашчанкі.

У казачны калядны вечар вас чакаюць прыемныя сюрпрызы і неспадзяванкі.

Першым 10-ці наведвальнікам — калядныя падарункі ад рэдакцыі часопіса «Верасень» і кампаніі «Будзьма беларусамі!».

Вядучы вечарыны — паэт і бард Эдуард Акулін.

**Пачатак у 18 гадзін. Уваход вольны.**

Імпрэза адбудзецца ў межах агульнанацыянальнай культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі!».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ГОД НЯСПРАЎДЖАНЫХ НАДЗЕЙ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Гэты год цалкам можна назваць годам няспраўджаных надзей. На жаль, не спраўдзілася тое, на што спадзявалася беларуская грамадскасць. Лібералізацыі не адбылося.**



Пачыналася ўсё прыгожа. Былі створаныя шматлікія «каардынацыйныя рады» пры Адміністрацыі прэзідэнта, па сродках масавай інфармацыі, па прадпрымальніках. Туды ўпершыню ўвайшлі прадстаўнікі апазіцыі. Напачатку года ў распаўсюд трапілі «Наша ніва» і «Народная воля», быў зарэгістраваны рух Мілінкевіча «За Свабоду», і яму нават дазволілі выдавецкую дзейнасць. Але на гэтым лібералізацыя скончылася. І гэта яскрава паказаў візіт рабочай групы Парламенцкай асамблеі АБСЕ, які прайшоў на гэтым тыдні.

Рабочая група Парламенцкай асамблеі АБСЕ заклапочана сітуацыяй са свабодай СМІ і арганізацый у Беларусі, а таксама магчымасцямі партый паўнавартасна ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны. Пра гэта заявіла кіраўнік рабочай групы па Беларусі ПА АБСЕ, шведскі дэпутат Сесілія Вігстром 22 снежня на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

Паводле яе слоў, галоўнай мэтай візіту дэлегацыі 20–22 снежня ў Беларусь было ўбачыць, як развіваецца сітуацыя ў краіне. Дэлегацыя правяла шэраг сустрэч з прадстаўнікамі беларускіх уладаў, грамадзянскай супольнасці і палітычных партый. «Падчас сустрэч мы заклікалі беларускія ўлады да развіцця і пашырэння дыялогу з міжнароднымі арганізацыямі, у тым ліку з АБСЕ, — сказала Вігстром. — Мы высока цэнім інтэнсіўны дыялог Беларусі з АБСЕ і іншымі структурамі па паляпшэнні дэмакратычных працэсаў, але павінны адзначыць, што яшчэ шмат неабходна зрабіць».

Адной з важных тэмаў абмеркавання падчас усіх сустрэч былі папраўкі, нядаўна ўнесеныя ў Выбарчы кодэкс Беларусі, зазначыла яна. Пры гэтым кіраўнік дэлегацыі адмовілася каментаваць іх. «Я не ўпаўнаважана гэта рабіць, таму што мы яшчэ не атрымалі поўны тэкст Выбарчага кодэкса з папраўкамі. Мы ўсё яшчэ яго чакаем. АБСЕ і БДІПЧ падалі Беларусі дэталёвы і поўны спіс рэкамендацый для змены заканадаўства. Мы спадзяемся, што яны былі ўлічаны», — сказала Вігстром.

У сваю чаргу, сябра рабочай групы, польскі дэпутат Павел Панцыльюш адзначыў, што гэтыя рэкамендацыя былі зроблены АБСЕ пасля назірання за парламенцкімі выбарамі ў Беларусі ў 2008 годзе. «Тады былі дзве асноўныя праблемы, якія выклікалі заклапочанасць, — рэгістрацыя кандыдатаў і падлік галасоў. Мы рады адзначыць, што адна з гэтых праблем (рэгістрацыя кандыдатаў) гэтымі папраўкамі была вырашана. Мы ўсё яшчэ чакаем вырашэння праблемы падліку галасоў», — сказаў ён.

Таксама Парламенцкая асамблея АБСЕ занепакоена фактамі выкрадання маладзёжных актывістаў у Беларусі. «Мы абмяркоўвалі пытанне аб арыштах і рэпрэсіях у дачыненні да палітычных апанентаў. Мы занепакоены фактамі выкрадання маладых людзей. Нам таксама вядома пра факты новых адміністрацыйных арыштаў і пра выключэнне адной студэнткі з універсітэта», — сказала Вігстром.

Паводле яе слоў, гэтыя факты, а таксама пытанне аб адмене артыкула 193-1 Крымінальнага кодэкса (дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі) абмяркоўваліся на сустрэчы з прадстаўнікамі Міністэрства юстыцыі Беларусі. «Намеснік міністра юстыцыі заявіў, што цяпер разглядаецца пытанне аб адмене гэтага артыкула, — сказала Вігстром. — Мы лічым, што гэта важна для забеспячэння права на свабоду сходаў. Гэты артыкул стварае цяжкасці для многіх палітычных партый і грамадскіх арганізацый».

Што тычыцца арыштаў паводле палітычных матываў, то прадстаўнік Мінюста заявіў сябрам рабочай групы ПА АБСЕ, што ўсе названыя імі людзі не з'яўляюцца палітзняволенымі, а іх справы — «крымінальныя выпадкі».

**Узровень зніжэння курсу беларускага рубля ў адносінах да цэнтральнага значэння кошту кошыка валют складае каля 8%**

Ну, канешне ж, «крымінальныя выпадкі». Цікава, чаму тады ніводзін факт прымусовага вывазу ў лес не быў расследаваны? Хай, нават, і не вывазу ў лес — Артура Фінькевіча вазілі па горадзе, завіталі і ў РАУС, і ў падатковую. Але — дзіўная рэч! — ніхто за гэта не панёс адказнасць! Ні за захоп без ордэра, ні за нескладанне пратаколу, ні за тое, што яго ўтрымлівалі пяць гадзін замест трох... Цікавы ў нас крыміналітэт у міліцэйскай форме!

Тым не менш, ёсць у краіне і аптымісты. Ніякія аднаразовыя змяненні курсу беларускага рубля ні да канца 2009 года, ні ў 2010 годзе ажыццяўляцца не будуць. Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджаным 21 снежня паведамленні Нацыянальнага банка Беларусі адносна планаў курсавай палітыкі.

Галоўны банк краіны адзначае, што ў гэтым годзе праводзіцца палітыка курсаўтварэння, заснаваная на прывязцы курсу беларускага рубля да кошту кошыка, які складаецца з трох замежных валют — долара ЗША, еўра і расійскага рубля. Пры гэтым ваганні курсу абмяжоўваюцца ў межах +/-10% у адносінах да цэнтральнага значэння, якое ўстаноўлена 2 студзеня 2009 года.

Цяпер узровень зніжэння курсу беларускага рубля ў адносінах да цэнтральнага значэння кошту кошыка валют складае каля 8%. «Гэта паступовае зніжэнне ажыццёўлена ў межах устаноўленага калідора з мэтай нейтралізацыі ўплыву сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу на канкурэнтаздольнасць знешняга гандлю, а таксама з улікам суаднесін попыту і прапановы замежнай валюты на ўнутраным рынку. Аднак зараз у эканоміцы краіны, яе знешнеэканамічным сектары, сфарміраваліся ўсе неабходныя перадумовы, якія дазваляюць ажыццяўляць далейшае падтрыманне курсу на стабільным узроўні», — адзначаюць у галоўным банку краіны.

Але ў некаторых аптымізм папросту зашкальвае. У 2017 годзе будзе створана адзіная дзяржава на постсавецкай прасторы. Пра гэта дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Павел Барадзін заявіў 18 снежня падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай дзесяцігоддзю падпісання саюзнага дагавора.

Паводле яго слоў, для гэтага трэба будзе толькі прыняць дакументы, якія вызначаюць функцыянаванне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. «Я спадзяюся, што на наступным пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, якое пройдзе ў ліпені 2010 года ў Мінску, будуць абмеркаваныя праект саюзнай Канстытуцыі і пытанне аб адзінай валюце. Пасля гэтага Саюзная дзяржава атрымае такі магутны штуршок да развіцця, што да нас пацягнуцца ўсе суседзі — проста таму, што ўбачаць, якія выгады мы атрымліваем ад супрацоўніцтва ў межах СД», — заявіў Барадзін.

Паводле яго меркавання, у выніку можна будзе дасягнуць таго, каб расійскі бюджэт Саюзнай дзяржавы дасягаў 100 мільярдаў расійскіх рублёў, што прыкладна ў 18 разоў больш, чым зараз. Акрамя таго, дабіцца стварэння дадаткова 3–4 мільёнаў працоўных месцаў для беларусаў і 18–20 мільёнаў — для расіян.

«Мы ўсіх прымем: Украіну, Грузію, Арменію, Азербайджан. І да 2017 года на постсавецкай прасторы будзе канфедэрацыя, якая аб'ядноўвае амаль усе рэспублікі былога СССР, а потым у гэтую канфедэрацыю ўвойдзе і Еўропа», — заявіў Барадзін.

Пал Палыч пра гэта казаў ужо неаднаразова. Але кожны мае свае мары пад Новы год...

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### АНТОН КУШНІР

Антон Кушнір перамог у агульным заліку мужчынскіх спаборніцтваў пасля двух этапаў Кубку Свету па фрыстайле ў лыжнай акрабатыцы, якія прайшлі ў кітайскім Чанчуне. У першым этапе спартовец забраў золата, у другім — бронзу. У сямёрцы лідэраў агульнага заліку адразу пяць прадстаўнікоў Кітая. Беларус Цімафей Слівец займае 8-е месца, Дзяніс Восіпаў — 13-е. Двухразовы медаліст алімпіяд Дзмітрый Дашчынскі застаўся дома з-за траўмы. Не паехаў у Кітай і бронзавы прызёр Гульняў–2002 Аляксей Грышын.

Антон Кушнір — прадстаўнік вельмі моцнай беларускай школы фрыстайлу. У Кубку Свету ён выступае з сезону 2001–2002 і спецыялізуецца ў паветранай акрабатыцы. Першыя поспехі прыйшлі да Антона ў 2004 годзе, калі ён стаў пераможцам Кубка Еўропы, а ў сезоне 2007–2008 спартовец заняў другое месца па выніках акрабатычнага Кубка Свету, па ходзе сезону выйграўшы свой першы этап Кубка Свету ў японскім Інавасіро. Зараз Антон трэніруецца ў Мінску і выступае за мясцовы клуб Дынама. Дарэчы, паходзіць фрыстайліст з Украіны, куды і наведваецца перыядычна да сваякоў.

### БАРЫС ПЯТРОВІЧ



Рэдактар літаратурна-мастацкі часопіс «Дзеяслоў» Барыс Пятровіч паведаміў, што з новага года выданне змяняе правапіс — пераходзіць з тарашкевіцы на наркамаўку. Падставаю для моўных пераменаў ёсць факт таго, што 1 верасня 2010 года пачынаюць дзейнічаць новыя правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. «Дзеяслоў» быў фактычна апошнім з зарэгістраваных афіцыйна выданняў, якое выходзіла не на наркамаўцы. Барыс Пятровіч расказаў журналістам, што ў рэдакцыю звярталіся настаўнікі, выкладчыкі, студэнты, школьнікі з просьбай змяніць правапіс, бо з тэкстамі, якія выдаюцца класічным правапісам, цяжка працаваць, а ў часопісе друкуецца шмат аўтараў, якія ўваходзяць у школьную праграму і ў спіс для пазакласнага чытання. Аднак пісьменнік і рэдактар лічыць, што наспела «вяртанне мяккага знаку» ў граматыку. «Мы гэта бачым па тым, што нават калі і чуем беларускую мову па радыё ці па тэлебачанні, то ўсё больш людзей вымаўляе словы «сьнег», да прыкладу, не мякка, як гэта патрабуецца, а на расійскі манер, цвёрда: «снег, снег...» Шкада, што правільнае вымаўленне не замацавана ў нас у правапісе, бо многія карыстаюцца негалосным правілам беларускай мовы — «як чуецца, так і пішацца» — і гавораць якраз на расійскі манер», — патлумачыў Барыс Пятровіч.

### УЛАДЗІМІР НАВУМАЎ

Былы кіраўнік Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў заявіў аб сваім сыходзе з пасады старшыні Федэрацыі хакея Беларусі. Рашэнне экс-міністр матывуваў тым, што знайшоў сабе працу ў Расіі і не зможа надаваць хакею столькі часу, як яму таго б хацелася. У інтэрв'ю «Салідарнасці» Навумаў расказаў, што з'язджае ў Маскву, дзе будзе займацца бізнес-праектам, не звязаным са спортам. Увесну адзін са старэйшых членаў каманды Лукашэнкі сышоў у адстаўку з пасады кіраўніка МУС (міністрам унутраных спраў ён быў з верасня 2000 года) па стану здароўя. За час працы на гэтай пасадзе чыноўнік праславіўся тым, што асабіста кіраваў разгонам акцый пратэсту нязгодных з палітыкаю ўладаў. Да гэтага Навумаў быў камандзірам адмысловага падраздзялення па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз», начальнікам Службы бяспекі прэзідэнта Беларусі. Уладзімер Навумаў разам з былымі сакратаром Савета бяспекі Віктарам Шэйманам, камандзірам спецназу Дзмітрыем Паўлічэнкам і былым міністрам унутраных спраў Юрыем Сіваковым уваходзіць у «чорны спіс» неўязных у краіны ЕС і ЗША. Міжнародная супольнасць падазрае гэтых асобаў у дачыненні да выкраданняў і забойстваў апазіцыйных палітыкаў Віктара Ганчара, Юрыя Захаранкі, Анатоля Красоўскага і журналіста Дзмітрыя Завадскага.




Фота Юрыя Дзядзінкіна

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# КУДЫ ПАЎЗЕ БЕЛАРУСКІ ХАМЕЛЕОН?

Сяргей НІКАЛЮК

**Ну папросту бяда з беларускім народам. Ніяк ён не можа дарасці да дэмакратыі. Прычым складаецца ўражанне, што па меры будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы дэмакратычны інфантылізм беларусаў узмацняецца.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Схаваць гэты сумны факт з кожным днём робіцца ўсё цяжэй. Вось і кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей не вытрываў і адкрытым тэкстам заявіў літаральна наступнае: «Ад нас часам ультыматыўна патрабуюць, каб мы літаральна з заўтрашняга дня сталі жыць у дэмакратычнай дзяржаве, як яны яе разумеюць. Але гэта немагчыма. Грамадства павінна ўнутрана саспець да зменаў».

Тут што ні слова — перл. Аднак абмяжуюся толькі адным каментарам. 5 лістапада, выступаючы на Мінскім форуме, кіраўнік Адміністрацыі запэўніваў шаноўную публіку, што Беларусь — краіна, якая цалкам падзяляе еўрапейскія каштоўнасці. Але калі гэта сапраўды так, то чаму тады «яны яе (дэмакратычную дзяржаву) разумеюць» інакш, і чаму ім даводзіцца сваё разуменне нам навязваць ва ўльтыматыўнай форме?

Краіна, я так разумею, складаецца з людзей, якія могуць падзяляць або не падзяляць пэўныя каштоўнасці. Аднак у нашым выпадку краіна падзяляе еўрапейскія каштоўнасці цалкам! Ці азначае гэта, што спадар Макей, калі кажа пра краіну, сябе і сваіх калегаў з Адміністрацыі прэзідэнта з ёй не атаясамлівае? Я, да прыкладу, з Беларуссю сябе атаясамліваю, а таму Захад сваіх каштоўнасцяў мне навязваць не можа. У мяне з ім кансенсус.

Самае цікавае, што пры гэтым мне блізкая і думка наконт неабходнасці беларускаму грамадству «ўнутрана саспець да змен». Без такога саспявання першыя дэмакратычныя выбары, як правіла, робяцца і апошнімі. За пацверджаннем гэтай паліталагічнай аксіёмы далёка хадзіць не трэба. Дастаткова прыгадаць «Кароткі курс гісторыі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі».

Вернемся яшчэ раз на Мінскі форум і паслухаем ужо знаёмага нам дакладчыка: «Хто хоча рабіць упэўненыя крокі, павінен рабіць іх павольна». І з гэтым не паспрачаешся. Як часта паўтараў адзін мой прыяцель, які нарадзіўся ў краіне, размешчанай на поўдзень ад пустыні Сахары: «Хамелеон паўзе павольна, але дапаўзае да верхавіны баабаба». Вось толькі важна, каб ён поўз менавіта на верхавіну, а не спрабаваў спусціцца з дрэва.

### «Вось і ўся дэмакратыя»

Пасля такога ўступу самы час паразважаць пра беларускую эліту. Паняцце гэта прыйшло да нас з Захаду і неяк незаўважна прыжылося. Здавалася б, эліта — яна і ў Афрыцы (Беларусі) эліта. Яе галоўная задача — прымаць рашэнні і дамагацца іх выканання. У такой афрыканска-беларускай трактоўцы эліта ў нас, безумоўна, маецца, прычым, я б нават сказаў, з лішкам. Па меркаванні сацыёлага Міхася Афанасьева: «Гэты вышэйшы клас можна назваць «элітай панавання». Лад думак сённяшняй эліты панавання добра вядомы, прадэманстраваны ў яе дзейнасці і дадзены ўсім у адчуванні».

Няцяжка здагадацца, што галоўным заняткам эліты панавання з'яўляецца сам працэс панавання. У залежнасці ад знешняга кантэксту такая эліта можа ажыццяўляць яго шляхам закручвання гаек або лібералізацыі, прычым лібералізацыі кантраляванай, іншымі словамі, ажыццёўленай упэўненымі крокамі ў павольным тэмпе (глядзі цытату).

Максімум, на які здольная эліта панавання, — гэта пабудаваць «моцную дзяржаву». Узровень яе дэмакратычнасці Лукашэнка яшчэ напачатку сваёй працы на пасадзе прэзідэнта ахарактарызаваў наступным чынам: «Народ ажыццяўляе рэальную дэмакратыю, абіраючы кіраўніка дзяржавы і заканадаўчую ўладу. Пасля гэтага кіраўнік дзяржавы і дэпутаты павінны дзейнічаць у рамках Канстытуцыі. Вось і ўся дэмакратыя». Для чытачоў, якія адразу не ўлавілі сутнасці, растлумачу. «Вось і ўся дэмакратыя» палітычнага ўдзелу народа не патрабуе. Усё, на што можа разлічваць народ, — гэта на права з'явіцца на выбарчы ўчастак і запоўніць бюлетэнь. Датэрміновая яўка пры гэтым ухваляецца.

Пры такім тлумачэнні паняцця «дэмакратыя» пра дапаўзанне да верхавіны баабаба хамелеону марыць не даводзіцца. Такая задача эліце панавання не па плячу. Для гэтага патрэбна эліта развіцця, роля якой у жыцці дзяржавы і грамадства не зводзіцца да кіравання, а мае на ўвазе выпрацоўку каштоўнасцяў і сімвалаў. Але такой у нас няма. Замест эліты развіцця, на думку паліталога Эміля Паіна, «у нас ёсць істэблішмент, у нас ёсць верхавінны слой, але ён не эліта. Ён не распаўсюджвае новыя нормы, не з'яўляецца прыкладам і пакуль не збірaецца весці за сабой грамадства, не пераўтварае яго ў нацыю».

### Уся справа ў механізме адбору

Калі я правільна памятаю школьны курс біялогіі, разнастайнасці біялагічных відаў мы абавязаныя механізму натуральнага адбору. Акрамя адбору натуральнага існуе і адбор штучны — селекцыя, якая ажыццяўляецца чалавекам свядома. Эфектыўнасць селекцыі значна вышэйшая. Яна дазваляе ствараць новыя віды жывёл за гады, а не за тысячагоддзі. Палітычныя эліты таксама з'яўляюцца прадуктам селекцыі. Вышэй ужо адзначалася, што існуюць два тыпы эліт — эліта панавання і эліта развіцця. Адпаведна, ёсць і два механізмы селекцыі.




Эліта развіцця — прадукт адкрытага грамадства. З гэтай прычыны яе дзейнасць мае публічны характар. Кандыдату, каб патрапіць у эліту развіцця, неабходна не проста прад'явіць грамадству пэўны праект свайго бачання будучыні, але і давесці яго актуальнасць падчас адкрытых конкурсаў (мясцовых, рэгіянальных і толькі на апошнім этапе — агульнанацыянальных).

Эліта панавання фармуецца шляхам цэнтралізаванага прызначэння. Як гэта адбываецца, мы маглі назіраць 4 снежня, калі Лукашэнка прыняў 52 кадравых рашэнні (13 службоўцаў прызначыў сваім указам, 9 — адправіў у адстаўку і для 30 персаналій узгадніў прызначэнне). Вынікам селекцыйнай працы, якая праводзіцца з цэнтра, з'яўляецца «вертыкаль» улады. Ніякіх праектаў бачання будучыні пры гэтым ад кандыдатаў не патрабуецца. У якасці асноўнага крытэру адбору выступае лаяльнасць кандыдата галоўнаму селекцыянеру.

Вось як апісала працэс прызначэння «СБ Беларусь сегодня»: «Дзве з паловай гадзіны прэзідэнт прымаў у сваім кабінеце прапанаваных Адміністрацыяй кандыдатаў на адказныя пасады. Папросту кажучы, ён асабіста праверў неабходнае пры прыёме на працу кіроўных працаўнікоў сумоў'е, ставячы задачы і даючы дзелавыя парады новым кіраўнікам...»

Звярніце ўвагу: вялікую групу чарговых прызначэнцаў склалі прадстаўнікі мясцовых органаў улады, але задачы ім ставілі не грамадзяне, якія пражываюць на адпаведных тэрыторыях, а кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён падкрэсліў: «Памятайце, што вы працуеце на вачах у людзей. Вы — твар прэзідэнта...» (адпаведна, і выразнікі яго волі).

Дакладна такім жа быў алгарытм фармавання савецкай наменклатуры і яе галоўнага звяна — партыі. Невыпадкова Сталін называў партыю «ордэнам мечаносцаў», тым самым падкрэсліваючы яе закрытасць для грамадства. Яго адданы вучань Мао падобных праколаў публічна не дапускаў. Ён любіў напіраць на слова «народ». Прывяду характэрную цытату: «Цяпер наша задача палягае ў тым, каб узмацніць дзяржаўную машыну народа — тут галоўным чынам маюцца на ўвазе народнае войска, народная паліцыя і народны суд — і тым самым забяспечыць умацаванне абароны краіны і абароны інтарэсаў народа».

Дарэчы, артыкул, з якога я запазычыў цытату, называецца «Пра дэмакратычную дыктатуру народа». Дыктатура народа — гэта прыгнёт большасці сіламі большасці, але пад кіраўніцтвам і непасрэдным кантролем з боку «вертыкалі» улады.

### Паніжальны трансфарматар

Абавязковая ўмова траплення ў «вертыкаль» — адмова ад самастойных палітычных прэтэнзій. Палітык у краіне павінен быць толькі адзін, што мы і назіраем. Нізкія, часта ў межах статыстычнай памылкі, рэйтынгі апазіцыйных лідэраў даўно ўжо нікога ў Беларусі не дзівяць. Але, прабачце, а які рэйтынг у прэм'ер-міністра, а ў старшыні Палаты прадстаўнікоў?

Асабіста я спікера беларускага парламента нават прозвішча не памятаю, і ў сваёй «палітычнай» недасведчанасці я не адзінокі. Неяк аднойчы сацыёлагі паспрабавалі высветліць, ці ведаюць беларусы прозвішча прэм'ера, старшыняў абодвух палат парламента, старшыні Канстытуцыйнага суда і генеральнага пракурора. Правільны і поўны адказ далі 0,5% рэспандэнтаў! Чытачы «НЧ» могуць паўтарыць апытанне на сваіх знаёмых. Упэўнены, што вынік атрымаецца такі ж перакануўчы.

Механізм прызначэння чымсьці падобны да паніжальнага трансфарматара. Ён адбірае на вышэйшыя дзяржаўныя пасады людзей, якія ў адрыве ад пасады самі па сабе нічога не ўяўляюць. «У гэтым наша адрозненне ад Захаду, — адзначае палітычны аглядальнік Максім Арцем'еў, — дзе палітык і не ва ўладзе можа ўяўляць цікавасць для СМІ, часта выступаць перад публікай. Але для гэтага трэба сапраўды нешта сабой уяўляць, акрамя пасады. Расія недалёка адышла ад СССР, дзе на вышэйшых пасадах былі, як правіла, шэрыя асобы. Варта было выпасці з наменклатурнай абоймы Молатаву або Маленкову, Палянскаму або Шэлепіну, іх пасрэднасць выступала напоўніцу».

Сваіх «выпаўшых» нямала і ў Беларусі. Дзе яны зараз? Хутчэй за ўсё, займаюцца бізнесам, выкарыстоўваючы ранейшыя службовыя «напрацоўкі» і сувязі. Апынуўшыся ва ўладзе, не маючы за душой праекту будучыні Беларусі, яны думалі выключна катэгорыямі асабістай кар'еры. Гэтак жа яны выбудоўваюць і свой бізнес. Чакаць ад «выпаўшых» кіраўнічых і тэхнічных інавацый не мае сэнсу. Іх бізнес быў і застаецца наменклатурным.

Аднак вернемся да тых, хто пакуль яшчэ пры пасадах. Уключаныя ў склад эліты панавання за кошт працы паніжальнага кадравага трансфарматара, яны самі робяцца паніжальнымі трансфарматарамі. Не варта пасля гэтага дзівіцца, што пабудова дэмакратычнай прававой дзяржавы ў Беларусі ўвесь час пераносіцца ў будучыню. Апраўданні пры гэтым стандартныя — народ, маўляў, яшчэ не гатовы, а калі так, то існуючаму парадку няма альтэрнатывы.

Цікавая карціна атрымліваецца. У 1994 годзе ўзровень сталасці беларусаў дазваляў правесці ў краіне дэмакратычныя выбары, а ў наступныя гады — не. Вынік працы прызначэнцаў у наяўнасці. У паліталогіі ёсць такое паняцце — «социацыд», гэта калі, у адрозненне ад генацыду, знішчаюцца не людзі нейкай нацыянальнасці, а арганізацыі. Спытайце пра гэта ў тых, хто сёння спрабуе зарэгістраваць у Беларусі палітычную партыю або грамадска-палітычную газету. Яны распавядуць вам шмат цікавага.

ВЫНІКІ ГОДА

# БЕЛАРУСЬ–2009

**Героі казкі «Дванаццаць месяцаў» лёгка маглі павярнуць час назад. Мы на такое не здольныя, але як альтэрнатыву прапануем вам прыгадаць, чым жыла краіна і мы разам з ёй у гэтым годзе. Топ падзей палітычнага жыцця краіны ў 2009 годзе падрыхтавала Вольга Хвоін.**

## Студзень

Вяртанне да рэальнасці пасля мінулага наваголняга застолля было суровым. 2 студзеня беларусы зразумелі, што пакуль яны закусвалі, іх зберажэнні зменшыліся акурат на адну пятую. Хаця напрыканцы 2008-га прадстаўнікі Нацбанку запэўнівалі, што плануецца паэтапная дэвальвацыя рубля, і толькі ў межах 10–15 працэнтаў. За лічаныя дні паліцы крамаў, што гандлююць бытавой тэхнікай, апусцелі, а айчынныя вытворцы пад шумок някепска разгрузілі свае склады. Акрамя традыцыйных кухонных абурэнняў, эканамічныя ўзрушэнні нічога надзвычайнага ў грамадстве не выклікалі. Нездарма ў сваім навагоднім пасланні Аляксандр Лукашэнка падзякаваў грамадзянам за давер, які яны «заўжды праяўляюць да ўлады, спакой і мудрасць».

## Люты

Беларусь знайшла і ў сябе тэрарыстаў. Праўда, пра тое, што затрыманыя асобы — «тэрарысты», супрацоўнікі МУС здагадаліся толькі праз пяць месяцаў. 8 лютага былі затрыманыя ваўкавыскія прадпрымальнікі Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка. 18 лютага ім было прад'яўлена абвінавачанне па арт. 218 Крымінальнага кодэкса (наўмыснае пашкоджанне маёмасці). А 23 чэрвеня ў дачыненні да Аўтуховіча і, як паведаміла МУС, «іншых асоб» была распачата справа па арт. 359 Крымінальнага кодэкса (тэрарыстычны акт) у выглядзе падрыхтоўкі (арт. 13). Абвінавачанне ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта Уладзіміру Асіпенку і Мікалаю Аўтуховічу было прад'яўлена 20 лістапада. У жніўні Лявонава вызвалілі з мінскага следчага ізалятара, пазней з яго былі знятыя ўсе абвінавачанні. Шэраг беларускіх праваабаронцаў лічыць гэтую справу палітычна матываваным пераследам.







Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў і Уладзімір Асіпенка

## Сакавік

Беларусь уключылі ў праграму Еўрасаюза «Усходняе партнёрства». Апроч нашай краіны, у ёй удзельнічаюць пяць постсавецкіх краін: Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова і Украіна. Праграма прадугледжвае эканамічную інтэграцыю і палітычнае збліжэнне ЕС з гэтымі дзяржавамі. Ступень удзелу Беларусі ў палітыцы «Усходняга партнёрства» будзе залежаць ад прагрэсу дэмакратычных рэформаў у краіне. На змену дванаццаці патрабаванням ЕС па дэмакратызацыі палітычнага рэжыму прыйшлі пяць. Цяпер Еўрасаюз чакае ад Мінска рэформы выбарчага заканадаўства, доступу грамадзян да незалежнай інфармацыі, паляпшэння сітуацыі з НДА, забеспячэння свабоды сходаў.

А яшчэ дэмакратычную супольнасць Беларусі ўскалыхнула звестка пра самагубства праваабаронцы з Салігорску Яны Паляковай. 36-гадовая праваабаронца засілілася пасля таго, як суд Салігорскага раёна прызнаў яе вінаватай у «знарок ілжывым даносе» на супрацоўніка міліцыі. Жанчыну прысудзілі да двух з паловай гадоў пазбаўлення волі і выплаты міліцыянту кампенсацыі за маральную шкоду ў памеры аднаго мільёна рублёў. Яна сцвярджала, што ўчастковы інспектар збіў яе пасля адмовы падпісваць паперы пра тое, што яна не збірала подпісы ў падтрымку вылучэння ў кандыдаты ў парламентары Вольгі Казулінай. Перад трагедыяй у газеце «СБ — Беларусь сегодня» выйшаў артыкул «Много у нас диковин, каждый чудак — Бетховен!», у якім Яну ў здзеклі-ва-абразлівай форме выставілі як неадэкватную асобу.

## Красавік

«Бацька» і Папа сустрэліся. У Ватыкан на афіцыйную сустрэчу з Папам Рымскім Бенедыктам XVI кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыехаў са сваім малодшым сынам Колем. Як адзначаў прэс-цэнтр Святога Пасаду, сустрэчы прайшлі ў пазітыўным рэчышчы. Лукашэнка запрасіў Пантыфіка наведаць Беларусь. Напрыканцы абмяняліся падарункамі. Папа ўручыў сувенірную манету, Аляксандр Лукашэнка прэзентаваў абраз беларускага майстра, а Коля — рускамоўны «Буквар».

## Май

7 мая ў сталіцы Чэхіі, якая на той час старшынствавала ў Еўрасаюзе, адбыўся ўстаноўчы саміт «Усходняга партнёрства». На ім прысутнічала і афіцыйная дэлегацыя ад Беларусі. Фактычна саміт стаў першым выхадам Беларусі на еўрапейскую арэну пасля доўгага перыяду ізаляцыі і выключанасці з жыцця па заходні бок кардону. Апроч еўрапейскіх чыноўнікаў, прадстаўнікоў беларускіх уладаў крыкамі «Ганьба!» віталі нязгодныя з новай сяброўскай палітыкай ЕС у адносінах да «апошняй дыктатуры Еўропы».

## Чэрвень

Малочны канфлікт з Расіяй. Расспажыўнагляд прыпыніў санітарна-эпідэміялагічныя заключэнні або выключыў з рэестру дазволеныя на ўвоз прадукцыі больш за тысячу найменняў беларускай малочнай прадукцыі. Праблема з пастаўкамі малочнай прадукцыі ў Расію вырашылася гэтак жа імкліва, як і ўзнікла: бакі прыйшлі да сумеснага пагаднення. Перчыку беларуска-расійскім адносінам дадала адмова Аляксандра Лукашэнкі ехаць на сесію Савета калектыўнай бяспекі дзяржаў — удзельніц АДКБ у Маскву. У выніку Беларусь не падпісала дамову аб стварэнні структуры Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання (КСАР).




А на чарговай сесіі ПАСЕ было прынята рашэнне вярнуць Беларусі статус адмыслова запрошанай у Парламенцкую асамблею Рады Еўропы, але толькі пасля ўвядзення мараторыю на смяротную кару.

## Ліпень

У пачатку месяца ва ўмовах даглядаў і ўсеагульнага кантролю (наступствы выбуху ў Мінску 3 ліпеня 2008 года) краіна святкавала Дзень незалежнасці. Затым, 10 ліпеня, кожны па-свойму адзначаў 15-годдзе кіраўніцтва Аляксандра Лукашэнкі ад часоў першых выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Акрамя таго, прайшоў V З'езд беларусаў свету, на які прыйшлі не толькі беларусы замежжа, грамадскія дзеячы і палітыкі, але і прадстаўнікі ўлады. І нават сказалі сваё хоць і фармалізаванае, але ж слова. Праз паўгода кіраўніцтва Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» адзначыць, што афіцыйны Мінск не пайшоў насустрач у вырашэнні шэрагу праблем, якія былі агучаныя падчас з'езду.

## Жнівень

Ад жніўня піярам Аляксандра Лукашэнкі займаецца не лорд Бэл. Гадавы кантракт паміж беларускім урадам і брытанскай піяркампаніяй *Bell Pottinger Group* не быў падоўжаны. Аднак з'явілася інфармацыя, што замест лорда беларускі кіраўнік наняў «фатографа каралёў і прэзідэнтаў» брытанца Сашу Гусава. Вынікі працы лорда і фатографа грамадскасці не вядомыя: ці то займелі дыялог з ЕС, ці змарнавалі грошы.

З аднадзённым візітам Мінск наведаў памочнік дзяржаўнага сакратара ЗША Філіп Гордан. Ён сустрэўся з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімірам Макеем і міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргеем Мартынавым. Афіцыйныя паведамленні запэўнівалі, што падчас гэтых сустрэчаў былі «абмеркаваныя пытанні развіцця беларуска-амерыканскіх адносін, у тым ліку выкарыстання наяўных магчымасцяў па пашырэнні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва», «бакі дамовіліся падтрымліваць рэгулярныя кантакты». Зразумела адно — Штаты крыж на Беларусі не паставілі.

Сезон адпачынкаў крыху разбавіў скандал з місіяй АБСЕ ў Беларусі: кіраўніка місіі Ханса Йохана Шмідта, паводле афіцыйнай версіі, знялі з пасады да заканчэння тэрміну яго працы. Нібыта за «празмерныя сімпатыі да рэжыму Лукашэнкі». Ходзяць чуткі, што шэраг дэмакратычных партый напісалі на дыпламата скаргі ў Вену.

## Верасень

Паколькі палітыка ў Беларусі гэта — адна асоба (амаль як «дзяржава гэта я» ў часы Людовіка XIV), то пачнём з візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Вільнюс і сустрэчы з прэзідэнтам Літвы Даляй Грыбаўскайтэ. Кіраўнік Беларусі сказаў сваёй візаві, што яму спадабалася яе адкрытасць, у тым ліку і ў няпростых пытаннях. «Час і Гасподзь нас рассудзяць: хто меў рацыю па тых адчувальных пытаннях, якія ставіць перад намі Еўропа», — падкрэсліў Лукашэнка.

Па восені змянілася кіраўніцтва ў партыі БНФ. Цяпер яе ачольвае 33-гадовы Аляксей Янукевіч, які да гэтага быў намеснікам старшыні партыі ад 2003 года. Старое кіраўніцтва партыі перамены ўспрыняло балюча, але, як кажуць, жорны Гасподні мелюць павольна, але дакладна.

У Беларусі прайшлі сумесныя беларуска-расійскія вучэнні «Захад–2009», вынікам якіх была не толькі «адпрацоўка сумесных вайсковых дзеянняў сілаў і сродкаў узброеных сіл Беларусі і Расіі», але і інцыдэнт з крадзяжом шампуню з барысаўскай крамы расійскім салдатам.

## Кастрычнік

Аляксандр Лукашэнка падпісаў дамову аб стварэнні Калектыўных сілаў аператыўнага рэагавання (КСАР). Паводле дакументаў, КСАР прызначаныя для абароны тэрытарыяльнай цэльнасці, суверэнітэту і забеспячэння бяспекі, перааддолення буйнамаштабных крызісных сітуацый на тэрыторыі краін АДКБ.

Прайшоў паўторны ўстаноўчы з'езд партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» (БХД). Аднак, як і ўвесну, хадэкі Беларусі атрымалі ад Мінюста адмову ў рэгістрацыі. Нягледзячы на юрыдычныя калізіі, БХД мае намер удзельнічаць у праймерыз «Беларускага незалежніцкага блока», які прыйшоў на змену Аб'яднаным дэмакратычным сілам. Патэнцыйным кандыдатам на пасаду прэзідэнта дзяржавы на наступных выбарах можа выступіць сустаршыня БХД Віталь Рымашэўскі.

## Лістапад

Падчас Беларускага еўрапейскага форуму кіраўнік руху «За свабоду!» Аляксандр Мілінкевіч заявіў, што гатовы ўдзельнічаць у наступных прэзідэнцкіх выбарах. Форум фактычна стаў дэманстрацыяй палітычным сілам у Беларусі і Еўропе падтрымкі і прыхільнасці да Мілінкевіча.

Беларускі трэці сектар дарос да таго, каб не толькі займаць нішу маргіналаў у сябе на радзіме, але і годна прадстаўляць дзяржаву на Форуме грамадзянскай супольнасці ў Брусэлі. Двое прадстаўнікоў беларускай дэлегацыі ўвайшлі ў склад пастаянных кіраўнікоў створаных органаў форуму. Пазней адну з удзельніц мерапрыемства — прэс-сакратарку незарэгістраванага ў Беларусі «Маладога Фронту» Тацяну Шапуцьку выключаць з БДУ нібыта за парушэнне правілаў унутранага распарадку.

Вынікам лістападаўскай сустрэчы кіраўнікоў МЗС краін Еўрасаюза ёсць частковае прыпыненне і працяг санкцый у дачыненні беларускіх службоўцаў да кастрычніка 2010 года. Адначасова ЕС прапанаваў Еўракамісіі пачаць падрыхтоўку да падпісання дамоў аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі.

Беларусь, Расія і Казахстан дамовіліся аб умовах стварэння Мытнага саюза. З 1 студзеня 2010 года на тэрыторыі гэтых краінаў уводзіцца адзіны мытны тарыф і пачне функцыянаваць мытная тэрыторыя Беларусі, Казахстана і Расіі.

## Снежань

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прыняла законапраект «Аб унясенні дапаўненняў і зменаў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях правядзення выбараў і рэферэндумаў». Нягледзячы на шэраг новаўвядзенняў у выбарчы кодэкс, прадстаўнікі апазіцыі лічаць, што новае заканадаўства ніякім чынам не гарантуе правядзенне ў дзяржаве транспарэнтных і свабодных выбараў.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў хутчэй за ўсё не будуць запрошаныя ў Парламенцкую Асамблею «Усходняга партнёрства». Беларускія дэпутаты лічаць дыскрымінацыйным парадак фармавання беларускай дэлегацыі ў Еўранэсце, прапанаваны Еўрапарламентам. Аднак ніхто з афіцыйных прыхільнікаў справядлівасці не згадвае ў хвіліны «праведнага гневу» пра шматлікія прыклады парушэння элементарных правоў і свабод чалавека ў Беларусі, на якія і грунтуюцца падобныя рашэнні ЕС.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# АЛЕСЬ БЕЛЯЦКІ




Фота Юрыя Дзядзінкіна

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Алесь Беляцкі — з той кагорты людзей, да якіх можна аднесці вядомае выслоўе — «зрабіў сябе сам». Гэтак жа, як і другое: «таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім». Філолаг, літаратар, ён стаў яшчэ і адметным праваабаронцам. Можна сказаць, вымушана — пад ціскам беларускіх палітычных абставін, але цалкам у адпаведнасці з характарам, які паўстае супраць любога гвалту.**

## Ад бацькоўскага парогу

Алесь Беляцкі нарадзіўся 25 верасня 1962 года ў Карэліі, у мястэчку Вяртсіля Сартавальскага раёна. У савецкія часы там рабілі вядомыя на ўсю краіну лыжы. Але чаму беларуская сям'я апынулася так далёка?

З наступстваў савецка-фінскай вайны, калі «саветамі» была акупавана частка Фінляндыі і праводзілася вярбоўка людзей для асваення далучаных тэрыторый. У запрыгоненых савецкіх сялян з'явілася магчымасць вырвацца з калгаснага раю. Пасля калектывізацыі заможная сям'я Беляцкіх ператварылася амаль у жабрацкую. На пачатак 1940 года шасцёра дзяцей Усціна Беляцкага, дзеда Алеся, пачалі пухнуць ад голаду, і той вырашыў пакінуць родныя мясціны.

Так 10-гадовы хлопчык Віця, бацька Алеся, апынуўся каля Ладагі, дзе праз колькі год сустрэўся з беларускай Нінай з-пад Нароўлі, якая ў Карэлію трапіла таксама па вярбоўцы, толькі ўжо пасля другой сусветнай вайны. Ажаніліся. Першынца назвалі Аляксандрам, у гонар бацькі Ніны, які загінуў на вайне.

У 1964 годзе, калі Алесю было два гады, сям'я вярнулася ў Беларусь, бо тут пачалі будаваць заводы і спатрэбіліся рабочыя кадры. Быў выбар: шахты Салігорска альбо хімзавод у Светлагорску. Накіраваліся ў Светлагорск, бо той знаходзіўся бліжэй да Нароўлі, радзімы Ніны. У Светлагорску Алесь скончыў сярэднюю школу №5 і ў 1979 годзе паступіў у Гомельскі універсітэт на беларуска-рускае аддзяленне гісторыка-філалагічнага факультэта.

Кампанія там падабралася адметная. На адным факультэце з Беляцкім вучыліся Анатоль Сыс, Эдуард Акулін, Сяржук Сыс, Анатоль Казлоў і Вольга Куртаніч. Менавіта тады Алеся пачалі хваляваць пытанні «беларушчыны» — мова, гісторыя, будучы лёс краіны. У 1981 годзе на грошы, заробленыя ў будаўнічым атрадзе, ён адправіўся ў вандроўку па гістарычных мясцінах Беларусі. Дзе на маршрутных аўтобусах, дзе «аўтастопам», дзе пехам. Падчас гэтай вандроўкі пазнаёміўся з мінскімі актывістамі-студэнтамі (сярод іх быў і Вінцук Вячорка), якія потым і складуць «касцяк» беларускіх адраджэнцаў хвалі 1990-х.

## Жыццёвы выбар

У 1984 годзе Алесь Беляцкі паступіў у аспірантуру Інстытута літаратуры Акадэміі Навук БССР. Гэта быў самы пачатак новай хвалі нацыянальнага адраджэння і росквіт знакамітай творчай «Майстроўні». Праз яе прайшлі некалькі сотняў чалавек, большая частка з якіх і зараз працуе на карысць беларушчыны.

Праз паўгода Алеся Беляцкага прызвалі ў Савецкую армію, бо ніякіх адтэрміновак для аспірантаў тады не было. Служыў у артылерыі, у Свярдлоўску, механікам-вадзіцелем бранiраванага цягача супрацьтанкавых гармат.

Служба далася цяжка. Не фізічна — маральна. Як потым жартаваў сам Беляцкі, з войску «выскачыў, як корак з пляшкі». Пасля салдацкай службы былі прадугледжаныя яшчэ і двухмесячныя афіцэрскія курсы. Атрымліваць лейтэнанцкія зорачкі ён не стаў, зрабіў дзембельскі акорд, каб толькі не заставацца на лішнія месяцы ў войску і вярнуцца вучыцца. Як кажуць, чыстыя пагоны — чыстае сумленне.

Калі Беляцкі прыйшоў з арміі, у беларускай сталіцы дзьмулі ўжо новыя ветры. Было заснавана і актыўна працавала моладзевае аб'яднанне «Талака», ва універсітэце і розных інстытутах з'явіліся шматлікія нефармальныя групоўкі. Вясной 1985 года адбыўся і першы разгон моладзі, якая ў Траецкім прадмесці спрабавала святкаваць «Гуканне вясны». Разам Алесь і Анатоль Сыс прыдумалі і стварылі таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя».

Некаторыя памылкова лічаць, што першая «Дзяды» адбыліся ў 1988 годзе, калі ў Мінску запахла міліцэйскай «чаромхай». На самай справе, яны былі праведзены на год раней каля помніка Янкі Купалы. Па сутнасці там адбыўся мітынг-рэквіем. Адпаведная заяўка была пададзена своечасова, аднак ніякай рэакцыі на яе не было, таму тыя 300 чалавек, што прыйшлі, не ведалі, чым усё скончыцца. Дзякуй Богу, хапуна не адбылося. Кіраўніцтва краіны банальна разгубілася.

Але і гэты мітынг нельга назваць першай акцыяй пратэсту. Першынство належыць 1984 году. Тады «наверсе» вырашылі разбурыць будынак, дзе ў сярэдзіне XIX стагоддзя была пастаўленая першая беларуская п'еса Вінцука Дуніна-Марцінкевіча, і актывісты «Майстроўні» наладзілі першы публічны супрацьць. На акцыю з плакатамі выйшлі калі дзесяці чалавек (у тым ліку Вінцук Вячорка, Зміцер Саўка), і вельмі хутка яны апынуліся ў міліцыі. Праз пэўны час усіх адпусцілі, камуністычная ўлада зрабіла выгляд, што нічога неардынарнага не адбылося.

«Дзяды–1988» у біяграфіі Алеся Беляцкага таксама занялі даволі адметнае месца. Ён быў «паравозікам», то бок быў сярод тых, хто замаўляў акцыю, і, зразумела, адным з першых трапіў пад суд — атрымаў першы ў сваім жыцці штраф — 200 савецкіх рублёў. Дарэчы, гэтыя грошы сабралі калегі па Інстытуту літаратуры АН. Мабыць, тады ў маладым вучоным і пачаў нараджацца будучы праваабаронца.

**Партнёрамі «Вясны» сёння з'яўляецца тузін міжнародных і замежных арганізацыяў, а сам праваабарончы цэнтр прыняты сябрам у дзве міжнародныя структуры**

## Пад бел-чырвона-белым сцягам

Аспірантуру ён закончыў вясной 1989 года, але кандыдацкай дысертацыі не абараніў. Не палічыў патрэбным. На базе дысертацыі ён пазней зробіць брашуру «Літаратура і нацыя» (1991 год) і вырашыць, што гэтага дастаткова. Ніякіх навуковых рэгалій. Сёння такога б не зразумелі...

У канцы 1980-х гадоў маналіт «кіруючай і накіроўваючай КПСС» пачаў даваць трэшчыны. Знакам часу сталіся выбары на альтэрнатыўнай аснове. Увосень 1989 года Алесь Беляцкі, які працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам у Музеі гісторыі беларускай літаратуры імя Максіма Багдановіча, што знаходзіўся ў Траецкім прадмесці, вырашыў прыняць удзел у конкурсе на пасаду дырэктара музея. І перамог.

У 1990 годзе Алеся Беляцкага абралі дэпутатам сталічнага гарсавета. І калі там праз год разглядалася пытанне нацыянальнай сімволікі, ён прынёс бел-чырвона-белы сцяг, які ўпрыгожваў фае музея Максіма Багдановіча. Гэты сцяг у тую ж хвіліну залунаў над будынкам Мінгарвыканкама. Першы ў краіне. За два тыдні да таго, як ён стаў дзяржаўным.

Дырэктарам Беляцкі прапрацаваў — у гэта цяжка паверыць — да 1998 года і звольніўся па асабістым жаданні, што таксама неверагодна. Музей пад яго кіраўніцтвам адчыніў чатыры экспазіцыі ў розных будынках (адну нават у Яраслаўлі), праводзіў значную навуковую работу, у ім праходзілі шматлікія літаратурныя і грамадскія слуханні. Па словах Алеся Беляцкага, гэта быў адзін з найлепшых музеяў у краіне.

Вясной 1996 года з ініцыятывы Алеся Беляцкага была створана грамадская праваабарончая арганізацыя, якую так і назвалі — «Вясна–96». Галоўнай яе задачай была салідарная падтрымка першых палітычных зняволеных. А яшчэ юрыдычная дапамога ахвярам палітычных рэпрэсій, збор і распаўсюд праваабарончай інфармацыі, прававая адукацыя.

Калі арганізацыю стваралі, Алесь Беляцкі не думаў, што яна праіснуе так доўга. Лічыў, праз 2–3 гады (максімум 5) патрэба ў ёй увогуле адпадзе, і яны вернуцца да звычайнай работы — музейнай, літаратурнай, навуковай, палітычнай. Як і многія з нас, ён памыліўся.

## Калі прыйдзе вясна?

У 1998 годзе Праваабарончы цэнтр «Вясна–96» быў зарэгістраваны, а праз год, са з'яўленнем філіяў, стаў арганізацыяй рэспубліканскага маштабу. Сёння сябрамі гэтай структуры з'яўляецца некалькі сотняў валанцёраў. У 2003 рэгістрацыю скасавалі і не аднавілі па гэты дзень. Ні пад старой, ні пад новай («Наша вясна») назвай.

Рэгістрацыя альбо нерэгістрацыя найперш праваабарончых, але і іншых таксама, грамадскіх арганізацый сталася своеасаблівай лакмусавай паперкай для ацэнкі палітычнай сітуацыі ў краіне. Па гэтым паказчыку робіцца высновы аб узроўні беларускай «лібералізацыі». Вось і ацэнім: толькі за два апошнія гады, «Вясна» рабіла тры спробы атрымаць афіцыйны дакумент аб рэгістрацыі. Безвынікова. Мабыць, палітычны заказ пакуль іншы.

Алесь Беляцкі стаяў у самых вытокаў стварэння Беларускага народнага фронту, але выйшаў з гэтай партыі. Чаму? Перш за ўсё таму, што праваабаронцы павінны абараняць прадстаўнікоў усіх палітычных плыняў, рухаў, грамадскіх арганізацыяў, прафсаюзаў. Усіх, хто церпіць ад сваволля беларускіх уладаў. Агульнымі, аб'яднанымі намаганнямі.

Партнёрамі «Вясны» сёння з'яўляецца тузін міжнародных і замежных арганізацыяў, а сам праваабарончы цэнтр прыняты сябрам у дзве міжнародныя структуры. У тым ліку і вядомай Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH), якая аб'ядноўвае больш за 160 праваабарончых арганізацый з усяго свету. Два гады таму на кангрэсе ў Лісабоне Алеся Беляцкага абралі віцэ-прэзідэнтам FIDH.

Знайшліся нядобразычліўцы, што пракаментавалі гэта, і асабліва вылучэнне Алеся Беляцкага на Нобелеўскую прэмію міру, як нейкі піяр беларускіх апазіцыянераў увогуле і Алеся канкрэтна. Можна толькі здагадвацца, адкуль той вецер вее. Аднак двойчы намінавалі (2006 і 2007 гадах) Алеся на прэмію нарвежскія парламентарыі з адной абсалютна зразумелай і апраўданай мэтай — прыцягнуць увагу міжнароднай супольнасці да сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

На жаль, некаторых з айчынных апазіцыянераў за мяжой, сапраўды, ведаюць лепш, чым у сваёй краіне. Беляцкага ведаюць і тут, і там. Бо ён, бо «Вясна–96» не на словах, на справе — абаронцы правоў чалавек. Той факт, што ў яго арганізацыю штогод па розных прычынах звяртаюцца па дапамогу некалькі тысяч беларусаў, гаворыць пра многае. Алесь з калегамі марыць (і робіць дзеля гэтага ўсё магчымае), каб найхутчэй настаў час, калі падстаў для зваротаў у абарону парушаных правоў чалавека, у жыхароў Беларусі больш не будзе.

Ён марыць не пра адлігу, а пра сапраўдную палітычную вясну, якая адменіць «Вясну–96».

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 30 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Меладраматычны серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Алімпійскі часопіс.
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка». Заключная серыя.
**13.10** Дэтэктыўны серыял «Вероніка Марс-3» (ЗША). Заключная серыя.
**14.05** «Эпоха». Фільм «Францыск Скарына». Часткі 1-я і 2-я.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Эпоха». Фільм «Францыск Скарына». Частка 3-я.
**15.55** Лірычная камедыя «32-е снежня» (Расія). 2-я серыя.
**16.50** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Зямельнае пытанне».
**19.50** Серыял «І усёткі я кахаю» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.50** Відэафільм АТН «Вынікі-2009. Культура».
**22.20** Лірычная камедыя «32-е снежня» (Расія).
**00.25** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** Асяроддзе пасялення.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Ералаш.
**16.40** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым. Адмысловы навагодні выпуск.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Смеху дзеля».
**18.40** «Поле цудаў». Юбілейны 1000-ы выпуск.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм’ера. Камедыя «Тарыф навагодні». Расія, 2008 год.
**22.50** Нашы навіны.
**23.05** Навіны спорту.
**23.10** Прэм’ера. Драма «Рэстлер». ЗША-Францыя, 2008 год.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «З пункта гледжання анёла». Расія, 2001 г.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Дарагая перадача».
**11.55** Фільм «Есці пададзена». Расія, 2005 г.
**13.50** Фільм «Чарадзеі». СССР, 1982 г.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** СТБ прадстаўляе: Прэм’ера! Серыял «Тэарэтыкі». 3-я серыя.
**21.00** Фільм «Дачка». Расія, 2008 г.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** Фільм «Дачка». Канчатак фільма.
**23.55** «Неблакітны агеньчык». Лепшае.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** «Альбарутэнія. Вялікі стэп».
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Прэм’ера. «Канцэрт Эмілі Сімон у Алімпіі» (Францыя).
**12.15** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.55** Спорт-кадр.
**13.30** Мультсерыял «Аладзін» (ЗША).
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.30** «Лабірынты гісторыі беларускіх яўрэяў». Частка трэцяя.
**15.00** Медычныя таямніцы.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Рамантычная драма «Табар сыходзіць у неба» (СССР).
**21.10** Калыханка.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.30** Серыял «На рагу ў Патрыяршых-4» (Расія). Заключная серыя.

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Жыл-быў вясёлы чалавек. Аркадзь Хайт». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Вазьмі мяне з сабой».
**13.05** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне». Заключная серыя.
**15.20** Тэлесерыял «Дарунак божы».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм’ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм’ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Прэм’ера. «Лепшыя гады нашага жыцця».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне». Заключная серыя.
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Яе лёдавая Вялікасць. Алена Чайкоўская».

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Авіятары».
**09.30** «Калекцыя дурасцяў Максіма Кананенкі».
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Дачны адказ».
**12.10** «Алтар Перамогі».
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.40** Серыял «Ліцейны».
**23.00** Сёння.
**23.25** «І зноў добры дзень!».
**00.15** «Першая кроў».

**09.30** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit».
**09.45** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. Маршрут Дакара 2010.
**10.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Оберстдорф). HS 137.
**12.00** Тэніс. Гісторыі. Часопіс.
**13.30** Біятлон. Міжнародны турнір (Гельзенкірхен).
**15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Оберстдорф). HS 137.
**16.30** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група A.
**16.45** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група C.
**17.00** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група D.
**17.15** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група B.
**17.30** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група E.
**17.45** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група F.
**18.00** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група G.
**18.15** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група H.
**18.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Оберстдорф). HS 137.
**19.30** Ралі. «Мэта. Дакар». Часопіс.
**19.45** Ралі. «Мэта. Дакар». Часопіс.
**20.00** Ралі. «Мэта. Дакар». Часопіс.
**20.15** Ралі. «Мэта. Дакар». Часопіс.
**20.30** Ралі. «Мэта. Дакар». Часопіс.
**20.45** Ралі. «Мэта. Дакар». Часопіс.
**21.00** Фігурнае катанне. Паказальныя выступы (Оберстдорф). Прамая трансляцыя.
**00.00** Зімовыя віды спорту. Фігурнае катанне.
**00.20** Спартовыя бальныя танцы. Чэмпіянат свету ў Аўстрыі (Інсбрук).
**01.15** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Фінал.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** Праект «Будучыня».
**19.35** «Іншае жыццё», дак. фільм, 2008 г.
**20.25** Рэпартэр.
**21.00** Аб’ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Еўфрасіння Полацкая».
**21.25** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.25** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**22.40** Аб’ектыў.

## 31 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**09.05** Анімацыйная камедыя «Тачкі» (ЗША).
**11.05** Сольны канцэрт Ганны Шаркуновай.
**12.10** Музычная казка «Навагоднія прыгоды Машы і Віці» (СССР).
**13.35** «Мароз Іванавіч», «Зіма ў Праставашына». Мультфільмы.
**14.05** Сольны канцэрт Аляксея Хлястова.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Сольны канцэрт Ядзвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча.
**16.35** Прэм’ера. Рамантычная камедыя «Тарыф навагодні» (Расія).
**18.05** «Зорныя танцы». Жаночы сезон. Гала-канцэрт.
**21.00** Панарама.
**21.40** «Навагодняя ноч на Першым».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**00.05** «Навагодняя ноч на Першым». Працяг.
**06.10** Рамантычная камедыя «Тарыф навагодні» (Расія).

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Камедыя «Як стаць шчаслівым».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Фільм «Гусарская балада».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Музычны фільм «Нябесныя ластаўкі».
**15.20** Камедыя «Іван Васільевіч змяняе прафесію».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Працяг фільма «Іван Васільевіч змяняе прафесію».
**17.10** Камедыя «Карнавальная ноч-2, або 50 гадоў пасля».
**20.00** Нашы навіны.
**20.30** АНТ прадстаўляе: «Песня года Беларусі».
**22.55** АНТ прадстаўляе: «Геніяльныя мелодыі на АНТ».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**00.00** АНТ прадстаўляе: «Геніяльныя мелодыі на АНТ». Працяг.
**01.35** «Аліўе-шоў». Навагодняя ноч 2010.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.20** Фільм «Казка аб зорным хлопчыку». СССР, 1983г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Аўтапанарама». Навагодні выпуск.
**11.55** Фільм «Дачка». Расія, 2008г.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Фільм «Сільва». СССР, 1981г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Пяць гісторый».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** Фільм «Загадай жаданне». Расія, 2009г.
**19.00** «Мінск - 2009».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** СТБ прадстаўляе: Прэм’ера! Серыял «Тэарэтыкі». Навагодняя серыя.
**20.50** «Зорны рынг».
**22.00** Навагодні мюзікл «Як казакі...». Украіна, 2009г.
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**00.05** Прэм’ера 2010! «Навагодні КВЗ».
**02.15** Прэм’ера! Навагодні мюзікл «Чырвоны капялюшык». Расія-Украіна, 2009г.
**03.40** «Дыскатэка 80-х. Лепшае».

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** У гэты дзень.
**08.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**09.05** Фільм-казка «Снежная каралева» (СССР).
**10.30** «Трое з Праставашына», «Вакацыі ў Праставашына», «Зіма ў Праставашына». Мультфільмы.
**11.20** Экспедыцыя.
**11.45** Казка-фантазія «Вечары на хутары блізу Дзіканькі (СССР).
**13.05** Жаночая ліга.
**13.40** Пазакласная гадзіна.
**13.55** «Брэменскія музыкі», «Па слядах брэменскіх музыкаў». Мультфільмы.
**14.35** Жывы гук.
**15.15** Камедыя «Бегляткі» (Францыя).
**17.00** Канцэрт ансамбля «Беларускія пясняры».
**17.45** Музычная камедыя «Сабака на сене» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**20.15** Канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа».
**21.20** Прэм’ера. Меладрама «Гісторыя кахання, або Навагодні розыгрыш (Расія).
**23.00** «Жывы гук» у Новы год!.
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**00.05** «Жывы гук» у Новы год!» Працяг.
**02.00** «Браян Адамс. Канцэрт у замку Слейн».
**03.30** «Любімыя песні ў любімае свята». Кінакараоке.
**04.25** «Канцэрт Эмілі Сімон у Алімпіі» (Францыя).
**06.05** Музычная камедыя «Сабака на сене» (СССР). 1-я і 2-я серыі.

**06.40** Прыгодніцкі фільм «Сэрцы трох».
**11.10** Фільм «Шукайце жанчыну».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Камедыя «З Новым годам, тата!».
**16.15** Прэм’ера. «Лепшыя песні-2009». Святочны канцэрт з Дзяржаўнага Крамлёўскага палаца.
**18.25** Навагодняя камедыя «Добрая сяброўка для ўсіх». 2008 г.
**20.20** Прэм’ера музычнай камедыі года «Залаты ключык».
**22.30** Прэм’ера. «Навагодні парад зорак».
**22.55** Навагодні зварот Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дз.А.Мядзведзева.
**23.00** Прэм’ера. «Навагодні парад зорак». Працяг.
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.
**00.00** Навагодні блакітны агеньчык - 2010.
**03.25** Вялікая навагодняя дыскатэка.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Следства вялі...».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Краса Расіі-2009».
**13.00** Сёння.
**13.15** Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**16.00** Сёння.
**16.20** Меладрама «Шакалад».
**18.30** Прэм’ера. Фільм «Глушэц. Прыходзь, Новы Год!».
**20.20** «Карнавальная ноч з Максімам Аверыным».
**23.50** Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
**00.00** «Суперстар» прадстаўляе: «Навагодняе караоке».
**03.10** «Пажар у джунглях. Трапічны баль НТБ».

**09.40** Біятлон. Міжнародны турнір (Гельзенкірхен).
**11.00** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група A.
**11.15** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група C.
**11.30** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група D.
**11.45** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група B.
**12.00** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група E.
**12.15** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група F.
**12.30** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група G.
**12.45** Футбол. Кубак свету ў ПАР. Агляд груп. Група H.
**13.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Лепшыя фіналы 1993 - 2000.
**14.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Оберстдорф). HS 137.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). Кваліфікацыя. HS 140. Прамая трансляцыя.
**16.15** Біятлон. Міжнародны турнір (Гельзенкірхен).
**17.30** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Мілан» (Італія) - «Ліверпуль» (Англія).
**18.30** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Барселона» (Іспанія). 2008 - 2009.
**19.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). Кваліфікацыя. HS 140.
**20.30** Вось дык так!!!
**21.00** Вось дык так!!!
**21.30** Пра рэстлінг. Адмысловы выпуск.
**23.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). Кваліфікацыя. HS 140.
**01.00** Біятлон. Міжнародны турнір (Гельзенкірхен).

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**19.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**19.55** «Дзяк і «Трохграшовая опера», дак. фільм, 2007 г., Італія.
**20.40** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 23 серыя: «Еўрасаюз і Грузія».
**21.00** Аб’ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**22.15** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**23.10** Навагодні канцэрт «Снежны завулак 10».
**00.10** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «З Новым годам!».
**00.15** «Мы вольныя людзі», дак. фільм, 2008 г., Польшча.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №9 (37) (снежань)

www.litbel.org www.novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб’яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


**Анонс**


«НАВІНЫ»: асноўныя падзеі літаратурна-грамадскага жыцця снежня ... 2

«ПРЭЗЕНТАЦЫЯ»: уступ да вершаванай п’есы «АРМАГЕДОН» Уладзіміра НЯКЛЯЕВА ... 3

«ПРОЗА»: Новыя абразкі Ніла ГІЛЕВІЧА з кнігі «Пераждыўшы вайну» ... 4–5

«ПАЭЗІЯ»: ВЕРШЫ Эдуарда АКУЛІНА ... 6

«ПРОЗА»: фрагмент «Пакутная веку» Васіля ЯКАВЕНКІ ... 7

«ПАЭЗІЯ»: вершы ЗЬНІЧА, Алеся МАКРАЦОВА і Язэпа ПАЛУБЯТКІ ... 8


## РОЗГАЛАС

**Сярод літаратурных тэм снежня, якія прыцягнулі ўвагу СМІ, стаў (калі не лічыць забароненых кніг) праект пад гучнай і таўталагічнай назвай «Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы» (СП СД), створаны ў Мінску 4 снежня. «Літаратурная Беларусь» таксама не магла абысці гэтую тэму, а паколькі напрыканцы месяца маем магчымасць зірнуць на яе «комплексна», прапануем своеасаблівы інфарм-дайджэст. Спадзяемся, што высновы з яго зробяць не толькі чыноўнікі, але і чытачы-падаткаплацельшчыкі…**

**БЕЛТА:**

«…на ўстаноўчым з’ездзе Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы ў Мінску старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец і старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі Валерый Ганічаў абраныя сустаршынямі Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

Дэлегаты ўстаноўчага з’езда Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы прынялі зварот да інтэлігенцыі і пісьменнікаў дзвюх краін. У звароце гаворыцца аб тым, што саюз ставіць сваёй мэтай прапаганду твораў класікі, залатога фонду літаратуры. Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы будзе спрыяць стварэнню ўмоў для развіцця новых талентаў у літаратуры...»

**NAVINY.BY:**

«Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) Алесь Пашкевіч паведаміў, што кіраўніцтва СБП не было запрошана на ўстаноўчы з’езд Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

Рада і сакратарыят СБП нікога не дэлегавалі на гэты форум у якасці ўдзельнікаў або госцяў… А.Пашкевіч пажадаў поспеху ўдзельнікам з’езда. Разам з тым, ён выказаў упэўненасць, што правядзенне з’езда па стварэнні Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы з’яўляецца «чарговай прафанацыяй грамадска-літаратурнага жыцця», бо ў Расіі пяць пісьменніцкіх арганізацый, а ў Беларусі таксама іх не адна. «І калі ствараецца новая міжнародная пісьменніцкая структура, павінны калі не ўваходзіць, дык хоць бы згадвацца і запрашацца прадстаўнікі іншых літаратурных аб’яднанняў, у тым ліку Саюза пісьменнікаў Масквы, Саюза расійскіх пісьменнікаў, беларускага і расійскага ПЭН-цэнтраў», — адзначыў А.Пашкевіч.

Па яго словах, задачы і кірункі працы новай арганізацыі нічым не адрозніваюцца ад статутных палажэнняў даўно створанага правапераемніка Саюза пісьменнікаў СССР –Міжнароднай супольнасці пісьменніцкіх саюзаў (МСПС), якое да апошняга дня свайго жыцця ўзначальваў Сяргей Міхалкоў. «Ствараць саюзы стала ўжо модным, але галоўная задача пісьменніка — ствараць літаратуру, чаго ўсім і жадаю», — сказаў А.Пашкевіч».

**РАДЫЁ СВАБОДА:**

«…Мікалай Чаргінец не назваў гучных прозьвішчаў беларускіх пісьменьнікаў, якія запрошаны на ўстаноўчы зьезд…

Запрашаем мы ў залю жадаючых пісьменьнікаў, і таго Саюзу, і нашага».

**«НАРОДНАЯ ВОЛЯ»:**

«…Цікава, што ў новы саюз пісьменнікаў не ўвайшлі такія вядомыя майстры слова, як Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Алесь Жук, Анатоль Вярцінскі, Анатоль Кудравец, Сяргей Законнікаў, Віктар Казько, Валянціна Коўтун, Віктар Карамазаў, Васіль Зуёнак, Вольга Іпатава, Васіль Жуковіч...

«Народная Воля» пацікавілася ў знакамітых пісьменнікаў, чаму яны не ўвайшлі ў новы саюз.

**Рыгор БАРАДУЛІН:**

— Мяне туды не запрашалі, а нават калі б і запрасілі — не пайшоў бы. Я ўсё жыццё ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў і змяняць гэта не збіраюся. Думаю, як няма толку з гэтай Саюзнай дзяржавы, так і не будзе толку з гэтага саюза. Бо там, дзе пачынаецца зараблянне грошай, толку не бывае... Ды і што гэта за саюз? На яго ўстаноўчы з’езд ніхто з прыстойных і значных пісьменнікаў не прыехаў. Гэта проста кіраўнікі ствараюць новы саюз для сябе, а наіўныя людзі спадзяюцца на тое, што ім нешта перападзе.

**Генадзь БУРАЎКІН:**

— Не бачу сэнсу ўваходзіць у нейкі саюз неіснуючай дзяржавы. Гэта падзея не мае ніякіх адносін да развіцця літаратуры, узаемадзеяння беларускіх і расійскіх пісьменнікаў. Гэта ўсё палітычныя гульні вакол прывіднай ідэі вяртання Савецкага Саюза пад іншым соусам...

**Анатоль ВЯРЦІНСКІ:**

— …Чыстай вады палітыка... У свайм змаганні з сапраўдным, законным беларускім пісьменніцкім саюзам — сапраўдным і юрыдычна-прававым, і гістарычным, і ў нацыянальна-духоўным сэнсе — Мікалай Чаргінец прыводзіць, як правіла, адзін і той жа аргумент: маўляў, гэты саюз займаецца не столькі творчымі справамі, колькі палітыкай… Сыр-бор са стварэннем гэтага самага кроўна-брацкага пісьменніцкага саюза — чыстай вады палітыка. І, вядома ж, не самая добрая.

**Алесь ЖУК:**

— Здаецца, гэта гульні, амбіцыі, якія да літаратуры адносін не маюць. Шчыра кажучы, не надта я пра гэты саюз і іншыя калялітаратурныя пытанні думаю. Вось у Расіі пяць саюзаў, і што? Справа ж не ў колькасці, а ў тым, хто чым займаецца. Адно — праца на карысць літаратуры, іншае — калялітаратурная праца або праца на шкоду творчасці...

**Сяргей ЗАКОННІКАЎ:**

— …гэты новы саюз, напэўна, перахопіць эстафету ад праўладнага Саюза пісьменнікаў Беларусі — задавіць і выкінуць нармальны Саюз беларускіх пісьменнікаў, які жыве з 1934 года, быў заснаваны Купалам, Коласам, Гартным. Аднак гісторыю не парэжаш так проста — наш саюз як быў, так і будзе, нягледзячы на спробы ўсё адняць. СПБ дабіўся ўсяго, чаго хацеў: нават зараз арганізаваў кармушку больш маштабную, — акрамя аднаго — пісаць таленавіта. Бо тут не дапамогуць ніякія грошы і пасады.

**Віктар Казько:**

— Не ўспрымаю стварэнне яшчэ аднаго саюза сур’ёзна. Літаратура — справа глыбока нацыянальная. І творчы саюз павінен быць нацыянальным. Каб спатрэбіцца культурнаму свету, мы павінны згуртавацца ў адзіным нацыянальным саюзе… Лічу, у нас ідзе генацыд беларускай культуры, прыгожага пісьменства, сапраўднага мастацтва. Стварылі вось Грамадскі савет па маральнасці. Яго, дарэчы, узначаліў Чаргінец, які напісаў раман пра крывыя члены. А маю кнігу «Дзікае паляванне ліхаладзіцы» ўзялі і выключылі з продажу ў дзяржаўных крамах. Хаця ў ёй ні пра якія члены не было...

**Валянціна Коўтун:**

— Некалькі дзесяцігоддзяў я з’яўляюся сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў, куды мяне прымалі яшчэ Панчанка, Мележ, Куляшоў. Іншыя саюзы ў мяне выклікаюць толькі пытанні... Пра стварэнне новага саюза я даведалася амаль выпадкова. Ну вось — з’явілася яшчэ адна паўжывая арганізацыя. Таму што ў творчых пытаннях галоўны аргумент — не юрыдычная даведка, а творчасць... Здаецца, акрамя вырашэння меркантыльных пытанняў для асобных людзей, ён нічога больш не зробіць. Не думаю, што гэты саюз унясе штосьці новае ў літаратуру ці палепшыць таленты. Талент даецца не саюзам, а Богам».



## НАВАГОДНЯЕ

**Васіль ЗУЁНАК**

*Як мала іх, тых вёснаў, на вяку,*
*Але ж, здаецца,*
*што не больш і зімаў…*
*Адыдзе год — і не падасць руку*
*Табе, свайму зямному*
*пабрацiму.*

*І ўжо ніколі не сустрэцца вам…*
*За годам год на вечнае расстанне*
*Спяшаюцца — і ўжо ні тут,*
*ні там*
*Ты не пабачыш іх, як на экране.*

*Яны ўжо не твае, і ты для іх —*
*Як сцёрты знак у вечнасці*
*панылай…*
*Не верыцца аднак: няўжо хоць міг*
*Не вернецца з бясконцай*
*той магілы?..*

*Няўжо ўсё так: чужыя чужакі*
*Вы будзеце ад сёння назаўсёды…*
*І не пытайся: хто ты ёсць такі, —*
*Маўчаць, знікаюць дзесьці —*
*год за годам…*

## КАЛЯДНАЕ

**Валерыя КУСТАВА**

***Калі я быў маленькі, усе мае сябры наконадні Калядаў пісалі лісты з пажаданням Дзеду Марозу ці Святому Міколу, я ж пісаў лісты Богу, бо лічыў, што Бог — самы галоўны Дзед Мароз, прэзідэнт усіх святых Мікалаеў.***
***Замест эпіграфа***

*Мэры Крыстмас! Глянь наўкола!*
*І прыдзі, святы Мікола,*
*снегам поўніць далягляды*
*на Каляды, на Каляды!..*

*Не праз сінія этэры,*
*а праз комін у кватэры.*
*Ды ў шкарпэткі пакладзі*
*дзівы — о-дзі-ры-дзі-дзі!*

*Як анёлак б’е ў курантны,*
*прамаўляю модлы-мантры:*
*дай нам, Звышні, на Каляды*
*шчасця ў горад наш праклятыя.*

*Дай нам добрае надвор’е*
*без глабальных пацяпленняў.*
*Дай дзівоснае сузор’е,*
*дзе Венера з Марса млее.*

*Дай шалёных закаханняў*
*і каханых найшалёных,*
*каб у кожным у дыханні*
*любыя пачуць імёны.*

*Шчодры вечар. Шчыры вечар —*
*Добраму святому люду.*
*Словы простыя і рэчы*
*зіхацяць прадвеснем цуду.*

*Калі быў зусім малечай,*
*я прасіў узяць на плечы*
*ў таты, мамы і ў дзядулі —*
*ды круціў з вышыняў дулі.*

*А цяпер прашу я ў Бога,*
*бо галоўны Ён Мікола,*
*каб пакутную дарогу*
*не разбіла часу кола.*

*Як раней прасіў я цацкі,*
*шчанюка і шмат цукерак,*
*так цяпер прашу я ласкі*
*боскай і людзей даверу.*

*Я раней дурнеў на святы,*
*у зімовай завірусе*
*кідаў ледзяшамі ў брата*
*і ў сумёт хавацца мусіў.*

*А цяпер гляджу я ў неба*
*кожнаю калядной ноччу.*
*Падарункаў мне не трэба,*
*толькі б, Божа,*
*мне не збочыць…*

*На Каляды… На Каляды*
*Пахне цытрусавай елкай.*
*Ліхі ўсе і нашы звады*
*заліваем мы гарэлкай.*

*На Каляды… На Каляды*
*Беларусі роднай зычу*
*новай праўды, новай рады,*
*новага жывога клічу.*

*Новага-старога сцягу.*
*Новага-сівога гімна.*
*Каб на еўрапейскім шляху*
*ды не згінуць.*

*Каб зямля нам нарадзіла*
*Каліноўскіх і Скарынаў.*
*І каб не ўцякла радзіма*
*за кардон ці за адрыну.*

*На Каляды! На Каляды*
*Казкай поўніць далягляды.*
*Снегам поўніць туманы.*

*…А ўначы гучаць званы...*

СЕМІНАР

# ЛІТАРАТУРА — ДЗЕЦЯМ

**Саюз беларускіх пісьменнікаў правёў конкурс і агульнарэспубліканскі семінар па праблемах дзіцячай літаратуры.**

На конкурс было атрымана 69 твораў у розных жанрах: нізкі вершаў, кнігі вершаваных карацелек, слоўнік, паэтычныя зборнікі, вершаваныя п'есы, абразкі, апавяданні, аповесці, «генеральныя рэпетыцыі дзіцячых кніг», пераклады, інсцэніроўкі па беларускіх народных казках і інш. У конкурсе СБП прынялі ўдзел як прафесійныя літаратары, так і пачаткоўцы. Сярод іх — жыхары Мінска і бадай усіх абласных рэгіёнаў Беларусі: Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна, Магілёва…

Сакратарыят СБП правёў папярэдні адбор дзесяці лепшых твораў. Іх аўтарамі сталі:

Маргарыта Аляшкевіч, Марыя Баравік, Вера Бурлак, Алена Грункоўская, Васіль Жуковіч, Галіна Каржанеўская, Павел Ляхновіч, Міхась Міранoвіч, Аксана Спрынчан і Андрэй Хадановіч.

28–29 лістапада пад Мінскам у гасцінным будынку праваслаўнай епархіі Кінанія ў Калодзішчах адбыўся семінар па праблемах дзіцячай літаратуры, які ладзіў Саюз беларускіх пісьменнікаў. На семінар прыехалі ўдзельнікі конкурса, літаратуразнаўцы, ілюстратары дзіцячай літаратуры і выдаўцы, а таксама госці са Швецыі, у тым ліку намеснік старшыні Саюза шведскіх пісьменнікаў Эва Сусо.



Фота «Ь»

За агульным сталом.



Выступае намеснік старшыні Саюза шведскіх пісьменнікаў Эва Сусо.

Падчас працы семінара былі падведзены вынікі конкурса на лепшы твор для дзяцей. Конкурс доўжыўся цягам года. Як адзначыў журналістам старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч, «сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў выбраў 10 лепшых твораў. Дзесятку лаўрэатаў конкурса запрасілі на семінар. Майстар-класы праводзілі вядомыя беларускія аўтары дзіцячай літаратуры (Пятро Васючэнка, Людміла Рублеўская, Алена Масла і інш.), а таксама нашыя калегі са Швецыі (намеснік старшыні Саюза шведскіх пісьменнікаў Эва Сусо ды мастачка і дзіцячая пісьменніца Анна Хёглунд)».

Пераможцам конкурсу, на думку журы, стала паэтка Аксана Спрынчан (Мінск), другое месца прысуджана Маргарыце Аляшкевіч (Мінск), трэцяе — Паўлу Ляхновічу (Пінск). Ганаровая заахвочвальная прэмія за ўнёсак у развіццё дзіцячай літаратуры ўручана таксама вядомым творцам Галіне Каржанеўскай і Васілю Жуковічу.

26 снежня ў Мінску адбудзецца падобны семінар па праблемах літаратурнай крытыкі, які арганізавала і праводзіць рэдакцыя часопіса «Дзеяслоў» супольна з сакратарыятам Саюза беларускіх пісьменнікаў.

**Н.К.**

РОЗГАЛАС

# ПЛЕНЭР У ПАЛАНЗЕ

**На пачатку верасня мне пашанцавала трапіць на незвычайны літаратурна-мастацкі пленэр. Толькі ўявіце: мора, сонца і цудоўная кампанія, якая суткі навылёт толькі і гаворыць пра паэзію. ІІІ-ці Міжнародны пленэр паэтаў і мастакоў, прысвечаны тысячагоддзю Літвы, сёлета прайшоў у Паланзе (у два папярэднія гады ладзіўся ў Нідзе і Друскеніках).**



Фота Сары Пуасон

Са старшынём Саюза літоўскіх пісьменнікаў Ёнасам Лінsocкасам на паэтычна-музычнай вечарыне ў клубе «Анапіліс» (Паланга).

Беларускі паэтычны дэсант гэтым разам выявіўся найбольш маладым — у вясёлай кампаніі Андрэя Хадановіча, Глеба Лабадзенкі, Віталя Рыжкова і Насты Манцэвіч мне давялося трапіць у Вільню, дзе ў нас было колькі часу, каб агледзецца, прычакаць сваіх калег з Грузіі, Літвы і Украіны — і ўжо разам рушыць да Палангі, да Дому творчасці. Шукальнікі словаў і фарбаў цешыліся магчымасці (дадзеная Дэпартаментам развіцця супрацоўніцтва і падтрымкі дэмакратыі Міністэрства замежных спраў Літвы) бавіць час поруч пад гасцінным наглядам куратаркі праекту, вядомай літоўскай пісьменніцы і намесніцы старшыні Саюза літоўскіх пісьменнікаў Бірутэ Янушкайтэ. Удзень паэты збіралі перліны-словы на пляжы, сягаючы ў сваіх пошуках да самага далягляду, у якім мора рабілася небам. Мастакі ж выяўлялі на сваіх палотнах усё гэтае дзіва. А ўвечары ўсе разам збіраліся за сталамі на творчыя майстэрні — гутарылі, абмяркоўвалі, спраўджвалі паэтычныя нюансы з аўтарамі і натхняліся ажно да самае раніцы.

Фінальным аккордам пленэру была паэтычна-музычная вечарына ў мясцовым клубе «Анапіліс», дзе ўвесь горад змог ацаніць тое, чаму быў прысвечаны цэлы тыдзень супрацы. Са сцэны гучалі арыгіналы вершаў у выкананні аўтараў, і, вядома, для прысутных палангаўцаў яны перакладаліся на літоўскую мову. А ў фае клуба адбылася выстава карцін мастакоў, прымеркаваная да заканчэння пленэру.

Вынікам творчых намаганняў сталася літаратурна-мастацкая анталогія «Вечары богавага дрэва», у якую трапілі творы ўсіх удзельнікаў пленэру ў перакладзе на літоўскую, беларускую, украінскую і грузінскую мовы. З беларускага боку кнігу аздобілі карціны Марыі Ісаёнак, Віталя Гуназы і Алены Пятроўскай. Прэзентацыя інтэрнэт-версіі альманаха адбылася ў лістападзе ў Вільні ў залі дома Саюза пісьменнікаў, дзе фарбы вершаў і карцін заззялі новым святлом. Як адзначыў у прадмове да анталогіі старшыня Саюза літоўскіх пісьменнікаў Ёнас Лінsocкас, «гэты пленэр дазволіў не толькі рассунуць далягляд літоўскай паэзіі, але і наноў вынайсці грузінскую філасофскую паэзію, параўнаць маладых беларускіх паэтаў з маладымі літоўскімі, а літоўскую лірыку — з украінскаю. У свае краіны госці вярталіся пасланцамі культуры Літвы, з думкамі і спадзяваннямі, што такія пленэры трэба ладзіць зноў і зноў — і ў Грузіі, і ў Беларусі, і ва Украіне, і ў Літве».

Няхай так і будзе!

Надоечы згаданая анталогія з'явілася на сайце Саюза літоўскіх пісьменнікаў, дзе кожны зможа азнаёміцца з яе зместам.

**Валерыя Кустава**

ЗАПРОСІНЫ

# СЛАВА ГЕРОЯМ!

Арганізацыйны камітэт украінскага фестывалю «Крыкнулі крывёю Круты» запрашае прыняць удзел у паэтычных чытаннях беларускіх творцаў.

Выступленні на літаратурна-акустычнай сцэне першага ва Украіне зімовага open air'у — гісторыка-патрыятычнага фестывалю — адбудуцца 29-30 студзеня 2010 года ў вёсцы Круты Ніжынскага раёна Чарнігаўскай вобласці, паблізу мемарыяла Героям Крут.

29 студзеня 1918 года — асаблівы дзень у гісторыі незалежнай Украіны. Гэта дата трагічнага бою пад Крутамі, у якім кепска ўзброеныя кіеўскія студэнты і гімназісты выступілі супраць расійска-бальшавіцкіх захопнікаў, адстойваючы волю Радзімы. Круты сталі сімвалам трагічнай долі ўкраінскай нацыі, сімвалам гонару і смутку.

«Але народ, які толькі аплаквае сваё мінулае, — гаворыцца ў прэс-рэлізе аргкамітэта фестывалю, — не мае будучыні. Сярэднестатыстычны ўкраінец сёння нярэдка адмаўляецца лічыць палеглых юнакоў героямі, не разумее іхняй матывацыі».

Заклапочаная такой сітуацыяй ініцыятыўная група свядомай украінскай моладзі з падтрымкай шэрагу грамадскіх арганізацый («Малады народны рух», «Пласт», МНК, СУМ ва Украіне, Нацыянальны Альянс) вырашыла правесці першы ўсеўкраінскі гісторыка-патрыятычны фестываль «Крыкнулі крывёю Круты». Асноўная ідэя фестывалю палягае ў тым, што падзеі 29 студзеня 1918 года нельга разглядаць асобна ад гісторыі Украінскай Народнай Рэспублікі. Гэта была перамога рыцарскага духу.

Зыходзячы з гэтага, аргкамітэт фестывалю прапанаваў ушанаваць памяць герояў не плачам, а дэманстрацыяй неўміручай творчай сілы ўкраінскай нацыі. Удзельнікаў і гледачоў чакаюць канцэрты патрыятычных гуртоў і выканаўцаў, літаратурныя чытанні, тэатральныя выставы, кінапаказы, дыскусіі, семінары і інш.

Аргкамітэт фестывалю забяспечвае ўдзельнікам праезд, харчаванне і начоўку ў вагонах адмыслова зафрактаванага на час мерапрыемства цягніка.

Звязацца з арганізатарамі можна наўпрост па ўкраінскім нумары:

**8-10380678667141.**

# ЯПОНСКІ БЭСТСЭЛЕР ГОДА

**Новы двухтамовы раман Харукі Муракамі «IQ84» стаў сенсацыяй культурнага жыцця Японіі і прызнаны «бэстсэлерам года». Кніга выйшла на першае месца па колькасці надрукаваных асобнікаў: 3,23 мільёна.**

Раман выклікаў ажыятаж адразу пасля публікацыі — кнігу літаральна зміталі з прылаўкаў. Гэты першы мастацкі твор з 1990 года, які заваяваў у Японіі статус «бэстсэлера года». Да гэтага на першае месца выходзілі разнастайныя займальныя даведнікі, мемуары, дакументальная літаратура. Сёлета раману Муракамі не нашмат саступіла кніга, якая распавядае аб цяжкачытэльных іерогліфах…

Па словах Муракамі, раман «IQ84» быў задуманы як свайго роду адказ на знакаміты «1984» Джорджа Оруэла. Гэтая кніга мае некалькі ліній, аднак у цэлым распавядае аб тым, як нейкая левая групоўка паступова ператвараецца ў секту вар'ятаў і забойцаў.

Растлумачваючы задуму рамана, пісьменнік у адным з інтэрв'ю сказаў, што некалі папулярны марксізм цяпер усё больш замяшчаецца фундаменталізмам і сектанцтвам. Кніга «IQ84», пераконвае літаратар, павінна паказаць людзей сучаснага свету, якія жывуць ва ўмовах глабальнага хаосу.

60-гадовы Харукі Муракамі, бясспрэчна, самы вядомы цяпер у свеце японскі пісьменнік. Амаль усе яго раманы станавіліся бэстсэлерамі: «Паляванне на авечак», «Нарвежскі лес», «Хронікі завадной птушкі», «Кафка на пляжы». Раманіст лічыцца таксама адным з верагодных кандыдатаў на атрыманне будучай Нобелеўскай прэміі па літаратуры.

**Паводле Newsru**



ПРАДМОВА

# БОГ НА ЗЯМЛІ НЕ ЖЫВЕ?..*

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ



**Уступ да вершаванай п'есы «АРМАГЕДОН»**

Ёсць у мяне сябар, драматург, ён мне сказаў: «Ты ніколі не напішаш п'есу. Усе свае п'есы ты пражыў у жыцці».

Ён так і сказаў: «Пражыў у жыцці».

Раптам я адчуў, што не згодны з ім: не ўсе, не пражыў… І напісаў п'есу.

Магчыма, я напісаў не п'есу, не ведаю: раней я не займаўся драматургіяй. А калі й займаўся, дык выпадкова. Перакладаў, праўда. Шэкспіра, Лопэ дэ Вэгу, яшчэ некага… Таму ўсё ж будзем лічыць, што гэта п'еса. Вершаваная. А ў вершах галоўнае — тэмп і рытм.

Каб да гэтага болей не вяртацца, вы ўжо, калі ласка, запомніце: тэмп і рытм. Дакладныя паўзы. Моцныя і слабыя долі, іх чаргаванне. Тое, з чаго ўзнікае інтанацыя. То бок, тое, з чаго ўзнікае не толькі мастацтва, а ўсё: мора, маланка, птушка, жанчына. Як мінімум, у нашай свядомасці.

Я доўга думаў, пра што напісаць п'есу — і не прыдумаў, пра што… Таму напісаў пра ўсё, што можа стацца з чалавекам. І не толькі тады, пакуль чалавек жывы, але і тады, калі ён мёртвы.

З п'есы вынікае, што смерці не бывае. Хоць завяршаецца п'еса концам свету.

Гэтая супярэчнасць і ёсць аснова быцця. На ёй і стаіць, хістаючыся, свет.

Яшчэ адна супярэчнасць — хоць не такая істотная: я не хацеў называць п'есу «Армагедон». Яна сама так назвалася.

П'еса гэтая не пра Захад і Ўсход, не пра габрэяў і славян, не пра палітыку, а ўжо тым больш не пра дыктатуру. Гэта так, драбяза… Чапляеш па паверхні — дык і што бліжэй ляжыць. Але тое, што ў п'есе прысутнічае тэма вар'яцтва, ненармальнасці не толькі дыктатуры, але й любой улады, усялякага *гвалту* — так.

З п'есы вынікае, што той, хто згвалціў, забіў — не герой. Хто б яго ні называў героем.

Мне было гадоў дзесяць, калі я злавіў і забіў котку. Яна жыла ў свіране, бяздомная. Я забіў яе, узяўшы за заднія лапы — галавой аб бетонны слуп. Доўга, размахваючыся, я біў і біў каціным целам аб бетон, у коткі г а л а в ы ўжо не было, а я ўсё лупіў, лупіў і лупіў!..

Агрэсію, калі ўжо яна ўзнікае, немагчыма кантраляваць — і ў ёй ёсць асалода. Таму ніколі не будзе *апошняга* дыктатара, за апошнім абавязкова з'явіцца наступны.

Дамы з таварыства аховы жывёлін маюць поўнае права глядзець на мяне грэбліва. Можа быць, я хоць неяк перад імі апраўдаюся, калі паклянуся, што нікога, апроч той коткі, за ўсё сваё жыццё не загубіў. Апроч рыбіны, срабрыстай сёмгі, якую вылавіў я ў рацэ Умбе на Кольскай паўвыспе. Але ж лоўля рыбы — не забойства, не грэх... Рыбакамі былі двое апосталаў: Андрэй і Пётра. Ці нават чацвёра, калі ўлічыць Яна і Якава, *якія пачынялі сеці свае*… І Гасподзь карміў хлебам і рыбай.

Забіўшы котку, я адразу ж захварэў. Цяжка. Два тыдні па вачах доктара бачыў: ён думае, што я памру. Але я не памёр.

Маці малілася за ўратаванне маёй душы, а пасля, калі я ачуняў, павяла і мяне маліцца. Дзякаваць Богу за тое, што пакінуў мяне жывым.

Я спытаў папа, ці можна памаліцца за ўратаванне душы коткі?.. Поп сказаў, што нельга.

Чаму? У коткі няма душы?.. Але як мы можам пра тое ведаць?

Гэтая котка пераследуе мяне. Я спрабаваў забіць яе другім разам, у памяці — не выйшла. Я змусіў забіць яе аднаго з маіх літаратурных герояў — не дапамагло. Я ўспамінаю і ўспамінаю яе, пра яе думаю, яна мне сніцца. Прычым, кожнага разу сніцца розная: белая, чорная, рудая, у плямы — я не магу згадаць, якога тая, рэальная, забітая мной котка, была колеру? І такое адчуванне, нібы забіў я не адну, а дзесяткі, сотні, тысячы котак…

Начытаўшыся кніг па псіхалогіі, я разумею, адкуль яна — мая забітая котка. Але тое, што я гэта разумею, ніяк мяне не ратуе. І кожнага разу, калі я пазбаўляюся чарговай, белай ці чорнай, коткі, з жахам думаю: а калі б я чалавека забіў?.. Белага ці чорнага…

Я ўдзячны Богу за тое, што не паслаў Ён мяне на вайну, не стварыў варункаў, у якіх я мог бы — ці павінен быў бы — забіць. У дадзеным выпадку ў тым жа самым дзеяслове *забіць* зусім іншы — вы адчуваеце? — сэнс. Можа быць, *той коткай* Бог мяне ад *гэтага* перасцярог? Хаця наўрад ці, наўрад ці… Тут нешта іншае.

Калі вы бачыце… ну, скажам, у кіно, як галоўны герой, апантаны помстай, забівае, знішчае забойцу свайго брата, сваёй жонкі ці дзіцяці — вы пра што думаеце? Пра тое, што ён парушае закон? Як чалавечы, гэтак і боскі? І ў вас якое адчуванне? Жаху?.. Не. У вас адчуванне спраўджанай справядлівасці! І выклікане, народжанае яно ў душы вашай не Богам, не Богам…

У коткі няма душы — і Бог на зямлі не жыве?..

У дзяцінстве, ранкам прачнуўшыся, я амаль заўсёды знаходзіў свае чаравікі— кожны паасобку — у розных кутах. Дзед казаў: «З табой дамавік гуляе». Хоць ведаў, што звычка ў мяне такая: кідаць, кладучыся, чаравікі абы куды. І прыкмета аднекуль узялася: крочыць у адным чараўніку — скарачаць зямны шлях маці. Колькі крокаў ступіў — на столькі дзён скарачаў. Таму, абуўшы адзін чаравік, я скакаў да другога на адной назе, але колькі я на адной назе ні скакаў – маці ўсё адно памерла.

Мы не можам ніяк, нічога і нікога ўратаваць?..

Хіба нельга было ўзяць адзін чаравік і басаножа падысці да другога?.. Можна было. Але такое простае вырашэнне праблемы жыцця і смерці ніводнага разу не прыйшло мне ў галаву.

Найпрасцей мы ўскладняем — і ў тым таксама супярэчнасць.

Апроч сябра-драматурга, ёсць у мяне яшчэ адзін сябар, паэт. Мы з ім садзілі лес у Чарнобыльскай зоне, каб пыл не лятаў, каб зратаваць жывую, тую, якая побач, зямлю. Мы садзілі малады лес у працяг старога, з якога выскачыў аднойчы заяц-мутант — і перабег у лес малады. У яго не было двух галоў, не, але ён быў вялізны, сінебелы — і за ім цянуўся сіне-белы, нібы фасфарычныя, след…

Нельга, аказалася, працягнуць лес, не працягнуўшы тое, што ў ім. Усё адно ў адным.

Калі я пасадзіў маладую сасонку побач са старой, мне здалося, што старая нахілілася і пагладзіла яе.

Ноччу я падышоў да той векавой сасны… Стаяў і заклінаў яе падаць мне знак, што яна жывая, што можа абараніць, зратаваць.

Дрэва пагладзіла мяне па спіне. Я папрасіў, здранцвеўшы: «Яшчэ раз…» — і дрэва пагладзіла яшчэ раз. Я падумаў, што вецер, але ніжнія галіны сасны былі куды вышэй за маю галаву, куды вышэй…

З п'есы вынікае, што ў коткі ёсць душа — і дрэва не мёртвае.

У той жа аповесці, дзе я змусіў аднаго з персанажаў забіць котку, другі персанаж доўга яе даганяе, каб пагладзіць. Не забіць, не ўдарыць — пагладзіць…

П'еса пра банальнае: пра тое, што кожнаму хочацца, каб яго пагладзілі. Абаранілі, зратавалі. Але вельмі цяжка пра такое папрасіць: дранцвееш.

П'еса — пра няўтульнасць свету. Пра дысгармонію. Пра бессэнсоўнасць, якая не патрабуе сэнсу — і таму неверагодна складана сэнс знайсці.

У п'есе я не знайшоў яго — у выніку. Але ён бачыўся мне, калі я пісаў п'есу. Сэнс быў у тым, каб п'есу напісаць.

З п'есы вынікае, што сэнс жыцця ў тым, каб жыць. І не трэба баяцца гэтай банальнасці.

Я не толькі ў жыцці, але і ў літаратуры банальны. З усіх накірункаў мастацтва мне найбліжэй сентэменталізм, з усіх жанраў — меладрама. І абавязкова такая, каб быў happy end. Таму ў адным з варыянтаў п'есы я паспрабаваў прыдумаць happy end, вярнуўшы з таго свету на гэты памерлую дачку, Кацю, але яна не захацела вяртацца. І ў тым не мая віна. Гэта жывога можна змусіць зрабіць тое, чаго ён не хоча рабіць, а мёртвага — не.

Іншым разам я думаю, што добра быць мёртвым. Толькі неяк так хітра мёртвым: нібы мёртвым — нібы не. Каб насамрэч быць жывым.

У школе я быў закаханы ў дзяўчынку, ячэ імя было падобнае на кветку. Яна жыла ў ваенным гарадку — і там, на стадыёне, знайшла з сяброўкай міну. Міну сцягнулі прапары з вайсковага склада — рыбу глушыць. І, п'яныя, згубілі. Міна была плоская і круглая, як дыск, сяброўкі сталі гуляць з ёй, качаць — і ўсё выбухнула.

Дык вось я ніяк тады не мог уцяміць, што тая дзяўчынка — мёртвая. Ведаць-то ведаў, але не разумеў. І цяпер не разумею.

А пра сяброўку яе і ведаў, і разумеў: мёртвая.

Як жа так?..

Непадалёку ад вайсковай часці, дзе стаялі ў шахтах нацэленыя на Амерыку ракеты, быў хутар. І пра шахты, і пра ракеты, і пра тое, куды яны нацэленыя, ведалі ўсе. І тым не менш — яшчэ адна супярэчнасць — гэта было найвялікшым дзяржаўным сакрэтам.

На хутары жыла ўдава Дурэйчыха з прыдуркаватай дачкой Зінай. І меў бінокль — і глядзеў з лазняку каля рэчкі, як прыходзілі салдаты і гвалцілі Зіну. Яны давалі Зіне пернікі — і Зіна іх грызла; салдаты яе гвалцілі, а яна грызла пернікі.

Салдат, маладых, было многа, адной Зіны ім не хапала — і яны гвалцілі яшчэ й казу Дурэйчыхі. Калі ў казы здараўся перапынак, яна адыходзіла і пашчыпвала траву.

Зіна запівала пернікі казіным малаком. Яно сцякала з падбародка на грудзі, салдаты рабілі выгляд, нібы доіць Зіну — і смяяліся.

Потым прыходзіла Дурэйчыха, якой салдаты баяліся — і збягалі.

Чаму яны, салдаты, баяліся Дурэйчыхі?.. Яна была старая і няддужная.

Маім першым школьным настаўнікам быў габрэй з прозвішчам Цукерман. Ён не мог быць старым і нядужным, ягоны малодшы сын сядзеў са мной у школе за адной партай, але чамусьці запомніўся мне мой першы настаўнік старым і нядужным. Жонка ягоная са старэйшым сынам з'ехалі ў Ізраіль, дзе пачалася вайна, дзе старэйшага сына забралі ў армію — і на вайне забілі.

Як вы думаеце: што зрабіў мой настаўнік?.. Ён з малодшым сынам з'ехаў у Ізраіль, дзе зноў пачалася вайна, дзе малодшага сына забралі ў армію — і на вайне забілі.

Я праводзіў іх, калі яны з'язджалі… Рабіць гэтага было н е л ь г а, але малодшы сын Цукермана быў маім сябрам, і я спытаў яго, развітваючыся: «Ты хочаш, каб цябе забілі? За нешта чужое на чужой зямлі…» І сябар мой адказаў: «Так габрэям трэба…»

Можа быць, я не ведаю… Але чаму?

Калі я пісаў п'есу, дык, каб перадыхнуць, пераключыцца на нешта іншае, даволі шмат чытаў. І вось што вычытаў у Канфуцыя.

У яго, у Канфуцыя, нібыта спыталі:

«Ці можна дазнацца, што было раней за неба і зямлю?»

«Можна, — нібыта адказаў Канфуцый. — Раней было тое самае, што й цяпер».

П'есу (а дакладней: першы яе варыянт) пісаў я ў Фінляндыі, у Хельсінкі. Некаторыя сцэны напісаліся ў Стакгольме і на пароме. Паміж Хельсінкі і Стакгольмам — Батнічная затока, па якой ходзіць паром. Ён вельмі зручны, бо ўдзе пераважна ўночы: спіш — і плывеш.

Мы спім і плывем.

У Стакгольме я спаткаў землячку: Рэню, Рэгіну… На пароме яна прыснілася мне медсястрой.

Калі Рэгіна сыходзіла, яна сказала ў дзвярах: "Не крыўдуй…» Нібы яна сыходзіць не таму, што я так хачу, а насуперак маёй волі. Тым самым яна змяніла не толькі фінал, а ўсю нашу гісторыю ад самага пачатку.

Вось што значыць сказаць нейкія словы якраз тады, калі іх трэба сказаць. Хай самыя банальныя, але ў час і ў найдапаведнай для іх сітуацыі… У жыцці гэта — мудрасць, у літаратуры — талент. Ці, калі заўгодна, прафесіяналізм. Майстэрства.

У мяне ёсць яшчэ адзін сябар-паэт, фінскі. І ўго кепскі характар, праз які ад яго сыходзяць жанчыны, але ён упарты ў перакананні, што гэта ён сыходзіць ад іх, і кажа ў дзвярах: «Не крыўдуй…»

Бачыце: усё тое самае — і ўсё рознае. Хоць для сусвету, для неба і зямлі, для Канфуцыя не мае значэння, хто ў дзвярах — і што ён кажа.

Не цяжка заўважыць, што ў п'есе як бы некалькі магчымых фіналаў — і самыя нецярплівыя могуць прыйсці да аднаго з іх яшчэ ў першай дзеі. Тады можа атрымацца спектакль пра гаротнага бацьку. Калі ж трохі патрываць, працягнуць да сцэны ўваскрасення Дачкі, тады можа быць спектакль пра бацьку шчаслівага. Канешне, шчаслівага ў тым выпадку, калі Дачка зноў захоча ў гэтым свеце жыць.

Спектакль з такім фіналам маглі б паставіць амерыканцы.

Амерыканцы надта сентыментальныя, надта... Амаль як немцы.

Калі я пакідаў Фінляндыю, амерыканцы з немцамі запрашалі мяне жыць у іх, застацца назусім… Я казаў, што не магу назаўсёды пакінуць радзіму, бо там у мяне ўсе, каго люблю — і амерыканцы з немцамі мяне разумелі.

Самае дзіўнае ў свеце для мяне тое, што нехта некага яшчэ здольны разумець. Бадай, гэта найлепшае, што можа стацца паміж намі.

**П'еса «Армагедон» будзе друкавацца ў часопісе «Дзеяслоў».**

* Назва дадзеная рэдакцыяй «Ь».

АБРАЗКІ

# НОВЫЯ РАЗДЗЕЛЫ КНІГІ «ПЕРАЖЫЎШЫ ВАЙНУ»

Ніл ГІЛЕВІЧ



## Мама… Гэта — праўда?

Першы ваенны ліпень быў сонечны, сухі, гарачы, і хоць яшчэ не ўвабраўся ў палавіну — на ўзлесках пачалі ўжо чырванець суніцы і досыць смела вытыркацца з ягадніку спелыя чарнічкі. У жыцці пастушкоў — дзяцей і падлеткаў — гэта азначала: пара рабіць з лазовай кары кузаўкі і збіраць у іх божую смакату. А яна была для нас не толькі ласункам, але і сякім-такім «харчам», ва ўсякім разе хоць трохі спатоліць голад кузаўком ягад было можна.

Не помню, з-за чаго, але менавіта збіраючы ягады мы пасварыліся і нават пабіліся з Фэлькам Шпачком. Мы былі аднагодкі, але я быў трохі больш рослы, можа, і дужэйшы, і верх быў мой. Вось тады, пад крыўду і злосць, Фэлька і выпаліў мне:

— Пачакай, пачакай, будзе табе не такое! Твой бацька камуніст — і немцы вас усіх заб'юць, усю вашу сям'ю!..

Пагроза была такая нечаканая і страшная, што я спачатку нават разгубіўся. Звычайна мы, сябрукі, у такіх выпадках па слова ў кішэнь не лезлі і давалі адказ адпаведне. А тут — як бы нават і мову мне на колькі секунд адняло. Я ведаў, што наш бацька камуніст і што нямецкія фашысты — ворагі савецкай улады і камунізму, але… але… Але ж таты няма, яго ж забралі ў армію, ужо на другі дзень вайны. Гэта я і сказаў Шпачку — зусім не задзірыстым, амаль ціхім голасам:

— Дык жа наш тата на вайне…

Шпачок, відаць, адчуў, што «заехаў не туды», зачапіў тое, што казаць няможна, вялікі грэх, — вінавата замаўчаў і падаўся ад мяне прэч.

Па захадзе сонца, прывёўшы з пасьбы Недзяленю, усё яшчэ ўражаны тым, што пракрычаў мне Фэлька, я падышоў да мамы і няголасна, з перадыханнем, спытаў:

— Мама… гэта — праўда?

— Што — праўда? — заўважыла мама мой якісь нязвыклы заклапочаны пагляд.

— Што немцы… нас заб'юць, усю нашу сям'ю?..

Мама, вядома ж, зразумела, што я гэта ад некага пачуў — і таму пытаюся, ці праўда.

— Табе нехта сказаў?

— Шпачок сказаў… Там, у полі…

— Дурны твой Шпачок — дык дурное і гаворыць, — цяжкім апалым голасам прагаварыла мама. — Не думай, сынку, пра гэта, не думай…

Назаўтра апаўдні прыйшла з Айнаравіч праведаць нас цётка Ганна, маладзейшая маміна сястра, і я міжволі пачуў, як мама, горка ўсхліпваючы, пераказвае ёй маю размову з Фэлькам. Пачуў і новае: аказваецца, мама хадзіла ўчора вечарам да бацькоў Шпачка. «Хадзіла, Ганначка, заплакала там і спытала ў Еўкі — Петруся дома не было: «Што мы вам кепскае зрабілі — ці я, ці мой Сымон, ці мае дзеці? Чаму ж Ваш Фэлька радуецца?» Еўка запэўнівала мяне, што гэта ён недзе пачуў, што дома, у іх сям'і, ён не мог пачуць такое…»

Прыходзіла, ці не ў той жа дзень, і цётка Паўліна з Пасёлку, старэйшая бацькава сястра. У тыя дні нашы блізкія родныя перажывалі за нас, за жонку камуніста Кацярыну з дзецьмі, бо пачалі хадзіць надта страшныя чуткі… Думаю, што гэта цётка Паўліна, сама жанчына набожная, настрашыла маму і пераканала, што трэба неадкладна везці ў Лагойск і пахрысціць у царкве дзяцей. Бо гэта ж не жартачкі! Мала таго, што дзеці камуніста, дык яшчэ і ўсе да аднаго нехрышчоныя! Поўная хата нехрысцяў!

У бліжэйшую нядзелю мамін стрыечны брат Ліксандар Давідовіч узяў у яшчэ не распушчаным калгасе падводу, і мы паехалі ў Лагойск на хрышчэнне. На возе — мама з чатырохмесячным Алесікам на руках, двухгадовы Марацік, пяцігадовыя Света і Коля, нашы двайняты, і сямігадовая Ідзея; старэйшыя — Ліна, Леўка і я — за возам, пешкам; ну, дзе з гары — і мы падсаджваліся. У Лагойску, а было ўжо пад абед, нам не пашанцавала: царква зачынена, поп пайшоў да некага з лагайчан на хрэсьбіны. Дзядзька Ліксандар загнаў падводу на цяністы царкоўны двор і падаўся ў мястэчка шукаць святара. Праседзелі мы там бадай што гадзіны дзве, а то і з гакам. Відаць, папу на хрэсьбінах было добра і ён пакідаць застолле не спяшаўся, хоць ведаў, што хрысціць дзяцей не прыязджаюць з пустымі рукамі. Нарэшце, дзядзька прывёў яго, менавіта прывёў, бо падмога была патрэбна, гэта нават мы, старэйшыя дзеці, заўважылі. Тым не менш хрышчэнне адбылося. У царкве, на загад папа, мы сталі ўсе цесненька ў шэраг, мама называла па чарзе імёны, і поп, перайначваючы на свой лад тыя, якія ён у «святцах» не сустракаў, апырскваў кожнага з нас свянцонай вадою. Алесіка апырскаў на руках у мамы.

Будучы ўжо дарослым, я пачуў аднойчы дасціпную прымаўку, сказаную ў адрас чалавека пэўнай, зусім не лепшай натуры: «Яго, відаць, п'яны поп хрысціў». Пачуў — і сам сабе моўчкі ўсміхнуўся: у дачыненні да мяне — дык гэта цалкам адпавядае рэчаіснасці.

## У бабскую змену

Незадоўга да вайны, можа, усяго за год, у нашай Слабадзе збудавалі лазню — для усіх жыхароў вёскі, калгасную. Тыпавую, на тры аддзяленні (дзе раздзяваюцца, дзе мыюцца і дзе парацца), з дабротнай падлогай у раздзявальні і гладкім цэментаваным долам у мыйніцы і парыльні. Пару здабывалі як і ў дапатопных прыватных лазеньках-восецях — чабэхалі ваду на гарачыя, да чырвана распаленыя камяні. Адкрыццё калгаснай, то-бок грамадскай лазні было фактам актыўнага наступу сацыялістычнай культуры (кажу без іроніі) на заскарузлы і заімшэлы побыт старое вёскі. Новую лазню вяскоўцы вельмі ўпадабалі і нямала ганарыліся, бо яна была на ўсё навакольле адна-адзіная. Зазначу, між іншым, што і падчас нямецкай акупацыі, прынамсі першыя два гады, па дамоўленасці між сабой жыхароў вёскі, лазня працягвала спраўна функцыянаваць (пардон за надта паэтычнае слоўца!) і такім чынам па-ранейшаму стаяць на варце здароўя.

Натуральна, як толькі пакаціўся на захад, у бок Нямеччыны, фронт, і трэба было брацца за наладкаванне мірнага жыцця, слабодцы (цяпер, пададукаваўшыся і падкультурыўшыся, пішуць «слабадчане») успомнілі і пра лазню. Ды і як было не ўспомніць — пасля доўгіх месяцаў бадзяння па лясах і балотах, жыцця ў зямлянках і буданах, у запанібрацтве з блохамі, вошамі і каростай (цьфу, брыдота!). Мужчын у Слабадзе было тады — ну колькі? — шэсць ці сем старых дзядоў, хворы Анцік, хворы Кароль да старшыня калгаса Банук. І ўсё! Усе астатнія пайшлі вызваляць Еўропу ад фашызму. Было яшчэ некалькі хлопцаў-прызыўнікоў, сямнаццацігадовых, — яны пойдуць на службу ў верасні; і былі «пашавэлкі», мальцы-падлеткі. Пашавэлкі, але ж мужчыны, і на работу ўжо ішлі на мужчынскую, тым лікам і ў лазню — напаліць камення і нагрэць вялізную кадзь вады. І вось — упершыню пасля нявolі слабодская калгасная лазня гатова прыняць закарэлых, занудзелых, запаршывелых людзей. Як і заўсёды раней, гатоўнасць гэтая аб'яўлялася на час падвячоркавы, на позняе пасляабеддзе. І па ўсталяванай завя дзёнцы, у першую змену мыліся мужчыны, у другую — жанчыны. Усё добра, але — як быць са мною? Я — пастушок у сям'і, я павінен па абедзе і аж да захаду сонца быць у полі, пасвіць Недзяленю. І мама рашыла так:

— Прыйдзеш, як памыюцца апошнія бабы… Я цябе пачакаю ў раздзявальні. Вады гарачай яшчэ будзе, яна заўсёды астаецца. І я табе памагу — адшару спіну, а галоўнае — вымыю галаву, бо яна ўжо ўся брудам зарасла.

Не надта мне гэта спадабалася: мыцца ў канцы «бабскай змены», але — нічога не зробіш, давядзецца падпарадкавацца абставінам; вайна прывучала нас да гэтага амаль кожны дзень.

Ужо апусцілася за цёмнае кустоўе на далёкіх пагорках сонца, калі я, завёўшы на падворак Недзяленю, пабег у лазню. У раздзявальні, як і дамовіліся, мяне чакала мама — распараная, з мокрымі распушчанымі валасамі, у зрэбнай споднай сарочцы, — такая памаладзелая, прыгожая… Больш у прылазніку ўжо нікога не было…

— Во малайчына, — пахваліла мяне мама, — хадзі за мной, там распранешся, на лаўцы. Вады гарачай і ў вядро і ў таз я набрала, дык мы хуценька…

Так, ласкава і любасна, прыгаворваючы, мама пайшла парадзе мяне ў мыйніцу. Быў я ўжо не малое хлапчанё, але разумеў, што для маці — я дзіця і што саромецца яе мне не трэба. Я хуценька сцягнуў праз галаву кашулю, скінуў порткі разам са споднікамі, паклаў усё на лаўку, падышоў да таза, напоўненага да краёў вадою, і прысеў на «кукішкі». Таз стаяў пасярод мыйніцы, насупраць вакна; тут яшчэ было досыць відна, бо па кутах ужо згусціліся сутонне, — як казала калісьці нам, малым, бабуля — там ужо «хаваюцца дзяды». Не паспеў я акунуць у ваду далоні, як… пачуў жаночыя галасы! У шчыльна зачыненай парыльні гучна перамаўляліся жанчыны!

— Мама! Там жа гавораць! Там нехта ёсць!..

Я так спалохаўся, што хацеў кінуцца да адзення і нацягнуць на сябе порткі.

— А гэта там яшчэ Стэпка з Міхалінай, пазней за ўсіх прыйшлі, дык і забавіліся, — спакойна патлумачыла мама, — так спакойна, як быццам там не Стэпка з Міхалінай, а Сцяпан з Міхалкам. — Пакуль яны там адхвошчацца, дык ты і будзеш гатоў. Давай, нагінай галаву над тазам, і пачнём…

Але не паспеў я нахіліцца і зачэрпнуць прыгаршчамі вады, як скрыпнулі дзверы і з парыльні выскачыла, з бляшаным тазікам у руцэ… голая Стэпка — маладая, дваццаціпяцігадовая маці траіх байстручкоў (першага нарадзіла ў сямнаццаць).

— Вой, адхвасталася! — выгукнула, шумна выдыхнуўшы з сябе паветра, Стэпка.

І тут убачыла чорт ведае што: мужчына на яе глядзіць зусім зблізку! Яна стаяла да дзвярэй спіною, а тварам — на сярэдзіну мыйніцы, на святло з вакна. Імгненна мяне абдало хваляй сораму, і я пачаў плёхаць на валасы вадою. Апошняе, што заўважыў, гэта — як яна машынальна засланіла тазікам ніжнюю палову жывата.

— Вой, Кацярынка, гэта ж ты хлапца прывяла сюды! Здурнела, далібог! Ён жа ўжо вялікі!

— А бо-о-о, Стэпачка! — намыльваючы мне галаву, заапраўдвалася ў адказ мама. — Трэба яму на цябе глядзець! Рабі сваё і толькі…

Зноў скрыпнулі дзверы, і, не падымаючы галаву, я зразумеў, што Стэпка вярнулася назад, у парыльню. Ну так, адтуль зноў пачуліся галасы. Нягучныя, прыглушаныя.

Мы завяршылі справу амаль моўчкі. Мама добра, не шкадуючы мыла, вымыла мне галаву, старанна адшаравала мачалкай плечы, спіну, грудзі…

— Ногі харашэнька вымый сам, — сказала. — Усюды, і пад каленямі, і вышэй…

Да канфузу, які толькі што адбыўся, яна не вярнулася ні словам; напэўна, палічыла, што нявялікае саромнае здарэнне гэтым і вычарпана. Хоць, думаю, адчула — па маім маўчанні — што з'яўленне «несвятой Стэфаніды» зрабіла на мяне вельмі моцнае ўражанне. І напэўна ўпершыню зразумела, што яе сын-пастушок ужо сапраўды, як сказала Стэпка, вялікі.

## І цяпер чую той глухі трэск…

У першыя ж месяцы па вызваленні ў нас на Лагойшчыне запанавала спакойнае мірнае жыццё. Кажу: у нас, бо ў раёнах былой Заходняй Беларусі яно яшчэ мірным не было — там яшчэ хаваліся па лясах узброеныя людзі, якія рабілі напады на дзяржаўных службоўцаў, на міліцыянтаў, на прыезджых з усходу настаўнікаў, і гучалі стрэлы, і лілася кроў, і сірацелі дзеці. У нашым баку нічога такога, дзякаваць Богу, чуваць не было. І па нашых лясах мы ўжо хадзілі спакойна, калі і баяліся — дык толькі адзічэлых нямецкіх аўчарак, якія засталіся тут без гаспадароў і, былі выпадкі, хапалі і загрызалі малых дзяцей.

Калі пайшлі першыя ў нашым Баранаўскім лесе грыбы — ніякія чуткі мяне стрымаць не маглі. І я, ці адзін, ці на пару з якім дружбаком, накіроўваўся, як модна цяпер казаць, на «ціхае паляванне». Аднойчы, ужо дзесьці ў верасні, збіраючы апенькі, я знайшоў пад высознай ялінаю цёмна-шэрую, з тонкага сукна, коўдру. Нямала ўзрадаваўшыся, прынёс знаходку дадому і ўручыў маме. Мама паглядзела, абмацала харашэнька знаходку і радасць маю адчувальна астудзіла: коўдра, бачна, доўга ляжала там, дзе я знайшоў яе, — значыць, і пад дажджом, і, намоклая, на сырой зямлі, і не сушылася на сонцы. А гэта ў сваю чаргу значыла, што дабрэннае тонкае сукно здорава падспарахнела, страціла былую моц і трываласць. На шчасце, не настолькі, каб зусім разлазіцца-распаўзацца, як усякая гніліна. А яшчэ мама зрабіла адну выснову, якую з пэўнасцю пацвердзіў і дзядзька Ліксандар: коўдра гэта нямецкая, яе пакінулі тыя ваякі, што трапілі ў «Мінскі кацёл» і выходзілі з акружэння, прасочваліся групкамі на захад. Хтосьці з іх і расстаўся ў нашым лесе з казённым дабром.

Пэўны час коўдра служыла па назначэнні, а пасля, здаецца, гэта было ўжо зімой, мама, у пошуках выйсця, чым бы прыадзець хоць аднаго са сваіх «абарванцаў», пашыла з яе мне порткі. Дабрэнныя, я нават сказаў бы — шыкоўныя, і на выраст, порткі. У іх я і пачаў «шчыгіляць» — і дома, і на людзях, пакольі іншых, на змену, не было. Так «дашчыгіляў» і да жніўня наступнага, сорак пятага года. А ў тым памятным жніўні… Пра гэта і пойдзе аповед.

У жніўні па ўсёй Беларусі малацілі збажыну, натуральна, і ў нашым калгасе «Іскра» (назва засталася даваенная). А хто малаціць, каму было малаціць? І якою агратэхнікай карысталіся? Мужчын у вёсцы — менш чым пальцаў на адной руцэ. Жалі жытцо бабы-жнейкі сярпамі, як і дзвесце гадоў назад. Баб было шмат, за вайну не ўбавілася. А мужчын… У мужчыны пайшлі шаснаццаці- і чатырнаццацігадовыя падлеткі — іншага выйсця не было. Мы, падлеткі, і звезлі на калгаснае гумно ўсё тое, што нажалі жнеі. Мы і памагалі ўсё тое абмалаціць. А трэба ж было вельмі-вельмі спяшацца! Па вёсках ездзілі «ўпаўнаважаныя» і падганялі хутчэй выканаць

— як тады пісалася ў газетах і на плакатах — «першую запаведзь»: своечасова (а лепш і трохі раней) «разлічыцца з дзяржавай», здаць хлеб у дзяржаўныя засекі.

Дык вось, малацілі мы ў тым жніўні, як і да вайны было, малатарняй на конным прыводзе. Сённяшнім «працаўнікам аграрнага сектару» і ўявіць цяжка, што гэта такое — конны прывод. А гэта зусім не складаны механізм з прыстасаваннем для перадачы конскай сілы ў малатарню, каб прывесці ў рух барабан, які вымалачвае з каласоў зерне. Два кані, ходзячы адзін за адным па крузе, круцілі кола, ад якога, пры дапамозе адмысловага «кулака», да малатарні ішоў, круцячыся, доўгі і нятоўсты металёвы вал. Коней трэба было, вядома ж, паганяць — і менавіта гэты абавязак клаўся на падлеткаў. На галоўную справу каля малатарні ставілася двое дарослых: жанчына кладзе сноп на «стол» і разразае перавясла, а мужчына падае той сноп у малатарню, добра яго растрыбушыўшы і распластаўшы, бо яна можа папярхнуцца і не праглынуць.

У той жнівеньскі адпаўднёвік адным з паганятых на крузе быў я. Работка, калі па шчырасці, досыць сумная, нецікавая. Хаджу і хаджу па крузе, нібы і сам упрэжаны, і адно зрэдку варухну лейчынай, калі падасца, што конь «дае сабе паслабку». Ну і пры гэтым нешта скажу Гнядому, прыкрыкну. Гудзе малатарня, жанчыны, падносячы да «стала» снапы, нешта гукаюць і смяюцца, відаць, жартуюць. А ты — хадзі і думай сваё, ці мала што, калі табе чатырнаццаць, лезе ў галаву. Хаджу і думаю. Хаджу і думаю… І раптам… нейкая страшная сіла пацягнула з мяне левую штаніну, а паколькі яна не сцягваецца, бо порткі падперазаны вельмі моцна, — пацягнула і нагу, пацягнула пад металёвы вал, які круціцца. Усё вырашылася за нейкія долі секунды. Я з жахам адчуў, як маю ступню падбірае пад сябе жалеза, і страшна закрычаў, і колькі сілы — упёрся нагамі ў дол і ўсім целам тузануўся назад… І пачуў кароткі глухі трэск, і адчуў, што нагу з-пад рухомага жалеза выхапіў. З болем — але выхапіў. Зірнуў долу — на тоўсты металёвы «кулак» наматваецца мая штаніна. Гэта яна і трэснула, секунду назад, вышэй калена. Па тэхніцы бяспекі «кулак» павінны былі накрыць бляшаным ці драўляным каўпаком, але гэтага не зрабілі. Пачуўшы мой крык, напарнік спыніў свайго каня; спыніўся і мой; спыніўся прывод; перастала гуркатаць малатарня. Жанкі, а ўслед і мужчыны, кінуліся да мяне. Убачылі мяне з адной штанінай — і ўсё зразумелі, і жахнуліся.

— А дзіцятка маё! А ці хоць цэлая нага, пакажы! Там сочыцца кроў, па-над пальцамі…

Я маўчаў, збялелы, мова яшчэ да мяне не вярнулася. Адна з жанок нахілілася і пачала ціскаць і паварочваць у бакі маю ступню.

— Моцна баліць?

— Не, не моцна, толькі тут зверху, дзе кроў… Але не моцна.

— Дзе кроў — гэта счасала жалезам скуру, гэта не страшна. Галоўнае — каб пералому не было… Наступі моцна гэтай нагою на зямлю. Не баліць?

— Не, не баліць…

— Ну, то тваё шчасце, дзіцятка. Ідзі дадому — хай пабачыць і парадуецца маці, які ты шчаслівец у Бога.

Дадому я пайшоў загуменнем. Ну не ісці ж з голай аж да сцягна нагою па вуліцы.

Мама, здаецца, усё зразумела раней, чым я ёй расказаў. Таксама пацікала, пакруціла ў пальцах маю абчасаную да крыві ступню і праслязілася. І сказала дакладна, як тая жанчына:

— Шчаслівец ты ў Бога, сынок. Калі б тая коўдра была не падапрэлая, не падгнілая — трэснула б нага, а не штаніна.

Іншы раз прыгадаецца той далёкі жнівень — і, здаецца, я зноў чую кароткі глухі трэск суконнай палатніны.

## «А што гэта ты па-дзеравенску гаворыш?»

Як у першыя пасляваенныя гады горад, з дазволу дзяржавы, вычышчаў з беларускай вёскі моладзь — страшна ўспомніць!

Божа, што рабілася!

Навыперадкі, адзін перад адным, беглі, уцякалі з вёскі хлопцы і дзяўчаты, тым лікам і яшчэ зусім зялёныя падлеткі. Уцякалі ад галоду і галечы, ад убоства і забітасці, ад беспрасветнай нэндзы. Колькі было, у тым жа сорак шостым, што ад хранічнага недаяду пухлі і паміралі дзеці, або станавіліся рахітыкамі. Доўгімі зімовымі вечарамі школьнікі, слепячы вочы, рабілі ўрокі пры газовачках — іх яшчэ называлі «смаркачыкамі». Да электрыкі было яшчэ далёадалёка. Нават да радыёвяшчання — самага элементарнага, правадковага — яшчэ не дайшлі, слухалі — калі дзе быў адзін на ўвесь сельсавет — прыймач на батарэях…

За пяць гадоў (1946 — 1951) у маёй Слабадзе амаль не засталося маладых людзей — нежанатых хлопцаў і незамужніх дзяўчат. З'ехалі ў горад, пераважна ў Мінск. Не на вучобу, не. З'язджалі, каб уладкавацца ў горадзе на любую работу, пераважна на будоўлю і ў домработніцы, у нянькі. У тыя гады я часта з імі, сваімі землякамі-равеснікамі, сустракаўся — або ў Мінску, або, часцей, па дарозе дадому ці з дому. На выхадныя і на святы яны ехалі да бацькоў, у родны куток, са зразумелым настроем, які падаграваўся не толькі прадчуваннем радасці ад сустрэчы з блізкімі-роднымі, але і амбіцыйным разлікам засведчыць у вёсцы, што я — выйшаў (ці выйшла) у людзі, я — гараджанін (ці гараджанка), я жыву ў сталіцы, дзе і кіно, і тэатр, і трамвай бегае па вуліцах. Праўда, у тэатры яшчэ ні разу пабыць не давялося, і ў кіно схадзіць амаль зусім не выпадае, але… хто пра гэта ведае? Усе ведаюць, — і гэта галоўнае, — што ў Мінску ёсць і кіно, і тэатр, і марожанае прадаецца на вуліцах… Гэта вам — не наша дохлая вёска з непралазнай граззю. Ну, а што я там раблю і дзе жыву, дзе начую, — дык зноў жа: а каму якая да гэтага справа?

Аўтобуса «Мінск — Лагойск» тады яшчэ не было, і дабіраліся мы да райцэнтра ў кузавах грузавікоў, а далей — да Гайны, да Слабады, да Айнаравіч — пяшком. Усіх сваіх спадарожнікаў я добра ведаю яшчэ ад ранніх дзіцячых ці ад школьных гадоў, таму, натуральна, тэпаючы ад Лагойска дадому, мы пачыналі гаманіць, абменьвацца навінамі, аповедамі пра жыццё-быццё маладое. І ўпершыню я тады заўважыў: усе яны стараюцца, бедалагі, гаварыць па-руску, па-гарадскому, хоць слухаць гэта было няўсцерп цяжка. Адукацыі ў іх было тры, пяць, у лепшым выпадку — сем класаў. На будоўлі і на іншых чарнавых, падсобных работах у Мінску «моўнай культуры» яны набіраліся хутка. Стараліся ж! Бо як жа? Гараджане — і, гэта самае, гаварыць не ўмеюць як трэба. Я да іх звяртаўся або адказваў ім толькі па-беларуску і адчуў, што іх гэта трохі здзіўляе і нават раздражняе, — ім не зразумела: навошта я так? Аднойчы з намі, маладымі, ішла і ўжо сталых гадоў жанчына, ішла доўгі час моўчкі, чуючы, канечне ж, усю нашу гаворку. І нарэшце, павярнуўшыся да мяне, спытала:

— Чаму гэта ты, хлапец, па-дзеравенску гаворыш? Усе па-гарадскому, а ты — па-дзеравенску…

— Не ўмею іначай, — адказаў я жанчыне — так, як, здаралася, адказваў на падобнае пытанне і раней.

— А ты жывеш у Мінску?

— У Мінску.

— А даўно?

— Ужо скора два гады будзе.

— І дасюль не навучыўся гаварыць па-гарадскому?

— Ну вось такі недарэка, не навучыўся, як бачыце.

Жанчына з хвіліну памаўчала.

— Не, ты тут, хлапец, нешта хітрыш. А дзе ты што ў Мінску робіш?

— Я вучуся…

— Вучышся? А на каго?

— На настаўніка…

Жанчына нейк трошкі сцепанулася і пільна ўставілася мне ў твар.

— А-а-а, дык ты на настаўніка, — не тоячы расчаравання, прагаварыла, расцягваючы словы, спадарожніца.

Паставіць на гэтым у нашай перамоўцы кропку ёй як бы нешта перашкодзіла, як бы захацелася падкрэсліць сваю кемнасць і тым самым хоць трохі ўзвысіцца. І яна, з пачуццём самапавагі, падвяла рысу:

— Ну, дык жа я і сказала, што ты тут, хлапец, нешта хітрыш!

Дапытвацца, дзе я схітраваў, сэнсу я ўжо не бачыў. Зрэшты, можа, гэта сапраўды мая вялікая хітрасць — гаварыць на мове зямлі, на якой нарадзіўся?..

## «Эстэт»

Інтэрнат педвучылішча, я ўжо пра гэта гаварыў, знаходзіўся ў тым жа корпусе, дзе і вучэбныя класы. Вядома ж, не на адным і тым паверсе: класы — на другім, інтэрнацкія пакоі — на першым (для хлопцаў) і на трэцім (для дзяўчат). На першым жа была і кіназала, дзе мы глядзелі, здаецца, раз у тыдзень, кіно (за грошы, вядома) і якая, пры неабходнасці, служыла клубам, дзе праходзілі агульныя сходы навучэнцаў, сустрэчы з запрошанымі гасцямі (пісьменнікамі, напрыклад), канцэрты нашай самадзейнасці, а пасля такіх культмерапрыемстваў часам даваўся нам дазвол і на «танцулькі».

У верасні 1950-га, на пачатку новага навучальнага года, ад дырэктара выйшла распараджэнне: у абавязковым парадку навучэнцы кожную раніцу павінны займацца фіззарадкай — каб не прыходзілі вялыя і сонныя на першы ўрок. Ну і наогул для ўмацавання здароўя і падтрымання жыццёвага тонусу. Што да хлопцаў — тут праблемы не ўзнікала, мы і самі, без загаду зверху, стараліся і паразмінацца-паразгінацца, і абдаць твар — грудзі — рукі халоднай вадой у мыцельніку. А вось дзяўчатам, асабліва з малодшых курсаў, уласнай сілы волі на гэта не хапала. «Ім, — сказала начальства, — трэба памагчы, трэба праводзіць з імі фіззарадку арганізавана». Хто будзе праводзіць? Ну не выкладчыкі ж і не запрошаны фізкультінструктары! Мы, хлопцы-старшакласнікі, павінны заняцца гэтай справай. Лічыць гэта сваім абавязкам, так бы мовіць, камсамольскім даручэннем.

У ліку тых, каму прапанавалі ўзяць на сябе гэты гонар, аказаўся і я. Шчыра кажучы, у мяне не было жадання траціць штораніцы час на такую «халтурку», — зусім не было! І я змог бы адбіцца ад прапановы, калі б… калі б не адно АЛЕ… Але ў тым і штука, што было адно АЛЕ. Была адна першакурснічка, якую я паспеў што называецца запрыкмеціць у грамадцы яе сябровак на вечарынцы. Дый як было не запрыкмеціць! Высочанькая, танклявенькая, з прадаўгаватым, крыху смуглым тварыкам, невялікім кірпатым носікам і — гэта галоўнае — вельмі прыгожымі вачыма: цёмнымі, глыбокімі і (менавіта тады я зразумеў, як гэта называецца) — з паволокай.

Вядома ж, я выбраў сабе для прыкладання фізкультурніцкіх здольнасцяў пакой, у якім жыла гэта прыгажуня. У пакоі — дванаццаць дзяўчатак. Яшчэ з вечара я заглянуў да іх і сказаў — строгім, ну зусім начальніцкім тонам:

— Заўтра а восьмай я прыйду праводзіць з вамі фіззарадку.

— А мы ўжо ведаем, нам камендант сказаў, — хорам адказалі дзяўчаткі.

— Вось і добра. Як толькі празвініць званок — вы ўсе павінны стаяць на калідоры насупраць свайго пакоя. І каб без ніякіх спазненняў.

Я гаварыў гэта ўсім, а глядзеў амаль увесь час на адну. О, так, сапраўдная прыгажуня! Як добра, што дырэктар прыдумаў гэту фіззарадку! Выдатна: я ж кожную раніцу буду бачыць яе, неўпрыкмет любавацца, буду мець зусім натуральную (без падазрэння!) магчымасць загаварыць з ёю, напрыклад, зрабіць крытычную заўвагу, што практыкаванне яна выконвае не зусім правільна… Божа, як я чакаў гэтай першай раніцы! І хваляваўся, прачнуўшыся, як, не раўнуючы, перад экзаменам.

Ніякай адмысловай апраткі для фізкультуры ў нас тады не было — за выняткам трох-чатырох чалавек гарадскіх усе навучэнцы былі з вёскі. У чым хадзілі на ўсе іншыя ўрокі — у тым і на заняткі па фізкультуры. Так што і я заявіўся да сваіх «падапечных» у штодзённым — і рабочым і святочным — адзенні, нават пінжачка не пакінуў у пакоі, як іншыя хлопцы-«інструктары», — наўмысна, каб яна бачыла мяне ў поўнай форме. Бо можа ж я хацеў, каб і яна звярнула на мяне ўвагу, ну, і ацаніла, і таксама зацікавілася. Бо справа гэта, як вядома, такая: калі толькі з аднаго боку — дык гэта не надта добра, трэба, каб адразу пачалося з двух бакоў…

Роўна а восьмай, па званку (званок даваў на ўвесь корпус дзяжурны — кадр каменданта) я ўжо стаяў насупраць «яе» пакоя. Пачалі высыпаць на калідор, адна за адной, першакурснічкі. Выстройваюцца ў шэраг, перамаўляюцца, жартуюць.

— Ну, што — усе? — пытаю, хоць бачу, што не ўсе: няма яе, яе няма!

— Там адна Тася засталася, яна зараз выйдзе…

«Вось я ўжо і ведаю, як звацъ», — мільганула ў маёй заклапочанай галаве.

— Яна ў нас такая санлюўка — не дабудзіцца! — падкінула беленькая худзенькая дзяўчынка з сярэдзіны шэрагу.

— Ну, пачакаем! — рэагую на гэта адчувальна незадаволеным тонам. — Пачнем, як будуць усе.

Праз паўхвіліны выйшла яна. Не спяшаючыся выйшла. І зусім-зусім разаспаная.

— Ой, і прыдумаў жа нехта гэтую зарадку! — сказала замест «добры дзень» ці «здраствуйце».

— Ідзі во сюды, стань між намі, — паклікала беленькая.

І яна стала якраз у самай сярэдзіне шэрагу. «Гэта добра, — заначыў я сабе ў тое ж імгненне, — будзе стаяць перада мной, а не дзесь скраю, куды зіркаць мне было б не зусім ёмка. Інструктар павінен стаяць тут, дзе стаю — пасярэдзіне…»

— Выраўняліся! — даю першую каманду. — Выраўняліся! Так, добра, цяпер хадзьба на месцы: з левай нагі — на месцы, шагам марш!

І ўсе затупалі. І яна таксама. Хоць, праўда, секунду прамарудзіла і пачала не ў нагу з усімі. Ну, такой бяды. Для першага разу гэта даруецца.

— Цяпер рукі па камандзе «раз — два» падымаем угору, глыбока ўдыхаем паветра і па камандзе «тры — чатыры» апускаем і выдыхаем…

Не паспеў даць каманду, як яна — мая царэўна-прыгажуня… Што такое? А божа, як яна моцна пазяхнула, на ўсю сілу, на ўсю вышыню поласці, як пры гэтым, я сказаў бы, непрыгожа скрывіўся твар, заплюшчыліся вочы, зморшчыўся нос і агаліліся верхнія зубы… Хоць бы даланёй прыкрыла, дык жа не! Як быццам перад ёй, за два крокі, не стаіць сам інструктар! Схамянуўся, што трэба ж гнаць зарадку далей, і каманду:

— Робячы глыбокі ўдых, рукі падымаем угору: «раз — два»…

І запнуўся. Што такое? Што гэта такое? Удыхаючы паветра і ўздымаючы рукі, яна зноў так моцна, так шырока-высока, так непрыгожа пазяхнула, што ўвесь яе чароўна мілы твар нейк пачварна перакасіўся, уся казачна-анёльская прыгажосць няйначай як падалася раптам углыб цёмнай поласці роту… Божа мой! Яна не чуе маю каманду: «тры — чатыры, рукі апускаем і пры гэтым выдыхаем!» Якое выдыханне, калі пад гэту каманду яна зноў зайшлася страшным пазяханнем! Яшчэ страшнейшым, чым у першы і другі раз, яшчэ больш брыдкім. Працягваю, амаль машынальна, дакаць каманду, ужо не зусім упэўнена і зладжана, а ў душы пачынае ўсё мацней прагаворваць і пацвельваць чорцік расчаравання: «Ну? І гэта — царэўна-прыгажуня? Гэтая пазяхайла? Што ты ўбачыў у ёй? Знайшоў царэўну!..»

Царэўна знікла. Знікла раптоўна і жаданне праводзіць у першакурсніц фіззарадку. Вечарам пачуў, як адзін з хлопцаў выказаў шкадаванне, што яму не дасталася грамадская нагрузка фізкультінструктара на трэцім, дзявочым, паверсе. І я ўзрадаваўся магчымасці так лёгка вызваліцца ад даручанага мне абавязку. Зноў ісці туды і зноў бачыць, як царэўна-прыгажуня пачне перад табою, у цябе на вачах, гэта самае… — не! Не і не!

Тады я яшчэ не ведаў, што пазяхаюць усе, колькі іх ёсць, царэўны на свеце.

ВЕРШЫ

# БЕЛАРУСЬ — МОЙ СВЯТЫ КАЎЧЭГ!

Эдуард АКУЛІН

## Ной

*Збігневу Гордзею*

*Сорак раз пасылаў сякеру*
*у сваты да сырых камлёў*
*і каўчэг будаваў свой з веры,*
*што ўратуе жыццё Любоў.*

*Давяраўся, як брату, зверу,*
*з птушкай раіўся, як з сястрой,*
*і каўчэг будаваў свой з веры*
*у Гасподняе слова Ной.*

*Моўчкі зносіў людскія кпіны:*
*— Дзе ты плаваць сабраўся, Ной?*
*І ў качэг запрашаў расліны,*
*як паломнікаў, на пастой.*

*Перамогшы ў вайне з Патопам,*
*здзейсніў Госпадаў запавет…*
*І — ужо не з нуля, а з Ноя*
*нарадзіўся нанова свет!*

## О, Вільня!

*«О, Літва…», нібы малітву, —*
*шапчу сабе ўсю дарогу…*
*Сягоння — спатканне з Вільняй,*
*а значыць — спатканне з Богам…*

*Праходжу пад Вострай Брамай*
*і чую, як цяжка б'ецца*
*у лёхах старога храма*
*тваё залатое сэрца.*

*Каб вызваліць нас ад здрады,*
*Максім тут прысніў Пагоню.*
*Сто год як лятуць атрады*
*насустрач Крывіцкай волі…*

*Тут кожны камень — быліна.*
*Тут кожны уздых — аб страце…*
*Тут сэрца сваё пакінуў*
*грэць сын у далонях маці…*

*А я тут душу пакінуў*
*у звонкай цішы вакзала…*
*«О, Вільня — мая магіла…» —*
*сказаць не паспеў Купала.*

## Вяртанне

*Л. Дранько-Майсюку і Ул. Някляеву*

*Па дарозе з Вільні на Менск,*
*наліваючы ў чаркі крупнік,*
*я ўявіў, як у вусны рэк,*
*нібы ў сурмы паэты трубяць.*

*Па дарозе з Вільні на Менск,*
*па шляху з варагаў у грэкі*
*адбіваўся жмудзінскі лес ,*
*нібы лёс у крывіцкіх рэках.*

*Па дарозе з Вільні дамоў*
*нас было такіх толькі трое,*
*тых, хто мёдам разбавіў кроў,*
*і здалася без бою Троя…*

*Па шляху, што аслеп ад слёз,*
*нас было такіх крыху болей,*
*хто журбу кантрабандай вёз*
*па аднятай у нас Пагоні.*

*Па дарозе з Вільні на Менск*
*мы апокрыф жыцця тварылі,*
*што святое паблізу спрэс,*
*як ад Бога любоў Марыі…*

*Па дарозе з Вільні дамоў*
*мы успомнілі Гедыміна,*
*і — у жылах шалёна кроў*
*закіпела і задыміла…*

*Не было на зямлі радней*
*за начнога таго хаўруса.*



*Мы пілі, і зялёны Змей*
*спакушаў нас у Беларусы!..*

## Бог і блог

*Калісь размаўлялі з Богам —*
*шукалі ў сабе душу,*
*а сёння гаворым з блогам,*
*вяршым інтэрнэт-імшу.*

*Ну што тут, маўляў, такога,*
*калі віртуальны Бог*
*у імя ўсяго святога*
*царкву памяняў на блог.*

*Цяпер у кватэры кожнай*
*кампутар заміж бажніц,*
*дзе Богу маліцца можна*
*ці блогу — да зараніц…*

*Не молімся — нішчым Слова,*
*паклаўшы далонь на мыш…*
*Хоць шэпча душа: «Game over»,*
*ды Бог не ідзе на крыж...*

## Няблізка

*Сярод нябёсаў*
*на пару з Богам,*
*як два п'янтосы,*
*мы п'ем трывогу.*

*Бо з Таганрога*
*да тога Мінска*
*і ў пары з Богам*
*ляцець няблізка.*

## Іранічнае

*Убіўшыся ў куст акацый,*
*адчуў сябе крыху Богам*
*і ў думках пачаў збірацца —*
*падперці крыжом Галгофу…*

*Ды ўспомніў, што куст акацый, —*
*далёка не Лёс цярновы.*
*Як мудра сказаў Гарацый:*
*«Паэзія — гандаль словам…»*

## Экспромт

*Вясна.*
*А ў полі сасна.*
*Сакавік на дварэ.*
*Ніхто не гарэ…*

*А ў полі сасна —*
*зеляней, чым вясна.*

*А калі вясну памяняць на сасну?*

*Сасна.*
*А ў полі вясна.*
*Сакавік на дварэ.*
*Ніхто не гарэ…*
*А ў полі вясна —*
*зеляней, чым сасна.*
*Дык ніхто ж не гарэ!*
*Азіміна прэ!*

## Дома

***Трэба дома бываць часцей…***
***Рыгор Барадулін***

*На самоце ў бацькоўскай хаце*
*усю ноч не магу заснуць,*
*то успомню, як ткала маці,*
*то бабуляў, што жыта жнуць…*

*То ў пацёмках масніца рыпне —*
*гэта бацька прыйшоў дамоў…*
*Між нямкоўцаў такі адзін быў,*
*браў гармонік — спявала кроў!*

*Бо казалі ж, што хлопец Грыцаў*
*на «інструманце» граць мастак...*
*У вайну той «інструмант» фрыцы*
*падарылі за проста так.*

*Бацька-бацька, чаму ж ты здрадзіў*
*усяму, што ад Бога меў,*
*і гармонік, і сына й маці*
*ашчаслівіць не захацеў…*

*У калысцы дзяцінства — хаце —*
*ой, як трэба бываць часцей…*
*Тут нябожчыкі бацька й маці*
*скрозь чакаюць душу з гасцей…*

## Было…

***Калісь глядзеў на сонца я…***
***Максім Багадановіч***

*Ты ўся сатканая з лілей,*
*ты ўся сатканая з туману.*
*Віно з вадой змяшаў Арфей,*
*а я віну змяшаў з падманам…*

*А я насмеліўся сказаць*
*і паўтараць, як псальм, бясконца:*
*— Гасподзь жанчын такіх ствараць*
*павінны быў з праменняў сонца…*

*Бо ты і ёсць само святло,*
*што асляпляе і чаруе…*
*Хай нехта скажа мне: — Было…*
*Было. Аслеп. Гасподзь даруе.*

## Грэх

*Ніколі душа не стоміцца*
*вяртацца ў Эдэмскі сад.*
*Да гэткіх жанчын становяцца*
*паэты па рыфму ў рад...*

*Пад пільным паглядам Пушкіна,*
*адвёўшы дуэльны гнеў,*
*Вы словы цымбальна гушкалі —*
*пяшчотай Эдэм звінеў.*

*А грудзі — спакусы птушкі,*
*забыўшы пра ятаган,*
*такія калісь прыручваў*
*да стэпу татарскі хан...*

*Хоць з вуснамі вусны позняцца*
*спаткацца у снах наспех…*
*А ўжо паўтарыцца просіцца*
*нанова біблейскі грэх.*

## Бесядзь і Сож

***Ахвярую Алесю Усеню***

*Закахаўся у Бесядзь Сож,*
*а прызнацца не мае сілы...*
*І праліўся біблейскі дождж*
*ад Грамыкаў і да Сваяціліч...*

*І вясёлка ўзышла, як німб,*
*над евангельскім тым каханнем.*
*Сож каралямі срэбных рыб*
*Бесядзь вабіў, пяшчоціў хваляй…*

*Не праслаўшы сватоў-плытоў,*
*цалаваў яе ў вусце так,*
*ні прагнуў з сырых камлёў*
*распаліць у душы пажар.*

*І спатоліўся, бо здалеў*
*выпіць шчасце яе да дна…*
*І ад часу таго, як спеў,*
*Бесядзь льецца ў прасцяг адна.*

## Дар

*Плуг — аратаму, каб араў…*
*А паэту Гаспод даў крылы,*
*каб над пожняй жыцця лятаў —*
*не баяўся дрыгвы-магілы.*

*Нож — Вараву, каб рабаваў…*
*А паэту — пяро жар-птушкі,*
*каб, як Лорка, ім напісаў:*
*— Мама, вышый мяне на падушцы…*

*Грошы — дурню, каб бедным стаў…*
*А паэту Гаспод даў Слова,*
*каб Галгофу жыцця спазнаў,*
*а сканаўшы, пачаў нанова.*

## Месяц

*Апускаю руку ў Бесядзь,*
*каб дастаць для цябе месяц…*

## Гуслі

*Вусны твае —*
*гуслі мае…*

## На Палессе — услед за песняй…

*Леаніду Дранько-Майсюку*

*Падмывае Гарынь-рака*
*мае сны, дзе начуе Песня…*
*Асядлаю вала-быка,*
*хай звязе мяне на Палессе.*

*Толькі там Беларусь жыве.*
*Як пачую: — Було нам ліхо…*
*Каня селіцца не ў траве,*
*а ў душы — і спявае ціха*

*Пра Гарынь, што плыты вядзе*
*па чумацкім шляху-юдолі.*
*Слёзка з вочка ў душу ўпадзе,*
*сэрца жалем маё спатоліць…*

*Не раскрыліць мне болей чуб*
*мама Люба ў дзвярах ля печы.*
*І Васіль не паваліць дуб —*
*татаў човен адплыў у вечнасць…*

*Як адплыў учарашні дзень,*
*за туманам шукаць Дуная…*
*На слязіне — святой вадзе —*
*каня моліцца — рай вяртае…*

*Бо не знойдзеш такіх нідзе*
*ні людзей, ні дубоў пахілых…*
*Цёмнай ноччу і ў ясны дзень*
*Беларусь — мой святы каўчэг —*
*ад калыскі і да магілы.*

## Над магілай Анатоля Сыса

*Не трэба над магілай прамаўляць, —*
*хай свечкі й кветкі моляцца у скрусе...*
*Тут спіць Паэт — яго нам не падняць,*
*зайшло за хмары сонца Беларусі.*

***

*Мы жывем у міфічнай краіне,*
*што існуе ў нязбытным сне.*
*Беларусь жа сапраўдная гіне,*
*хоць ахрыпні ад крыку: «Жыве!».*

*Бо ніхто таго крыку не чуе.*
*Нават Бог — як Бетховен глухі…*
*Не жывем, а свой лёс жабруем,*
*як жабруюць душу грахі…*

ФРАГМЕНТЫ

# З КНІГІ «ПАКУТНЫ ВЕК»

Васіль ЯКАВЕНКА

## Яблычны спас

Ранішняя пакуль дрымотная цішыня. І вось-вось стане тое, чаго чакаюць, што наплывае паімгненна, гатовае абудзіць душу:

— Бо-о-оммм… Бо-о-оммм… Бо-о-оммм… Дзінь…

Чысты меладычны гук, мяккі і пругкі, прывольны… прадонны. Бо-о-омм!.. Разлягаецца ўдалеч. А ўслед бягуць урачыста-вясёлыя падгалоскі: дзінь-дзілінь-дзінь!.. Яны бытта ўлягаюць за тым, за галоўным звонам, бытта даганяюць яго…

Прастора ў царкве поўнілася пахам ладану, і, стоячы непадалёку ад алтара, Пятро Рамановіч слухаў хваласпеў святароў і назіраў за іх карагодам; на прастольнае свята сюды, да айца Георгія, іх збіралася цэлы тузін, калі не болей, з усіх прыходаў акругі. Пятро слухаў іх і цешыўся, як гучыць і пераліваецца шматгалосым, чыстым наплывам хор, як поўніць ён усю прастору да скляпення, і як, узмоцнены сценамі, абвяргаецца на яго і працінае наскрозь. На душы было хораша. Болей за тое, гаспадар Пятро ўзносіўся душою над усім гэтым, інакш кажучы, усё чутае, вядомае, існае прыўздымала ягоную душу, спалучала яе з жыццём продкаў і несла па рацэ часу далей і далей...

На цвінтары, калі выйшаў, яму сустрэўся сын Паўлюк, энергічны, узбуджаны святочным настроем вялікай грамады, у якой не кожны, мусіць, табе сват ці брат, але ж усе свае, і было з кім перакінуцца вострым слоўцам ці жартам.

Яны прайшлі далей ад высокіх дзвярэй, адорваючы жабракоў, якіх тут сабралася нямала. Паводле падання, пададзеныя жабраку грошы ў гэты святочны дзень пераходзілі нябожчыкам, і тыя спрыялі, каб дабро стакроць адплочвалася дабром таму, хто дае.

Спыніліся каля музыкі Піліпа, скрыпка якога цяпер на поўны голас спявала.

— Ты яго ведаеш, тата? — спытаўся Паўлюк.

— Чуў пра яго. Мы з ім нават сёння пагаманілі. Нармальны, здаецца.

— Дзіваком лічаць яго, а як іграе! Зайздросна… Памяшаўся розумам на каханні да вясковай дзяўчыны.

— Паўлюк, — Пятро дастаў з кішэні і сунуў у далонь сына жоўтую манету. — Вазьмі і занясі яму, пакладзі ў футляр…

## Мікалай-звон

Кірмаш гудзеў, ляскатаў, шапацеў чалавечымі галасамі, пераходзіў на прыглушаны гул, у які час ад часу ўпляталася фыркание і ржанне коней.

Шырокі пляц, як скінуць вокам, варушыўся і вёў гандаль. Каля фурманак з яблыкамі, ігрушамі, слівамі, як назолы мухі, круціліся падлеткі – каб сцібрыць штосьці якое вабнае, калі гаспадар зазяваецца…

Тавару ў гандлёвых радах — процьма, пачынаючы ад скарбу зямлі, вапны, здабытай у Бездзежы, гаршкоў, якімі славіліся ганчары Гараднай, ды розных бочак, бочачак,



Фота Vialejka.org

маслабоек, біклаг, кублоў для сала, змайстраваных слаўнымі бондарамі ў Рыловічах, канчаючы бочкамі мёду, што былі пастаўлены тут ажно ў шэсць радоў прадпрымальнымі гаспадарамі навакольных вёсак і хутароў. Тут і алей на ўсе густы, свежая рыба, каўбасы, смятана, сыры, булкі, цукеркі… Прадавалі коней, кароў, парасят, авечыя шкуры і хром на боты. Рымар Абко меў прадаваць раменны вупраж. У вочы кідаліся тавары, прывезеныя здалёку: пушыстыя кусцікі кавылю, пафарбаваныя ў розныя колеры, кітайскія вабныя ліхтарыкі ды вееры. Каля іх тоўпіліся маладзіцы, дзяўчаты і дзеці. Купцы спрактыкавана зазывалі пакупнікоў.

Прайшоўшы ў куток, дзе кідаліся ў вока свежым адгабляваным дрэвам кадушкі, Пятро Рамановіч з цікавасцю агледзеў новую медагонку, пэўна, з кляновай клёпкі; яму яна спадабалася, але потым падумалася, што і старая ў яго яшчэ не знасілася, таму няма сэнсу даваць ёй адстаўку.

Каля радоў з мёдам ён заўважыў прыяцеля — купца Клямку. Той бойка абмяркоўваў штосьці з патлатым таўставатым, але яшчэ не старым чалавекам, выцягнуты авал твару ў якога і бычыныя вочы, якімі ён паволі варочаў, паказвалі на спаважнасць і мудрасць думкі.

— Віват, пане пчаляр! — усклікнуў Клямка, калі заўважыў паблізу Пятра. — Знаёмцеся: гэта купец з Хэлма…

І той падаў руку:

— Мэндаль.

— Але ж вас я, шаноўны гаспадар Пятро, — доўжыў Клямка, — гэтаму купцу не аддам! Нашая дамова з вамі застаецца ў сіле.

— Ну гэтак, — кіўнуў Пісарчук. — Таму я і не выстаўляю свой мёд на кірмаш.

— Добжа, — і да таго купца: — А ці ведаеш ты, пане Мэндаль сенатара Рамана Скірмунта? Між іншым, ён у Парэччы жыве. Дзе і я… Раней ачольваў Таварыства па распрацоўцы сельска-гаспадарча-эканамічных патрэбаў Палесся.

— Я меў чуць пра Скірмунта. Толькі ж польскія паны-абшарнікі пра яго дрэнныя словы казалі.

— Дарэмна! Ведай адно: пан Скірмунт і гаспадар Пятро Рамановіч – беларусы, якіх я найболыш паважаю.

— Прыемна чуць! — і Мэндаль яшчэ раз мякка паціснуў руку Пятра.

— А мы тут з панам Мэндалем спрачаемся пра акцызы, — патлумачыў купец Клямка.

— То вы й працягвайце. Гэта ж ваш дзень сёння! Бачыце, што робіцца: тавараў — безліч. Прайду далей і я — пагляджу яшчэ тое-сёе.

Пятляючы між радамі, Пятро прабіўся на другі бок плошчы. Сярод знаёмых ён неўзабаве стрэў Малыцкку — чалавек прыдбаў крэйды для пабелкі сцен у пакоях падрамантаванай хаты. Паблукалі разам і купілі для сваіх маладзіц цукерак, а Пятро яшчэ і тульскіх пернікаў для ўнучкі. Нарэшце ён спыніўся каля воза з п'янькоўвымі вяроўкамі, узяў адну з іх, каторая таўсцейшая, у роздуме пакруціў, пацёр у пальцах, як знаток натуральнага сялянскага валакна, прыцаніўся, дастаў з кішэні і аддаў грошы. Добрая вяроўка! Няхай будзе на ўсялякую патрэбу.

Калі вярнуўся ў сядзібу, сын Барыс і астатнія ўжо былі дома. Селі сям'ёю за стол. Самы час! У царкве ж недзе ўсё яшчэ служылі святочную службу, пасля якой зморыныя святары збяруцца ў вялікай хаце каля царквы і за накрытым святочным сталом таксама спазнаюць хмельную радасць і асалоду быцця.

На стале ў Пісарчукоў перавакаюць стравы з рыбы, грыбоў, садавіны ды гародніны. Піражкі з яблыкамі, піражкі з тварагам… Мёд… Спас, як звычай, прыпадае на Засненскі пост, вядомы яшчэ як пост Успення. Пастом і вызначаецца акраса стала. Пад першыя нягучныя сямейныя тосты прапусцілі па чарцы, потым яшчэ, але ўсё без лішку, вольна, прыстойна.

Толькі вось гаспадара Пятра і тут не пакідала засяроджанасць:

— Я ўсё думаю: калі-небудзь знойдзецца тэхніка і знойдуцца людзі, якія дапамогуць нам вызначыць, дзе ляжыць ён, адкапаць і выцягнуць з вады Мікалай-звон.

— Пятро! — усклікнула Аксіння і доўжыла, увачавідкі пакепліваючы: — Без таго звону ты проста жыць не можаш!

— Мама! Ці чуеш, мама!.. Трэба паважаць таткаву схільнасць да музыкі!

Апошнія словы выгукнуў сын Паўлюк. Не ўсе зразумелі, што ў яго галаве?.. І Паўлюк даводзіў:

— Вось Піліпу, да прыкладу, падабаецца скрыпка, некаму хораша кладзецца на душу арган, а тату — медны звон! Таму ён і марыць пра дужага Мікалая! Той малінавы звон заўсёды будзе гучаць у ягоных вушах. Я праўду кажу, тата?

У застоллі зрабілася весела, і за бацьку заступіўся Барыс:

— Я не веру ў Бога, і вы гэта ведаеце. Тым не менш, скажу: асілак-звон здольны быў адганяць чарцей ад Моталя на дваццаць вёрст! Штука дужа прыемная і карысная! Апроч таго, Мікалай-звон быў і, калі яго выцягнуць, зноў можа стаць адметнасцю, сімвалам мястэчка.

— Хіба што…

— Тады, — узняў чарку Паўлюк, — за яго вяртанне!

— Анягож, — не змоўчала Зося і кінула мужу: — Ідзі, раней выцягні, а тады ўжо!..

— Выцягну!

І тут усе на момант прыціхлі.

— Да пшанічанька яра-а-а, — у распеў пачала Зося…

Застолле адчула смак і асалоду ад таго журліва-лірычнага напеву.

Не ў першы раз у гэтай сям'і гучыць Зосін голас, а дзівіць і ўражвае сваёй чысцінёй, тэмбрам, роўнымі, вытрыманымі і адначасова своеасаблівымі меладычнымі пераліваемі. Да яе адразу ж далучыліся іншыя галасы: Ганны, Аксінні, Паўлюка дый Пятра. Песня набрала моцы і нікольki не страчвала свайго задушэўнага ладу.

Яравы аве-ес,
Не по праўды, козачэ,
Не по праўды, соколю,
Ты со мною жывеш,
Зо мною жывеш…

Маня-малеча акурат у той момант была каля стала, яна зацікла і глядзела на сваю дружную радню, пераводзіла позірк з аднаго на другога ды з захапленнем слухала. Пры спяванні апошніх слоў куплета маладзіцы, аднак, пачалі ўкрадне зыркаць на яе татку і перамігвацца. А гэтага для яго ўжо было занадта! Бацька няйначай знайшоў нейкую нагоду, устаў і выйшаў з хаты. Дарма, у спіну яму ляцела:

Зо мною жывеш…
Дай як прыйдэ ве-ечур
Да вечур-вечурочак,
Да другоей ідэш.

Вярнуўся Барыс неўзабаве, ды не адзін, а са сватамі: Параскай і яе сынам Паўлам Міховічам, братам Ганны і Зосі; Павел хадзіў яшчэ ў жаніхах; за імі ступіў на парог і сват Іван Баяба, добра зляпены, мажны, відны, з жонкай Мар'яй — сястрой Ганны і Зосі, — яна ж побач са сваім чалавекам Іванам выглядала дзяўчынкай.

Насустрач ім з застолля абрынулася раскацістае, вясёлае:

Сёння ў нашай хаце свята,
І гасцей як тут багата!
Ўсіх на свята запрашаем
І сардэчна вас вітаем!

Паўлюк, а за ім і яшчэ той-сёй, прытанцоўваючы, падхапіліся вітаць дарагіх сватоў.

Дзень быў доўгім, гаманкім і песенным, але ж і яму прыйшоў канец.

Звечарэла. У хатах ужо тамсям запальваліся лямпы, і старыя пасля таго, як дагледзелі жывёлу (якая не зважала на хмельны рэй у сядзібе), паціху супакойваліся ды рыхтаваліся да сну. Іншы план быў у моладзі: яна заўзята шыкавала на зборнях, наладжвала танцы альбо ўлагоджвала свае ўзаемаадносіны па цікіх кутах — каханне ж было за асноўны матыў у будове жыцця.

Акурат у гэты час Пятро з Аксінняй выйшлі з сядзібы за веснічкі.

Пад самымі вокнамі іх мураванкі была ўкапаная невысокая лаўка, і менавіта каля яе гаспадары раніцай паставілі стол, накрылі яго белым абрусам, на ім пакінулі ў плеценай вазе яблыкі ды графін з мядовым напоем, кружку…

Гэта быў добры знак і звычэнне таму, хто гуляў на вуліцы — пачастунак для ўсялякага ахвочага. Так рабілі і іншыя гаспадары.

Пятро ды Аксіння выйшлі, каб забраць святочны стол у двор. Толькі ж Пятра пацягнула прысесці на лаўку — пасядзець, крыху ачомаца ад дзённага тлуму. І, паклаўшы на пакацістыя і цёплыя плечы жонкі руку, ён прыгарнуў яе да сябе.

— Вось так і жывем, — мовіў ён. — Усё, што трэба для жыцця, здабываем. Нялёгка… цяжка бывае, але ж, калі на тое, і весяліцца ўмеем.

Уздыхнуўшы, ён хвіліну памаўчаў.

— І добра, — казаў далей, — адно на душы неспакойна.

— Ты пра Барыса?..

— Ды не! Я ўвогуле… З газет відаць: свет наўкола неўладкаваны. Людзі грызуцца альбо рыхтуюць доўбні адзін на аднаго. У Іспаніі вайна… У Нямеччыне да ўлады прыйшлі нядобрыя людзі і, пэўна, вялікія рызыканты. Нешта новае ўваходзіць у жыццё. Адразу й не ўцяміш. Калі б на нашай вуліцы, напрыклад, знайшоўся паскуднік, які дбаў толькі пра ўласную сядзібу і на суседскія селішчы глядзеў, як на сваё, без усялякіх выбачэнняў таптаўся па чужых агародах… Што б ты, Ксеня, пра такога сказала?

— Не ведаю, гэта ж няможна ўявіць сабе!

— І я не ўяўляю. Зрэшты, немцу прыклад падавала й Польшча. Вазьмі панскую ўвагу да беларускага люду, агонь яе выкуры! У Крэсах Усходніх знікаюць апошнія беларускія школы. Нас пазбаўляюць супольных чалавечых правоў. А там, далей, пачалася ўжо тузаніна з жыдамі, іх прымушаюць высяляцца з Нямеччыны.

— Як гэта? Зусім?..

— А што ты думаеш!.. Польшча, між іншым, заключыла з немцамі дамову тэрмінам на дзесяць гадоў аб мірным суіснаванні, павазе да нацыянальных межаў… Але ж немцы зноў узбройваюцца і бачаць непазбежнай сваю вайну з бальшавіцкай Расеяй. Адсюль, як бачыш, вынікае: Польшча можа апынуцца ў адным хаўрусе з немцамі, і тады… прыгадайма вайну!

— Не давядзі Госпадзі!

— І тая навала нас не абміне. Але ж лепш не думаць пра гэта…

У небе ўсё ярчэй разгараліся зоркі. З возера разам з туманам ішла прахалода. Чуліся загадкавыя воклічы і смех, недзе воддаль пілікаў гармонік. Неўзабаве ўзнікла песня і сціхла… Зноў заспявалі ў некалькі галасоў.

Да пшанічанька яра-а-а…

— Чуеш? — сказала Аксіння. — Напэўна ж, і наша нявестачка ў тым карагодзе.

— Няхай. Але ж як гучыць над возерам дзявочы напеў, пад высокім азораным небам!

Мелодыя па-новаму чаравала. Яна вяртала Пятра і Аксінню ў сваю маладосць, не такую ўжо і далёкую, а толькі — як помняць сябе яны — сумесную, суладную; і прайшла іх маладосць праз выпрабаванні аж да гэтага дня, да гэтага самага Спаса-Ратавальніка, — ім заўсёды здавалася, што не будзе ёй скону…

**Другое дапоўненае выданне кнігі Васіля Якавенкі «Пакутны век» можна набыць, папярэдне замовіўшы яе па тэлефонах: (МТС) 776-77-13; (Velcom) 304-40-64.**

АДКАЗЫ

# ЗЬНІЧ

***Што для вас свабода?***
*Хто не ў Хрысьце — абмежаваны,*
*Нібы ў малым чаравіку,*
*Альбо — як вершнік зацугляны,*
*Ці у кайданы хто закуў.*
*Нехрысціянскія «мадэлі»*
*Светабудовы й грэшных нас,*
*Нібы дзіцячыя арэлі,*
*Што гойдаюць з бясчасся ў час.*
*Хто зведаў існую Свабоду,*
*Што даў нам Бога-Чалавек, —*
*Вяртае Богу з веку ў век*
*Даўгі Адамавага роду…*

***Што найбольш абмяжоўвае вашу свабоду?***
*Грэх.*
*Як Еву Змій абмежаваў*
*А следам і Адама сціснуў,*
*Грэх, як атрута, ўсё працяў,*
*Зачараваў, зрабіў няісным.*
*Святыя Божыя дары —*
*Сусвет, свабоду, наваколле —*
*Ператварыў у бляск зары,*
*Недасягалнае ніколі…*

***Чаго вы найбольш баіцеся?***
*З духам ліхім сябе звязаць*
*У плынным і у вечным лёсе,*
*Ў спакусах страціць Благадаць,*
*Што даў Гасподзь мне ў святым хросце.*

***Кім з сучаснікаў вы захапляецеся?***
*Хто з верай дбае пра жыццё*
*І Богу дзякуе за ўсё…*

***Што вы найбольш любіце рабіць?***
*Ураз: маліцца… і раяліць,*
*І (трэцім голасам) — рыфмарыць…*

***Калі б можна было пражыць жыццё яшчэ раз, што б вы змянілі?***
*Каб зноў жыццё змагло пачацца,*
*Раней пачаў бы ўцаркаўляцца…*

***Якую найлепшую параду вы атрымалі?***
*Якая — на усе вякі — парада?*
*Ўхіляйся ў сэрцы Кайнавай вайны,*
*Агню пякельнага —*
*прад бліжнім здрады,*
*Прад Богам — нераскайнае віны.*

***У якой палітычнай сістэме і ў якой краіне вы хацелі б жыць?***
*Я жыць хачу там, дзе законы дзяржавы*
*Адпавядаюць Канонам Царквы,*
*Дзе людзі жывуць дзеля Божае Славы —*
*Ад Вашынгтона аж да Масквы.*
*А дзеля назвы тае краіны*
*Я ў Бога літасці папрасіў:*
*Дай, Божа, жыць Твайму блуднаму сыну*



*У Трыадзінай Святой Русі…*

***У якую эпоху вы хацелі б жыць?***
*Мая эпоха заўжды са мною:*
*З Царства Нябёснага —*
*ў царства зямное…*
*Потым — назад,*
*да Крыніцы Натхнення,*
*У Богадайны рай летуценняў…*

***Якія адносіны Беларусь павінна мець з Эўразвязам і з Расіяй?***
*Як і ў час Канстанціна Вялікага,*
*Сёння зноў Эўропа — хрысцьянская:*
*Праваслаўная, каталіцкая,*
*А на поўначы — пратэстанцкая.*
*Беларусь — яе Сэрца… А ў Цэласці —*
*Ўсё сумовіцца з Божае Ласкі,*
*Усе Крэсы хрысцьянскія — наскія!*
*Толькі б веры хапіла і смеласці.*

***Калі і як у Беларусі зменіцца ўлада?***
*«Калі зменіцца татуля?» —*
*Прашаптаў у сне сынок*
*І матулечку расчуліў:*
*«Спі, дзіцятка, — як дасць Бог».*

***Калі беларусы загавораць па-беларуску?***
*На Боганатхнёнай Мове*
*Мы сумовімся з Хрыстом*
*Шмат вякоў… І ў Бозе-Слове*
*Наш жыве Царкоўны Дом.*
*Ну, а свецкія гаворкі*
*І паноў, і мужыкоў*
*Трэ а б о ж ы ц ь доляй горкай…*
*…………………………………*
*Хто пакаяцца гатоў?*

***Што будзе, калі беларусы не загавораць па-беларуску?***
*Мо, я злёгку глухаваты,*
*Але сведчыць Дух Святы:*
*Я не чуў ад майго брата —*
*Беларуса — нематы…*

**(Тэксты ўпершыню прагучалі на хвалях Радыё Свабода–)**

ПАРЦЭЛЫ

# АЛЕСЬ МАКРАЦОЎ



* * *

*Высокаму*
*духам*
*бачна*
*будучыня…*

* * *

*Апісаўшы*
*крывую жыцця —*
*бумерангам*
*дамоў*
*вярнуся…*

* * *

*У пастарэлай*
*хаце —*
*бездапаможная*
*маці…*

* * *

*Будучае*
*малога…*
*Мінулае*
*пажылога.*

* * *

*Маці…*
*Азяблай*
*вяргіняй*
*вяне…*

* * *

*Будучыня*
*нябыту…*
*Вечнасць*
*мінулага…*

* * *

*Між дрэў —*
*людзі з нажамі…*
*Даждлівы,*
*грыбны жнівень.*

* * *

*Выпрастаная*
*рака…*
*Пакрыўленая*
*прырода.*

* * *

*На дрэвах*
*людскіх лёсаў*
*пладамі*
*спеюць учынкі…*

* * *

*Вызваленне*
*нацыянальнай мовы*
*з-пад слоя чужой…*
*Рэстаўрацыя*
*беларускага Храма…*

* * *

*Пярэстай*
*сарокай*
*зіма*
*праляцела…*

* * *

*Нязносны*
*для голага лесу*
*мароз…*
*Страляюцца дрэвы.*

* * *

*Залацістае зерне*
*новага ўраджаю*
*на асфальце*
*дарогі…*
*Падатак,*
*спагнаны ветрам…*

* * *

*Шэрань*
*вершаваных радкоў —*
*паэзія*
*зімовага дроту…*

АДНАРАДКОЎІ

# ЯЗЭП ПАЛУБЯТКА

## Судны дзень

Ісус маўчаў, а Саваоф не слухаў.

* * *

Іду жыццёвым шляхам да Галгофы.

* * *

Нас толькі смерць уратуе ад жыцця.

* * *

Які вялізны ложак без цябе.

* * *

Любая! Сёння я зноў заробатак прапіў!

* * *

Партыі веру, як жонцы сваёй.

* * *

Хачу на пенсію хутчэй.

* * *

А хто наступны будзе правіць баль?

* * *

Засыпае Чарнобыльскі попел сляды.

* * *

І зноў іду я на паклон да бюракрата.

* * *

Прыязнасці тваёй не бачыць мне ў труне.



* * *

Крывыя ногі выстаўляеш на паказ.

* * *

Сусвет пакрыты брудам чалавечых перамог.

* * *

Яго псавалі разважанні.

* * *

Воляю голад не натоліш.

* * *

Не кіпі! Будзь такою гарачаю ноччу!.

* * *

Такія вусны! І такі язык.

* * *

Са шляху светлага хачу звярнуць налева.

* * *

Чужыя хібы цешаць чалавека.

* * *

Аб «сціпласці» тваёй гаворыць увесь свет.

* * *

Сваю Галгофу насыпаю сам.

* * *

Мне так адзінока ў натоўпе людскім.

* * *

Шушкевіч зноў казаў пра талерантнасць.

* * *

А я хачу цябе яшчэ і днём.

* * *

Не кожная птушка лётае ў небе.

* * *

Ты болей мне не снішся па начах.

* * *

Не губляй сябе ніколі.

УВАГА: КОНКУРС!

## Паважаныя сябры!

З 1 студзеня 2010 года Саюз беларускіх пісьменнікаў абвяшчае новы конкурс на лепшы літаратурны твор, у якім асвятляецца вобраз жанчыны ў сучасным грамадстве і асэнсоўваюцца актуальныя гендэрныя праблемы.

На конкурс прымаюцца тэксты ўсемагчымых жанраў: паэзія, проза, драматургія, крытыка. Аўтарамі конкурсных твораў могуць быць і мужчыны, і жанчыны, і пачаткоўцы, і прафесіяналы.

Лаўрэатаў літаратурнага конкурса «Жанчына ў сучасным грамадстве», які будзе доўжыцца да 1 кастрычніка 2010 года, чакаюць прэміі, прызы і падарункі, а пераможца атрымае магчымасць выдаць свой тэкст асобнай кнігай!

Калі ласка, дасылайце свае творы на адрасы: паштовы — 220025, Мінск-25, а/с 91; электронны — sbp@tut.by.

**Сакратарыят Саюза беларускіх пісьменнікаў**

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 1 СТУДЗЕНЯ, ПАТНІЦА

### Першы канал

**07.35** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.35** «Вакацыі ў Прастаквашына». Мультфільм.
**08.55** Фільм-казка «Снягурка» (СССР).
**10.20** Прэм'ера. Лірычная меладрама «Дзядуля ў падарунак» (Расія- Украіна).
**12.00, 15.00** Навіны.
**12.10** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна)..
**13.00** «За тых, хто на пасту!» Гумарыстычная праграма.
**14.40** «Дзед Мароз і шэры воўк». Мультфільм.
**15.10** «Песня года- 2009». Трансляцыя са СК «Алімпійскі» (Масква).
**19.10** Прэм'ера. Сямейная камедыя «Сваты» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
**21.00** Панарама.
**21.40** Рамантычная камедыя «Красуня» (ЗША).
**23.45** Мюзікл «Вельмі Навагодняе кіно, або Ноч у музеі» (Украіна).
**01.45** Канцэрт «Першы віншуе Беларусь!».

### АНТ

**08.30** «Дыскатэка 80-х».
**09.40** «За двума зайцамі».
**11.20** Камедыя «Іронія лёсу, або З лёгкім парам!».



**14.40** Прэм'ера. Легендарнае кіно ў колеры. «Папялушка».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Камедыя «Зігзаг поспеху».
**17.40** Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Прэм'ера. Фільм «Іронія лёсу. Працяг».
**22.50** Прэм'ера. «Вялікая розніца». Навагодні выпуск.



**00.30** «Легенды «Рэтра FM».

### СТВ

**07.15** Мультыплікацыйныя фільмы.
**08.50** Фільм «Кажан». СССР, 1979г.
**11.05** Навагодні мюзікл «Як казакі...». Украіна, 2009 г.
**12.45** Фільм «Дзеці шпіёнаў». ЗША, 2001г.
**14.20** СТБ прадстаўляе: «Міс Мінск 2009».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Навагодні агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Пяць гісторый».
**17.45** Фільм «Прывітанне, я ваша цётка». СССР, 1975 г.



**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** Прэм'ера! Музычна-забаўляльнае шоў «Аднакласнікі. Навагодняя сустрэча». Украіна, 2008 г.
**23.15** «Зорны рынг». Усе хіты.

**00.10** СТБ прадстаўляе: «Ноч выканання жаданняў». Музычная казка.

### ЛАД

**08.15** ЛАДная раніца.
**12.10** Камедыйная меладрама «Сірата казанская» (Расія).



**13.40** Меладраматычны серыял «І падае снег...» (Расія). 1-4- я серыі.
**16.55** Прэм'ера. Эксцэнтрычная камедыя «Лапухі» (Расія).
**19.05** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Трое і Сняжынка» (Расія).
**20.50** Фантастычная камедыя «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара» (Францыя - Германія - Італія).
**22.50** Канцэрт групы «Сплін».
**00.05** Музычная камедыя «У шоў толькі дзяўчыны» (ЗША).

### РОССИЯ

**06.00** Камедыя «З Новым годам, тата!».
**07.35** «Лепшыя песні-2009». Святочны канцэрт з Дзяржаўнага Крамлёўскага палаца.
**09.20** Навагодняя камедыя «Добрая сяброўка для ўсіх». 2008 г.
**11.05** Фільм «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан».
**13.45** Фільм «Чарадзеі».
**16.30** Прэм'ера. «Гумар года». Частка першая.
**18.45** Прэм'ера. «Песня года». Частка першая.
**22.00** Прэм'ера-2010. Фільм «Стылягі».
**00.30** Прэм'ера. Камедыя «На моры!». 2009 г.
**02.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**05.00** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**06.30** Навагодняя камедыя «О`Кей!.».
**08.10** Мультфільм.
**09.30** «Казкі Бажэнава».
**10.40** Прыгодніцкая камедыя «Макасіны Маніту».
**12.10** Камедыя становішчаў «Блізнюк».
**14.05** Музычная казка «Прыгоды Алёнушкі і Яромы».
**15.35** «Бясконцае каханне». Канцэрт Аляксандра Сярова ў Крамлі.
**17.20** Камедыйны баявік «Таксі».
**19.00** Сёння.
**19.30** Камедыйны баявік «Таксі-2».



**21.15** Прэм'ера. Містычная меладрама «Змярканне».
**23.25** Прэм'ера. «Эх, разгуляй!» Фэст добрай музыкі.
**01.40** Прэм'ера. Камедыйны баявік «Супергеройскае кіно».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). Кваліфікацыя. HS 140.
**11.00** Вось дык так!!!
**11.30** Вось дык так!!!
**12.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Барселона» (Іспанія) - «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія).
**13.00** Футбол. Кубак Афрыканскіх Нацый (Ангола).
**13.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). Кваліфікацыя. HS 140.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). HS 140. Прамая трансляцыя.
**16.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Жанчыны. 2,5 км вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**17.15** Вось дык так!!!
**17.30** Вось дык так!!!
**18.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Мужчыны. 3,75 км вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**18.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). HS 140.
**20.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Жанчыны. 2,5 км вольным стылем.
**20.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Мужчыны. 3,75 км вольным стылем.
**21.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. Прамая трансляцыя.
**22.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. Маршрут Дакара 2010.
**22.30** Аўтаспорт. Гонкі чэмпіёнаў (Пекін, Кітай).
**00.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). HS 140.
**01.15** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit».
**01.30** Ралі. Ралі рэйд. Дакар.

### БЕЛСАТ tv

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**17.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.50** «Спадар Піліпенка і ягоны падводны човен», дак. фільм, 2006 г., Германія–Францыя.
**19.35** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.50** Навагодні канцэрт «Снежны завулак 10».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Рухомы замак Гаўла», анімацыйны фільм, 2004 г., Японія.
**23.20** Аб'ектыў.

## 2 СТУДЗЕНЯ, СУБОТА

### Першы канал

**07.00** Існасць.
**07.25** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.25** Здароўе.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Шпілька». Праграма для жанчын.
**09.40** Ранішняя хваля.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.50** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**11.35** Дакументальны цыкл «Масфільм. Невядомая версія» (Украіна).
**12.30** Камедыя «Па сямейных абставінах» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Млын моды. Паўналецце».
**16.15** Эксцэнтрычная камедыя «Тупы, і яшчэ больш тупы» (ЗША).



**18.10** «Ваша лато».
**19.00** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.10** Сямейная камедыя «Сваты» (Украіна). 3-я і 4-я серыі.
**21.00** Панарама.
**21.40** Прэм'ера. Навагодняя камедыя «Снежны чалавек» (Расія).
**23.30** Мюзікл «Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро» (Украіна).
**01.50** «За тых, хто на пасту!» Гумарыстычная праграма.

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.40** Камедыя «Дзяўчаты».
**11.20** Камедыя «Афоня».
**12.55** Фільм «Бедная Саша».
**14.40** Камедыя «Каўказская палонніца, або Новыя прыгоды Шурыка».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Камедыя «Службовы раман».
**19.05** Прэм'ера. Навагодні канцэрт М.Задорнава.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Стылягі».
**23.25** «Старыя песні аб галоўным» да 02.10.

### СТВ

**07.00** Мультыплікацыйныя фільмы.
**09.00** «Культурнае жыццё». Навагодні выпуск.
**09.30** Фільм «Нябесныя ластаўкі». СССР.
**11.40** Музычна-забаўляльнае шоў «Аднакласнікі. Навагодняя сустрэча». Украіна, 2008 г.
**14.50** Фільм «Дзеці шпіёнаў - 2: выспа надзей, што не спраўдзіліся». ЗША, 2002г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** СТБ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма».
**17.10** Фільм «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». СССР, 1979 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** Прэм'ера! Музычна-забаўляльнае шоў «Карнавальная ноч». Расія, 2007 г.
**23.00** «Зорны рынг». Усе прэм'еры.
**00.00** СТБ прадстаўляе: «Дзень Нараджэння ў Новы год».

### ЛАД

**07.50** Камедыйная меладрама «Трое і Сняжынка» (Расія).
**09.25** Тэлепорт.
**09.50** Нашы тэсты.
**10.20** Гараджане.
**10.55** «Дванаццаць месяцаў». Мультфільм.
**11.50** Свая кампанія.
**12.40** «Лабірынты: пра што пяюць арганы».
**13.05** «Запал па культуры».
**13.50** Меладраматычны серыял «І падае снег...» (Расія). 5-8-я серыі.
**17.10** Меладрама «Сабрына» (Германія - ЗША).
**19.25** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.35** Прыгодніцкая камедыя «Астэрыкс і Абелікс: Місія «Клеапатра» (Францыя).
**22.30** Жывы гук.
**23.15** Казанова.
**23.40** Прэм'ера. Эратычная камедыя «Залаты ключык» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** Музычная камедыя «Саламяны капялюшык».
**09.10** Камедыя «На моры!». 2009 г.
**11.00** «Ранішняя пошта». Навагодні выпуск.
**11.35** «Суботнік». Навагодні выпуск.
**12.15** Фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».



**14.00** Весткі.
**14.10** Фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Працяг.
**16.30** Прэм'ера. «Гумар года». Частка другая.
**18.40** Прэм'ера. «Песня года». Частка другая.
**21.50** Прэм'ера-2010. Фільме «Заселеная выспа».
**00.05** Камедыя «Рэальныя тата». 2008 г.
**01.35** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.15** Камедыя « Новы Год па Грынвічы».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** Мультфільм «Канёк-гарбунок».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** Мастацкі фільм «Глушэц. Прыходзь, Новы Год!».
**15.15** Дэтэктыўны серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
**19.00** Сёння.
**19.30** Камедыйны баявік «Таксі-3».
**21.15** Камедыйны баявік «Таксі-4».
**23.00** Камедыйная меладрама «Вікі. Крысціна. Барселона».
**00.35** Баявік «Адрэналін».

### EUROSPORT

**09.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Жанчыны. 2,5 км вольным стылем.
**10.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Мужчыны. 3,75 км вольным стылем.
**10.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Гарміш-Партэнкірхен). HS 140.
**12.00** Лыжнае двабор'ства. Кубак свету (Оберхоф). HS 140. Прамая трансляцыя.
**12.45** Санкавы спорт. Кубак свету (Кенігзее). Жанчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**13.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Жанчыны. 10 км класічным стылем. Прамая трансляцыя.
**14.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў у Аўстрыі (Інсбрук). Кваліфікацыя. HS 130. Прамая трансляцыя.
**16.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Мужчыны. 15 км класічным стылем. Прамая трансляцыя.
**17.15** Лыжнае двабор'ства. Кубак свету (Оберхоф). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**18.00** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**18.05** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Інсбрук). Кваліфікацыя. HS 130.
**19.00** Дартс. Чэмпіянат свету «Lakeside» (Фрымлі Грын, Вялікабрытанія). Дзень 1-ы.
**20.00** Дартс. Чэмпіянат свету «Lakeside» (Фрымлі Грын, Вялікабрытанія). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**21.30** Футбол. «Harder Cup» (у памяшканні). Таварыскі турнір (Германія). Прамая трансляцыя.
**00.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 1-ы этап. Прамая трансляцыя.
**00.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. К 1. Сусветны Гран-пры. Токіо (Японія). Фінал.
**02.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 1-ы этап.

### БЕЛСАТ tv

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.35** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**18.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**18.30** «Яны хацелі забіць Гітлера», дак. фільм, 2004 г., Германія. 1 серыя: «Самотны герой».
**19.15** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** «Рэвалюцыя ў эфіры», дак. фільм, 2005 г., Германія.
**20.35** Еўрасаюз без сакрэтаў, 22 серыя: «Еўрасаюз і Сусвет».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Суботні сеанс: «Споведзь незнаёмцу», маст. фільм, 1994 г., Францыя.
**22.55** Аб'ектыў.

## 3 СТУДЗЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.15** Фільм-казка «Каралеўства крывых люстэркаў» (СССР).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Добрага здаровейка, краіна!» Гумарыстычная праграма.
**10.50** У свеце матораў.
**11.25** Nota Bene.
**12.10** Музычная камедыя «Чарадзеі» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Падарожжа дрыбінскіх шапавалаў» цыклу «Зямля беларуская».
**15.35** Камедыя «Містэр Лёс» (ЗША).
**17.40** Суперлата.
**18.40** Сямейная камедыя «Сваты» (Украіна). 5-я і 6-я серыі.
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** Эксцэнтрычная камедыя «Сямейка Ады» (Расія).
**23.50** «Добрага здаровейка, краіна!» Гумарыстычная праграма.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**09.50** Камедыя «Дуэнья».
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Навагодняя гумарыстычная дыскатэка».
**13.40** Фільм «Безназоўная зорка».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Камедыя «Дыяментавая рука».
**18.10** Камедыя «Аперацыя «З Новым годам!».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Хвіліна славы» Навагодні гала-канцэрт.
**23.55** Меладрама «Свята кахання». ЗША, 2007 год да 01.45.

**07.05** Фільм «Прыгоды Бураціна». СССР, 1975 г.
**09.20** Фільм «Дон Сезар дэ Базан». СССР, 1989 г.



**11.35** «Вялікі сняданак». Навагодні выпуск.
**12.10** Музычна-забаўляльнае шоў «Карнавальная ноч». Расія, 2007 г.
**15.10** Фільм «Дзеці шпіёнаў - 3: гульня скончана». ЗША, 2003 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** «Аўтапанарама». Навагодні выпуск.
**17.25** СТБ прадстаўляе: Серыял «Тэарэтыкі». 1, 2, 3 і 4 серыі.
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Мюзікл «Снежная каралева». Расія, 2003 г.
**22.30** Фільм «Кракадзіл Дандзі ў Лос-Анджэлесе». ЗША, 2001г.
**00.05** «Зорны рынг». Усе гісторыі.
**01.00** СТБ прадстаўляе: «Новы год наадварот».

**07.35** Дабравест.
**08.00** Мір вашай хаце.
**08.15** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.40** «Праўдзівая гісторыя Чырвонай Шапкі». Анімацыйны дэтэктыў (ЗША).
**10.05** Школа рамонту.
**11.05** Медычныя таямніцы.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Хакей. КХЛ. Сібір (Новасібірск) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**15.25** Гаспадар.
**15.50** «Пасоўванне+».
**16.10** Рамантычная трагікамедыя «Жыццё як цуд» (Сербія- Францыя-Італія).
**18.50** Жаночая ліга.
**19.15** Нашы тэсты.
**19.50** Экспедыцыя.
**20.20** Тэлебарометр.
**20.45** Фантастычная камедыя «Астэрыкс і Абелікс на Алімпійскіх гульнях» (Францыя).



**22.30** Свая музыка. Працяг.
**23.05** Прэм'ера. «Ноч з Горанам Брэгавічам». Музычная праграма (Францыя).

**07.00** Фільм «Прадаецца дача...».
**08.40** Камедыя «Рэальны тата». 2008 г.
**10.20** Камедыя «Буйнагабарытныя».
**12.05** Фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».
**14.00** Весткі.
**14.10** Фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Працяг.
**15.10** Музычны фільм «Бедная крошка». 2006 г.
**16.25** Камедыя «Паласаты рэйс».
**18.10** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі.
**19.20** «Навагодні КВЗ».
**21.50** Прэм'ера-2010. Фільм «Заселеная выспа. Сутычка».
**00.00** Фільм «Халоднае сонца». 2008 г.
**01.55** Заканчэнне эфіру.

**06.25** Серыял «Аўтобус».
**08.00** Сёння.
**08.20** Мультфільм.
**08.30** Камедыйны баявік «Таксі-3».
**10.00** Сёння.
**10.25** Серыял «Расклад лёсаў».
**12.05** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суперстар» прадстаўляе: Люба, Любанька, Любоў. Канцэрт-споведзь Л. Успенскай».
**15.15** Дэтэктыўны серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
**19.00** Сёння.
**19.30** Баявік «Браценікі».
**23.20** Дэтэктыўны серыял «Павуцінне».

**09.30** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 1-ы этап.
**10.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Інсбрук). Кваліфікацыя. HS 130.
**10.40** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету (Заграб). Жанчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.45** Лыжнае дваяборства. Кубак свету (Оберхоф). HS 140. Прамая трансляцыя.
**12.30** Санкавы спорт. Кубак свету (Кенігзее). Мужчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**13.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Харватыі (Заграб). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**14.15** Лыжнае дваяборства. Кубак свету (Оберхоф). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**14.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Інсбрук). HS 130. Прамая трансляцыя.
**16.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету (Оберхоф). Мужчыны і жанчыны. Спрынт класічным стылем. Прамая трансляцыя.
**18.10** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**18.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Інсбрук). HS 130.
**19.30** Дартс. Чэмпіянат свету «Lakeside» (Фрымлі Грын, Вялікабрытанія). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**00.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 2-і этап. Прамая трансляцыя.
**00.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Турнір 4-х трамплінаў (Інсбрук). HS 130.
**01.45** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**01.50** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 2-і этап.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.25** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял.
**18.15** Дакументальная гадзіна: «Час Чжоў Эньлая», дак. фільм, 1998 г., Беларусь.
**19.15** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.45** МакраФон: «Рок-карона: 1994–1996. Архіўныя запісы»: ч. 1.
**20.10** Андрэй Такінданг: «...апрануўшы белую кашулю...».
**20.25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.25** «Пад покрывам нябёсаў», маст. фільм, 1990 г., ЗША–Італія–Вялікаябрытанія.

## Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і пропісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ______
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Всего ______

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ПРЭМ'ЕРА

# ТЭРПСІХОРА СПАТЫКНУЛАСЯ, або НОВАЯ «ПАПЯЛУШКА»

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Увага, пытанне: што аб'ядноўвае Шарля П'еро і Сяргея Пракоф'ева? Правільны адказ: колькасць абаротаў у труне за хвіліну. 5 снежня ў Мінскім оперным адбылася прэм'ера балета «Папялушка».**





Следам за пампезнай рэнавацыяй Тэатра як Храма — фасада, інтэр'ераў і камунікацый будынка на Траецкай гары, пра якую «НЧ» пісаў у сакавіку 2009-га, у беларускіх оперы і балеце распачалася рэформа Тэатра як Школы. Праз месяц пасля напаўсенсацыйнай пастаноўкі оперы Вердзі «Трубадур» адбылася яшчэ адна чаканая ды шырока рэкламаваная прэм'ера: украінска-расійскі харэограф Юры Пузакоў прыехаў паставіць нам «Папялушку». З цяжкасцю трапіўшы на гэта гледзіва, пасля яго заканчэння я дзейнічала абсалютна ва ўнісон з публікай: мы стаялі і ха-ло-дна пры-м а-лі пастаноўку. Прайшоў час, і цяпер, калі эмоцыі аціхлі, я паспрабую разабрацца найперш для сябе, што ж было не так з любімай казкай у перакaзе Тэрпсіхоры.

## Перамога жыцця над казкай

Тое, што я напішу ніжэй, на слэнгу фанатаў розных серыялаў называецца «спойлер» — я псую шаноўнаму чытачу (магчымую) прыемнасць ад прагляду новага балету на сцэне Опернага, пераказваючы лібрэта. Вы спытаецеся, што мы там не ведаем у гэтай гісторыі кахання з першага позірку, што за тры стагоддзі стала класікай і штампам? Сумна, але факт: адна з нешматлікіх прыемнасцяў, якую прыносіць спектакль, — гэта чытанне праграмкі, у якой сюжэт Папялушкі быў падагнаны пад альфонсмухаўскую атмасферу Парыжа пачатку XX стагоддзя.

У балетнай студыі суворай Матухны вэрхал: ідуць апошнія прыгатаванні да танцавальнага конкурсу ў Палацы Караля, дзе будуць выступаць яе ўлюбёныя вучаніцы — Злюка і Крыўляка. За тузанінай шкадлівых дзяўчатак назірае пакаёўка Папялушка. Адораную дзяўчынку ніхто і не думае вучыць танчыць, з яе нягеглых па пацяшаюцца, яе зневажаюць. Бойка ў студыі перапыняецца прыходам чарніцы, якая збірае ахвяру на касцёл (на ажурны, гатычны французскі касцёл — аж крычаць дэкарацыі — магчыма, на сам Нотр-Дам!). Кепскія героі балета праганяюць чарніцу, а Папялушка па-біблійнаму аддае святой жанчыне апошнюю лепту. І нямарна: бо гэта ж была пераапранутая фея — Фея Танца. Уночы, калі гаротніца Папялушка засынае, фея яўляецца паненцы ў сапраўдным абліччы і з дапамогай кароткага ўроку рытмікі адорвае мастацтвам харэаграфіі, а таксама поўным «райдэрам» Папялушкі — уключна з дыяментавымі пуантамі і бліскучым аўто, якім кіруе паж, нязвычайна падобны да таго самага з савецкага кіно, які «я не чараўнік, я толькі вучуся». Папялушка таксама едзе на конкурс танца, даўшы падпіску пра вяртанне з балу цягам каляндарных сутак — пакуль не праб'е поўнач.



У палацы караля таксама апошнія прыгатаванні. Кароль — стары баявы генерал — рассякае па сцэне ў сецэсійным інвалідным вазку, заляцаючыся да кардэбалету. Прынц вяртаецца з вечарынкі п'яны — хістаючыся, ён усёткі вырабляе некалькі мужчынскіх балетных скокаў, пасля чаго яго выносяць у кулісы. У конкурсе танцаў чамусьці ўдзельнічаюць толькі Злюка і Крыўляка — але вось з'яўляецца Папялушка, і кубак найлепшай танцоркі аддаюць ёй. Прынц, што ўмомант працверазеў, без памяці закаханы. Папялушка, як пераконвае нас лібрэта, «у захапленні ад яго мужнай красы». Яны забываюць пра ўсё навокал і нават адмаўляюцца ад апельсінавага марозіва (зноў прывітанне чорна-белай савецкай «Папялушцы»). Але гадзіннік робіць сваю няўдзячную справу — і дыяментавая пуанта, як ёй і належыць, застаецца на прыступках палаца.

Прынц несуцешны. У балетным трыко колеру хакі і пробкавым шаломе ён пранікае ва ўсе куткі Зямлі, шукаючы Папялушку. Але ўрэшце, проста як алхімік Каэльё, здагадваецца пашукаць каханую незнаёмку побач з родным палацам. Нягледзячы на дыктатуру Матухны, Папялушка і прынц пазнаюць адно аднаго і амаль без перапынку на прывітальны танец ідуць пад вянец...

...Ранак у балетнай студыі. Папялушка прачынаецца ў сваёй каморцы. Тут жа ёй у твар пхаюць анучу: мый падлогу. І яна мые яе, пад урачыстую коду Пракоф'ева: усё было толькі сном. Але знойдзены на грудзях залаты гадзіннічак, падораны пажам, пасяляе ў сэрца гаротніцы хімерную надзею.

## У пошуках балета

Усё названыя і неназваныя мной рэжысёрскія прыдумкі, галівудскія хітрыкі і спецэфекты былі б мілай аздобай пекнага балета, калі б трупа пратанчыла ўсё тое, што я зараз апісала. Але праблема ў тым, што пастаноўшчык стаў на сумнеўны шлях ігравога балету. Слова «танчыць» у гаворцы пра новую «Папялушку» напоўніцу можна ўжыць толькі стасоўна кардэбалету. Салісты ж збольшага занятыя тым, што мімікай і жэстамі, стоячы, седзячы і бегаючы па сцэне, пазначаюць свае дзеянні. Прычым робяць гэта так няўмела, адчайна і натужна, што, гледзячы на іх пакуты, так і хочацца крыкнуць: «Ды не мучайся, скажы словамі!» Калі ж справа даходзіць да харэаграфіі, то пагалоўна ўсе танцоры, што задзейнічаныя ў спектаклі, па сцэне прагульваюцца: ніводнага арыгінальнага дуэта, ніводнага складанага скоку — відаць, вострую праблему недахопу канап для адпачынку за кулісамі ў Оперным вырашылі тым, што танцораў цяпер будуць менш напружваць. Сачыць за дзіцячай валтузнёй вядучых балерын трупы на сцэне забаўна — але, як гэта ні банальна з нашага боку, мы, гледачы, ходзім на балет, бо там танчаць!

У выніку воплескі пасярод спектакля чуліся тройчы. Адзін раз іх сарваў кароль, грацыёзна круцячыся ў інвалідным вазку, і двойчы — дэкарацыі. Яны, трэба сказаць, у новай пастаноўцы фенаменальныя (мастак-пастаноўшчык — Аляксандр Касцючэнка). Уявіце сабе сцэну: Прынц шукае Папялушку на ўсходзе. На сцэну выходзіць «усходняя прыгажуня», тры хвіліны няўмела танчыць на адным месцы нешта падобнае на танец жывата і сыходзіць. Прынц падбягае з пантофлікам да гіганцкага вярблюда: ці не бачыў ты каханай маёй? І раптам гіпсакардонны вярблюд круціць галавой: не-а. Усе авацыі — жывёле. Ці рэтраэрапланчыкі, якія ляцяць шукаць Папялушку на край Зямлі пад класічную музыку на фоне 3D-анімацыйнага неба... Не кажучы ўжо пра тое, якая багатая тэма для дэкаратара — французскі мадэрн. Але дзе балет? Балет, я пытаюся, дзе?..

Добрая навіна: у Тэатры оперы і балета нарэшце з'явіўся спектакль, на які можна вадзіць у культпаходы вучняў старэйшых класаў агульнаадукацыйных школ і ПТВ — і ім не будзе нудна. Як глыбокадумна напісаў Юры Пузакоў у сваім па-юнацку натхнёным звароце да публікі, новы спектакль «не для дзяцей, што прыйшлі ў тэатр з бацькамі, а для дарослых, што ўзялі з сабой дзяцей» (пасмакуйма нюансы). А тое, што артысты балету дзве гадзіны проста ходзяць па сцэне — не бяда: згадайце, як у дзяцінстве вас раздражняла, што яны дрыгаюць нагамі, а робяць выгляд, што прызнаюцца ў каханні ці б'юцца на дуэлі. Беларускі балет імкліва стаецца зразумелым простаму гледачу.

Кепская навіна: звычайны парадак рэчаў — калі дэкарацыі і касцюмы ў балеце падкрэслівалі вартасці танцу, з усяго відаць, у беларускім балеце змяніла эра, калі эксперымент і выдумка — самі па сабе, а танец — сам па сабе, і ён не галоўнае. Чорт з ёй, са Школай і Традыцыямі — цяпер у нас 3D-анімацыя на задніку: не сорамна і замежнікам паказаць. Толькі вось яшчэ дзве-тры такія пастаноўкі — і беларускі балет абанкруціцца: на замежныя гастролі, дзе высока цэняць найперш харэаграфічнае майстэрства ды высокакласную тэхніку нашай трупы, больш не будзе чаго вазіць.

ГЕАПАЛІТЫКА

# НЕДАЛЁКА АД БАНГАЛОРУ

**Нягледзячы на тое, што Індыя як дзяржава існуе больш за 60 гадоў, працэс нацыянальнага і адміністратыўнага падзелу працягваецца там да гэтага часу. 9 снежня цэнтральны ўрад абвясціў пра стварэнне новага штата Тэленган. Пра асаблівасці нацыянальна-адміністратыўнай палітыкі Алег Новікаў размаўляе з індыйскай журналісткай Мрытулай Гох.**

***— Як вядома, у Індыі жывуць больш за сто нацый і народаў, прычым розных рэлігійных веравызнанняў. Як яны ўмудраюцца дастаткова доўга і адносна мірна жыць у адзінай дзяржаве?***

— На час абвешчання незалежнасці ў 1947 годзе Індыя мела каланіяльную адміністратыўную схему, якая, натуральна, не адпавядала этнічным межам. Існавалі правінцыі, што кіраваліся прадстаўнікамі брытанскага губернатара, якога, у сваю чаргу, прызначаў Лондан. Таксама існавалі і так званыя «дзяржавы прынцаў» — аўтаномныя феадальныя адміністратыўныя адзінкі, якіх было каля 600. Самае парадаксальнае, што княствы былі больш развітыя ў плане дэмакратыі. Амаль усе арыстакраты княстваў атрымлівалі адукацыю ў лепшых брытанскіх навучальных установах і марылі перанесці прынцыпы выбарнасці чыноўнікаў на індыйскую глебу. Брытанскім чыноўнікам было не да гэтага. Пасля таго, як Індыя стала незалежнай, кожны мясцовы князь атрымаў права далучыцца са сваім народам або да Пакістану, або да Індыі. Большасць пагадзілася застацца ў Індыі. Толькі ў адным выпадку афіцыйны Дэлі не прызнаў выбар феадалам Пакістана. Вотчына таго князя была захоплена войскамі, якія даслалі з цэнтру. Адміністратыўная вертыкаль у першыя гады незалежнасці выглядала наступным чынам: А) штаты, створаныя на базе былых правінцый Брытанскай Індыі; Б) былыя княствы; В) штаты, сфармаваныя шляхам аб'яднання правінцый і штатаў. Акрамя таго, былі створаны асобныя штаты, кшталту Кашміра.





***— Відавочна, што адміністратыўныя межы штатаў, сфармаваныя ў часы каланіялізму, не адпавядалі моўным і этнічным межам. Ці былі прыклады перагляду межаў штатаў?***

— Так, былі. Ужо ў 1953 годзе па патрабаванню мясцовых нацыяналістаў створаны асобны штат Андхра-Прадэш. У 1953 годзе было вырашана стварыць парламенцкую камісію, якая займалася размежаваннем. У 1956 годзе быў прыняты так званы States Reorganisation Act, які заклаў асновы размежавання паміж штатамі і сфармаваў правілы стварэння новых адміністратыўных адзінак. Аднак не трэба блытаць прынцып індыйскага размежавання з прынцыпам, які існаваў у СССР. У вас на першым месцы быў крытэрый нацыі. У нас — мова. Напрыклад, я паходжу з Калькуты, дзе жывуць мусульмане, індуісты, хрысціяне. Для нас галоўны сродак камунікацыі — бенгальская мова.

***— Як і калі паўстаў рух за стварэнне штата Тэленган? Дарэчы, гэта амаль побач з горадам Бангалор, чыё імя носіць плошча ў Мінску, куды дасылаюць пратэставаць апазіцыю і якая дзякуючы гэтаму стала сімвалам беларускага аўтарытарнага рэжыму.***

— Край Тэленган, які зараз знаходзіцца ў складзе штата Андхра-Прадэш, — гэта дастатковая вялікая вобласць памерам каля 114800 квадратных кіламетраў. Тэленган — раён пражывання народу Цегулу. Цегулу — індуісты. Калі верыць легендам, у Тэленгане адзін час жылі багі Шыва і Саці. У XIV стагоддзі край быў акупаваны мусульманамі. У XVIII стагоддзі тут была створаная асобная дзяржава. Яе кіраўніцтва дзеля тактычных мэтаў пайшло на кантакты з брытанцамі. Адпаведна, пасля ўваходжання ў склад Брытанскай імперыі край атрымаў права аўтаноміі. Аднак цегулу аказаліся ў двух штатах. Сітуацыяй скарысталіся камуністы, якія былі ў апазіцыі. Пачынаючы з 1949 года ў рэгіёне працягвалася нацыянальна-вызвольнае паўстанне — часам у вялікіх, часам у малых памерах. Тым не менш, ідэя стварэння асобнага штата для цегулу паступова пачала авалодваць масамі. На выбарах 2004 года Індыйскі нацыянальны кангрэс — адна з самых буйных партый краіны — упершыню паабяцаў у выпадку перамогі стварыць штат Тэленган. Хутка лозунг падхапілі ўсе іншыя федэральныя партыі. У 2009 годзе пачаўся заканадаўчы працэс стварэння новага штата. Спачатку за такі праект выступіў мясцовы парламент, пасля нацыянальны.

***— Ці існуе ў Індыі праблема сепаратызму?***

— Парадаксальна, аднак стварэнне новых штатаў і ёсць форма барацьбы з сепаратызмам. У 2000 годзе на поўдні штата Біхар быў створаны штат Джаркханд. Ініцыятары стварэння новага штата раней разглядалі яго як крок да выхаду з складу Індыйскага Саюза. Атрымаўшы статус штата, яны перагледзелі свае пазіцыі, сталі больш памяркоўнымі.

***— Неяк усё занадта проста. Ці не было негатыўных рэакцый на стварэнне Тэленгана?***

— Натуральна, былі. Праблем хапае да гэтага часу. 15 дэпутатаў рэгіянальнага парламента ў знак пратэсту супраць стварэння Тэленгана адмовіліся ад мандатаў. Сярод іх Чыранджыві — вядомы індыйскі актор, дэпутат парламента, чый артыстычны імідж нагадвае вашага Карачанцава. Акрамя таго, пакуль не зразумела, ці стане сталіцай Тэленгана горад Хайдарабад. Гэта сусветная сталіца лабараторый новых кампутарных тэхналогій. Тут працуюць офісы самых вядомых IT-кампаній свету. Мультыкультурны Хайдарабад не вельмі імкнецца быць сталіцай маленькага, па індыйскіх мерках, штата. Аднак у прынцыпе нічога трагічнага тут няма. Індыя — самая вялікая ў свеце дэмакратыя. Мы ведаем, што менавіта праз спрэчкі і пошук кампрамісу можна знайсці рашэнне. Дарэчы, менавіта таму ў часы «халоднай вайны» наша кампартыя неахвотна дасылала маладых актывістаў на вучобу ў СССР. Партыі былі патрэбны людзі, якія здольныя спрачацца, а ў Савецкім Саюзе штампавалі фанатыкаў, якія не пасавалі і не пасуюць рэаліям індыйскай палітыкі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Па вялікім рахунку, з боку Беларусі выконваецца мінімум дамоўленасцяў з шэрагу тых, якія Расія здолела з ёй заключыць за час існавання саюзнага праекта. Акрамя таго, нельга забываць пра неаднаразовыя заявы Аляксандра Лукашэнкі накont таго, што ён збіраецца дыверсіфікаваць экспарт за кошт Еўропы і будаваць гандлёвыя адносіны з ЕС. На дадзены момант сітуацыя развіваецца наступным чынам: МВФ дае Беларусі грошы. Пакуль у Беларусі ёсць сродкі, яна можа рабіць нейкія рухі ў бок Расіі. Але калі грошы ў Мінска скончацца, і калі мы, адпаведна, адмовімся іх даць, пачнецца гульня ў зваротным кірунку.

**Regnum (Расія)**

Мэтай кіраўніка дзяржавы з'яўляюцца не рэформы, а кантроль над самымі важнымі прадпрыемствамі. Першапачаткова было заяўлена пра продаж акцый 510 дзяржаўных прадпрыемстваў. Аднак сёння эксперты з German Economic Team кажуць пра прыпыненне працэсу прыватызацыі. І калі сумеснае прадпрыемства з нямецкім вытворцам грузавікоў MAN знаходзіцца ў прыватных руках, то на трактарным заводзе імя Леніна сацыялізм не скончыўся: для зніжэння выдаткаў эканомяць нават на святле. Пры гэтым, па словах дырэктара завода, справы ідуць выдатна і прыватызацыя не плануецца. Аднак следчыя з дзяржаўнага камітэта па кантролю выявілі факты продажу па дэмпінгавых коштах прадукцыі заводу ў Расію. Падобныя навіны прымушаюць Лукашэнку адкрываць сваю краіну для Захаду ў большым маштабе, чым планавалася. Еўропа таксама на гэта спадзяецца — і нават зняла накладзены на кіраўніцтва краіны пасля фальсіфікацыі выбараў у 2006 годзе забарону на ўезд.

**«Spiegel» (Германія)**

Дык чаму ж улады не пакідаюць у спакоі Мікалая Аўтуховіча? Дакладней сказаць, гэта ён ім не дае жыцця. Адразу пасля ўмоўна-датэрміновага вызвалення ў студзені 2008 года Аўтуховіч працягнуў актыўную грамадскую дзейнасць. Ён становіцца сустаршынёй рэспубліканскага Руху ветэранаў вайны ў Афганістане. Няцяжка пралічыць рэакцыю ўлады. Пасля заявы пра стварэнне арганізацыйнага камітэта партыі ўдзельнікаў вайны ў Афганістане міліцыя выявіла ў Камароўскага фальшывыя долары. Арышт Аўтуховіча адбыўся пасля яго адмовы атрымаць ад Лукашэнкі юбілейны медаль да 20-годдзя заканчэння вайны ў Афганістане. Палітычная арганізацыя ветэранаў войска і сілавых структур уяўляе для рэжыму сур'ёзную небяспеку. Як Беларускі саюз афіцэраў, які ствараў генерал МУС Беларусі Юры Захаранка, што знік у 1999 годзе.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Масква даўно чакае ад традыцыйнага партнёра прызнання дзвюх рэспублік, аднак прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адцягвае рашэнне пытання, не кажучы ні «так», ні «не». Лукашэнка, у прыватнасці, запатрабаваў спыніць ціск і заявіў, што прызнанне каўказскіх рэспублік — справа Беларусі. «Мы незалежная суверэнная краіна і ўсё будзем рабіць у нашых інтарэсах», — сказаў тады беларускі прэзідэнт. На мінулым тыдні былі дасягнуты дамоўленасці пра тое, што Масква і Мінск захаваюць кошты на нафту і газ у наступным годзе на ўзроўні 2009 года, але і гэта не зрабіла Мінск больш згаворлівым.

**«Газета.ру» (Расія)**

У Еўропе не хаваюць, што не задаволеныя тэмпамі рынкавых і дэмакратычных змен у краіне. Улады не зрабілі «незваротных крокаў», не даказалі «справай, а не на словах», што будуць выконваць рэкамендацыі ЕС. Тым не менш беларускія эксперты ацэньваюць знешнюю палітыку Беларусі як на заходнім кірунку, так і на ўсходнім як паспяховую. Палітыка балансавання паміж Расіяй і Еўропай працягвае прыносіць Мінску дывідэнды. Як вынікае з заяваў, зробленых на мінулым тыдні пасля працяглых расійска-беларускіх перамоў на энергетычную тэматыку, у Беларусі маюцца сур'ёзныя шанцы атрымліваць у 2010 годзе нафту і газ на прымальных для яе ўмовах. Беларускія палітолагі ўпэўнены, што Лукашэнка будзе выкарыстоўваць палітыку арэляў, пакуль яна будзе эфектыўнай.

**«Независимая газета» (Расія)**

ДЫПЛАМАТЫЯ

# РАСІЯ СЫХОДЗІЦЬ У АКІЯН

Алег ПЯТРОЎ

**Прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі карлікавай ціхаакіянскай краінай Науру выклікала значную цікавасць расійскага грамадства. Прапануем агляд каментараў на інтэрнэт-форумах.**



Рэспубліка Науру. Насельніцтва 13 тысяч чалавек. Плошча 2100 гектараў. Самая маленькая незалежная дзяржава

Як сцвярджаюць крыніцы, Науру атрымала ад Масквы за прызнанне 50 мільёнаў долараў. Але ёсць такія расіяне, якія трактуюць падзею як вялікі поспех сваёй дыпламатыі. Вось іх аргументацыя.

«У гэтым і ёсць сутнасць геапалітыкі. Таму не варта іранізаваць з нагоды радаснай рэакцыі ўладаў Абхазіі і Паўднёвай Асеціі на прызнанне іх незалежнасці яшчэ адной дзяржавай. Гэта заканамерная і адэкватная рэакцыя на новы міжнародны кантакт. Прапаную задумацца наконт іншага пытання: што ў выніку ўсяго гэтага можа атрымаць Расія? Часам здаецца, што Расія на міжнароднай арэне дзейнічае арыгінальна. Але не будзем забываць пра тое, што Расія разлічвае стаць адным з архітэктараў новага шматпалярнага свету. Імкнучыся да дасягнення гэтай мэты, Расія выбудоўвае новую, заснаваную на іншых прынцыпах сістэму міжнародных адносін, таму што ранейшая «мадэль» апынулася недасканалай. Той факт, што вялікая роля ў гэтым працэсе адводзіцца новым каўказскім дзяржавам, відавочны нават дылетанту».

Аднак такая пазіцыя не вельмі папулярная. Большасць каментатараў адзначаюць, што гісторыя з Науру — сорам для расійскай дыпламатыі: «Мяне цікавіць такое пытанне: ці атрымаў спадар Лаўроў ад удзячных наурцаў якінебудзь ордэн за дыпламатычную перамогу? Хоць бы кольцы ў нос, высушаную галаву місіянера? Ці што-небудзь вырабленае з гуано, адзінага экспартнага прадукту астраўка? Але, у прынцыпе, не смешна. Людзі апусцілі прэстыж дзяржавы ніжэй нізкага. Да такіх вось перамог на дыпламатычным фронце, ад якіх Андрэй Грамыка круціцца ў труне. У краіне бракуе грошай на трансплантацыю касцявога мозгу для дзяцей, якія паміраюць ад лейкіміі. Між тым, дзяржава дае грошы прайдзісветам, якія не толькі нашага сатэліта гатовыя прызнаць, але і чорта з рагамі. За наяўны разлік, зразумела», — піша адзін з блогераў.

Дадатковым фактарам сумнявацца ў поспеху МЗС РФ стала брудная гісторыя вакол прызнання кіраўніцтвам Науру незалежнасці Тайваню. У выніку той гісторыі Науру атрымала мянушку «прадажная дзеўка Ціхага Акіяну». Адзін з наведвальнікаў інтэрнэту нагадвае храналогію падзей:

«1980 год. За амерыканскую гуманітарную дапамогу Науру ўсталёўвае дыпламатычныя адносіны з Тайванем (і адначасова разрывае адносіны з Кітаем). 21 ліпеня 2002 года Рэспубліка Науру разрывае дыпламатычныя адносіны з Тайванем і ўсталёўвае адносіны з Кітаем пад абяцанне Кітая актыўна інвеставаць у эканоміку Науру і забяспечыць краіну шырспажывам. Кошт пытання — 60 мільёнаў долараў ЗША. 9 мая 2005 года Тайвань запатрабаваў аднавіць дыпламатычныя адносіны. Науру была не супраць, аднак патрабуе інвестыцый у сферу турызму. І атрымлівае іх».

Аўтар робіць выснову: «Науру ніколі не брала натурай, толькі грашыма. Калі туды сунуцца амерыканцы і прапануюць падтрымаць іх энергетыку, рэспубліка прадынаміць Расію».

Рашэнне Науру пра прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі выклікала ўздым шавіністычных настрояў і геапалітычных амбіцый. Далей за ўсіх пайшоў Сяргей Бялкоўскі, дырэктар Агенцтва палітычных навін (АПН). Ён прапанаваў увогуле выкупіць усе малыя астравы Ціхага Акіяну і перасяліць туды расійскую палітычную эліту.

Аўтар сыходзіць з такіх тэзісаў: Расія — прастора, якой з-за памераў немагчыма эфектыўна кіраваць; насельніцтва Расіі знаходзіцца ў стане псіха-гістарычнай дэпрэсіі; у Расіі вельмі дрэнны клімат.

Адсюль неабходна «рашэнне пра перавод Расіі ў новае геаграфічнае месца» — на астравы Ціхага акіяну. Новаму праекту ўжо нават прыдумалі назву — Ціхаакіянская Расійская Федэрацыя (ТоРФ). Палітолаг, акрамя таго, склаў спіс дзяржаў, якія патэнцыйна могуць стаць суб'ектамі ТоРФ: Вануату, Кірыбаці, Науру, Палау, Самоа, Тонга, Саламонавыя астравы, Тувалу, Мікранезія. І вылічыў, колькі будзе каштаваць для расійскага бюджэту іх набыццё. Атрымалася не так ужо і шмат — усяго прыкладна 5 мільярдаў долараў.

Што Расія атрымае, калі пераедзе ў Ціхі Акіян? Калі верыць Бялкоўскаму, шмат чаго: добры клімат (24–27 градусаў круглы год), працоўныя рукі ў выглядзе тубыльцаў. Як адзначае Бялкоўскі, абарыгены «п'юць не шмат».

Асобная тэма: як будзе вырашана праблема загадковай рускай душы. «Пераезд Расіі з Еўразіі ў Ціхі акіян дазволіць нам правесці карэкцыю генетычнай памяці. У трапічным клімаце малых выспаў фантомы ўзятых калісьці берлінаў, парыжаў не будуць трывожыць нашы душы. Расіяне нарэшце стануць нармальным народам». Застаецца дадаць, што ў ТоРФ Бялкоўскі прапануе перасяліць усяго 350 тысяч чалавек — самых лепшых грамадзян РФ.

Артыкул Бялкоўскага часам здаецца жартам, аднак шмат хто падтрымаў праект расійскага Ноевага каўчэга. У расійскім інтэрнэце можна сустрэць цікавыя думкі наконт таго, каго трэба браць на астравы, а каго пакінуць на гістарычнай радзіме.

«Сталіністаў, алкашой і мянтоў не браць», — раіць адзін з наведвальнікаў інтэрнэт-форуму.

Так ці інакш, можна сцвярджаць, што загадковая афера з прызнаннем Науру незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі вельмі моцна дэманціравала міфы расійскай дзяржаўнай прапаганды пра тое, што міжнародная супольнасць падтрымлівае сепарацыю Грузіі.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЮЛІЯ ЦІМАШЭНКА



У рамках прэзідэнцкай кампаніі прэм'ер-міністр Украіны Юлія Цімашэнка прыдумала незвычайны піярны крок, які зараз абмяркоўвае ўся краіна. Яна знялася для білборду з сапраўдным тыгранём, якога раней падаравала кіеўскаму заапарку. Тыгранё завуць Тыгруля. Пад выявай подпіс «2010 — год Белага тыгра». Сэнс паслання ў тым, што наступны 2010 год па ўсходняму календару год Тыгра, таму гармонія жывёлы і палітыка на здымку павінна давесці, што Юлія — лепшы палітык для наступнага тыгрынага года. Праблема, аднак, у тым, што адзіны з 18-ці кандыдатаў, які сапраўды нарадзіўся ў год Тыгра — галоўны канкурэнт Юліі Цімашэнка Віктар Януковіч. Што да прэм'ера, то яна нарадзілася ў год Пацука (1960 год). Гэты момант падштурхнуў палітолагаў са штабу Януковіча пачаць брудную кампанію супраць Юліі, якую яны называюць не інакш як «крысюля».

### АБДУЛА ТАМІ



Лідэр Партыі мусульман Фінляндыі, якая аб'ядноўвае этнічных фінаў, што прынялі іслам, выступае за стварэнне ў Фінляндыі «зялёнага грамадства». Абдула Тамі, якога да пераходу ў мусульманства звалі Рыста, нечакана здрадзіў калегам па барацьбе. Былы лідэр фінскіх мусульман сказаў, што сыходзіць з ісламскай партыі, каб узначаліць новую створаную ім партыю «За сацыялістычны свет». Больш таго, адным з праграмных пунктаў новай партыі Тамі стане барацьба з «рэлігійнай рыторыкай у палітыцы». Зразумець сутнасць палітычных кульбітаў Тамі вельмі цяжка. Сам ён кажа, што быў уражаны рэжымам Кадырава ў Чачні, які спрабуе выстаўляць сябе на знешняй арэне як ісламскі палітык. З іншага боку, Тамі вядомы як чалавек са шматлікімі палітычнымі кантактамі. Раней яго бачылі сярод фінскіх неанацыстаў. Таксама ён захапляўся рэлігіяй мармонаў. Само кіраўніцтва Партыі мусульман Фінляндыі пакуль не ведае, як рэагаваць на выхадкі свайго заснавальніка. На апошніх парламенцкіх выбарах партыя ісламістаў атрымала па ўсёй краіне 163 галасы. Застаецца дадаць, што партыя разглядае сябе як самую прарасійскую палітычную сілу ў Фінляндыі.

### ДЖЭРЫ АДАМС

Лідэр партыі «Шын Фейн», галоўнай партыі каталікоў Паўночнай Ірландыі, нечакана для ўсіх зрабіў экскурс у мінулае і прызнаўся, што ягоны бацька «эмацыянальна, фізічна і сексуальна» здзекаваўся са сваёй сям'і. Бацька Джэры быў фанатычным прыхільнікам аб'яднання Ірландыі. Яшчэ ў 1940 годзе ва ўзросце 16 гадоў ён уступіў у Ірландскую рэспубліканскую армію і быў цяжка паранены падчас сутычкі з брытанскімі войскамі. Памёр стары Адамс у 2003 годзе. Калі верыць сыну, ён быў сямейным тыранам і часта біў жонку. Сваю заяву пра нездаровую атмасферу ў сям'і (дарэчы, у Адамсаў было 10 дзяцей) лідэр «Шын Фейн» зрабіў у рамках кампаніі супраць гвалтоўных адносінаў у каталіцкіх сем'ях. І перш за ўсё ў сем'ях сяброў партыі. Адпаведна статуту партыі, сапраўдны рэспубліканец ні за што на свеце не будзе звяртацца па дапамогу да брытанскай паліцыі. Увогуле, усе праблемы вырашае спецыяльны партыйны суд. Менавіта такая ўстаноўка перашкаджае жанчынам — галоўным ахвярам пабытавага гвалту — скардзіцца ў паліцыю на мужа. Цяпер «Шын Фейн» вырашыў пакончыць з гэтым. Джэры Адамс заклікаў усіх рэспубліканак у выпадку канфлікту з мужам тэлефанаваць у спецыяльныя дзяржаўныя службы.



МУЗЫЧНЫ АГЛЯД

# ГОД 2009: СУТАРГІ КУЛЬТУРНАГА КАЛАНІЯЛІЗМУ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Псіхолагі сцвярджаюць, што аператыўная памяць чалавека мае такія асаблівасці, што выціскае ўспаміны больш позняга тэрміну. Вось і свежыя ўражанні айчыннага меламана падказваюць: усё ў беларускім рок-руху ціп-топ! Толькі што адбыліся аншлагавыя канцэрты гуртоў «N.R.M.», «Neuro Dubel», «:B:N:», ніхто не адмяняў 75-працэнтную квоту на ратацыю твораў беларускіх выканаўцаў у эфіры, а айчынную фанатэку папоўнілі цікавыя альбомы і складанкі беларускіх выканаўцаў.**

Але калі кінуць рэтраспектыўны позірк на працэсы ў беларускамоўным сегменце айчыннай рок-музыкі, то становіцца відавочным, што мінулы год для гэтых выканаўцаў нельга назваць выніковым напоўніцу. Слухачы чакалі новых альбомаў і канцэртаў ад лідэраў айчыннага року, але амаль цэлы год іх выступленні не праводзіліся, новыя рэлізы не прэзентаваліся. Адны музыканты былі заняты рэалізацыяй асабістых праектаў, іншыя — адпачывалі або папросту цешыліся сваім становішчам лідэраў.

Такая заспакоенасць мела негатыўныя вынікі — слухачы пераадрасоўвалі сваю прыхільнасць іншым выканаўцам, больш актыўным і камерцыйна паспяховым. Гэта дало падставу некаторай частцы тутэйшага музычна-крытычнага бамонду абвясціць пра змену лідэрства на айчыннай рок-сцэне. Без цені сумневаў яны канстатавалі: «Сёння праблема «N.R.M.» у тым, што гурт не можа пашырыць сваю аўдыторыю, у адрозненні ад гурта «Ляпіс Трубяцкой». Гэта фраза не выпадковая: мінулы год стаў апагеем праекта падмены ў вачах маладых слухачоў беларускамоўных лідэраў на рускамоўных.

Шкада, што такім таранам стаў папулярны поп-рок-гурт «Ляпіс Трубяцкой», які ў гэтым годзе меў даволі значны поспех. Музыканты выдалі новы альбом «Культпрасвет», знялі шыкоўныя відэакліпы, далі паспяховыя канцэрты ў Беларусі, Расіі і ЗША, за што атрымлівалі ад расійскага шоубіза розныя прэстыжныя рэспекты.

Рэцэпт для здзяйснення гэтага фокуса быў просты: некалькі песень з моцнымі актуальнымі рыфмамі, кшталту «Belarus Freedom», «Рамонкі» і «Ружовыя акуляры», абавязковая галоўная карона на «Рок-каранацыі», пара разгорнутых на канцэртах белчырвона-белых сцягоў...

Пасля ўсіх гэтых «поспехаў» заставалася толькі рэпрэзентаваць гурт у якасці лідэра беларускага андэграўнду на знакавых і ад пачатку беларускамоўных фэстах, кшталту «Басовішча» ці «Be Free». Не істотна, што ўдзел у іх разбураў фармат гэтых фэстаў, бо галоўнай была мэта — замацаваць у вачах найбольш прагрэсіўнай часткі моладзі лідзіруючы стан гурта «Ляпіс Трубяцкой». І — якая ўдача! — з дапамогай саміх тубыльцаў рэалізоўваць «культурную» каланіяльную палітыку, камерцыйна прыбытковую, папсовую і рускамоўную адначасова.

Не атрымалася з «RASTA» і «ДетиДетей», затое «Ляпіс Трубяцкой» тут прыйшоўся да месца! Шкада, што таленавітыя музыканты сышлі са сваёй камерцыйнай поп-дзялянкі і сталі зброяй у руках тых, каму муляе сённяшні стан беларускамоўнай музыкі. Каму важна, каб наша моладзь адвярнулася і больш не ўзгадвала сваіх ранейшых беларускамоўных куміраў.

Але аглушальны поспех калядных канцэртаў гурта «N.R.M.», як і выступы іншых выканаўцаў, паставілі пад сумнеў іх марныя спадзяванні. Моладзь разумее, што сапраўдныя прадстаўнікі сучаснай беларускай музычнай культуры, якія б яны паспяховыя ні былі ў суседніх краінах, не маюць права ігнараваць родную мову!

Што тычыцца іншых рускамоўных выканаўцаў, то гэты год яны ўсё больш аддаляліся ад беларускага культурнага дыскурсу, аж да такой ступені, што іншы раз хацелася перапытаць некаторых з іх: чаму цыркавое шоу «Мама-Афрыка» пазначалася ў рэкламе як «экзатычнае», а, напрыклад, гурт «Без білета», які выдаў альбом «Афрыка», упарта імкнуўся звацца «беларускім»?

***

На іншым крыле сучаснага музычнага мастацтва краіны — у шэрагах выканаўцаў дзяржаўнай поп-музыкі — панавала чаканне новых датацый і чарговай магчымасці «засвяціцца» на «Еўрабачанні» за дзяржаўны кошт. У гэтых выканаўцаў пакуль няма разумення таго, якіх мелодый і рытмаў чакаюць ад беларусаў на «Еўрабачанні». І нават калі б гэтае разуменне з'явілася, то не гарантавала б ім поспех.

Бо ні кашулі-вышыванкі ў падтанцоўцы, ні цымбалы ў аранжыроўках не нададуць нацыянальнага каларыту выканаўцам, у якіх душа атрымала доўгатэрміновую прышчэпку ад усяго беларускага. Да таго ж, сёлетні поспех на «Еўрабачанні» нарвежскага выканаўцы, этнічнага беларуса Аляксандра Рыбака засведчыў, што мы маем справу з працэсамі глабалізацыі на кантыненце, а ў яго выпадку — з глыбокім сплавам нацыянальнага ў папулярнай музыцы. Рэцэпт поспеху Рыбака просты: важна быць пазнавальным, але ні ў якім разе нельга губляць свайго нацыянальнага аблічча!

***

На жаль, рашучых зменаў і ў айчыннай фанаграфіі таксама было няшмат. Тыя ж гульцы беларускага аўдыё-рынку ў асноўным займаліся выданнем, тыражаваннем і распаўсюдам масавых накладаў дыскаў айчынных выканаўцаў.

Праўда, у якасці выдаўцоў CD-прадукцыі дэбютавала кампанія «Будзьма», якая ў гэтым годзе прадставіла слухачам свой першы рэліз — зборку «The Best фолькмадэрн». Сярод стосу іншых дыскаў у асобны шэраг вылучаюцца гістарычна-рэтраспектыўныя выданні, сярод якіх адзначу рэлізы БМAgroup — дыск-прысвячэнне Наталлі Арсенневай «З крывіцкай сям'і», альбомы А. Камоцкага «Песня як жыццё», «28 зорка» легендарнай «Мроі», святочная музычная складанка культурніцкай камісіі БНФ «20 гадоў — 20 гітоў».

Не засталіся без жаданых набыткаў і прыхільнікі D.I.Y-культуры: іх калекцыі папоўніліся альбомам гродзенскага панкгурта «Deviation» «Чарговы дзень пад акупацыяй» і акустычным DVD-канцэртам ад гурта «IQ 48» «Зрабі сам». Ну а рэгіянальны рокрух нашай краіны быў збольшага рэпрэзэнтаваны магілёўскімі рок-камандамі. Альбомы гуртоў «Глюкі» і «Zatoczka» вылучаліся стылістычным каларытам і нябанальным поглядам на хвалюючыя маладых беларусаў тэмы. Першую прыступку ў намінацыі «Экстрэмальная арыгінальнасць», калі б такая намінацыя існавала, варта было б аддаць сталічнаму folk-medieval-metal-гурту «LitvinTroll» і іх альбому «Rock-&-troll» — цудоўнаму падарунку аматарам зыкаў беларускай дуды!

Сваю бонду ў запаўненне «белых плямаў» айчыннай класічнай музыкі зрабілі і незалежныя выдаўцы. Натхнёны прыкладам знанай Арыны Веleж, вядомы мінскі прадзюсер і калекцыянер беларускіх музычных рарытэтаў Уладзімір Азёма ў супрацы з фірмай «Global CD» ажыццявіў значны культурніцкі праект: выдаў два двайных альбома з беларускай прафесійнай музыкай XVIII і XIX стагоддзяў. Таксама ён не забыўся і пра беларускіх дзетак, прапанаваўшы іх бацькам CD «Чытанка для маленькіх»...

Год яшчэ не завяршыўся, і ў святочныя дні беларускіх слухачоў чакаюць яшчэ некалькі значных прэм'ер. Маю на ўвазе прэм'еру зборніка беларускамоўных кавераў на сусветна вядомыя хіты «Беларускі глобус», а таксама дыск праекта Лявона Вольскага «Такога няма нідзе», у запісу якога прынялі ўдзел сярод іншых і музыканты згаданага вышэй гурта «Ляпіс Трубяцкой». Зноў для іх выпадае шанец асэнсаваць сябе сапраўднымі беларусамі. Паглядзім, ці выкарыстаюць музыканты яго ў наступным годзе!

***

Завяршаючы свае нататкі, хачу звярнуцца да праблемы з трансляцыяй беларускай музыкі ўсіх напрамкаў на айчынных музычных тэлеканалах і FM-радыёстанцыях. Стан тут такі: калі б чыноўнікам з Мінінфармацыі загадалі праверыць выкананне мясцовымі FM-станцыямі пастановы пра 75 працэнтаў беларускай музыкі ў эфіры, то іх бы чакаў сапраўдны шок! Цяпер нават легендарных «Песняроў» пачуць — вялікая ўдача, не тое што гаварыць пра міфічныя 75 адсоткаў. Строга прытрымліваючыся літары закона і дадзенага дакумента, дарэчы, ініцыяванага Лукашэнкам, у іх з'явіліся б падставы ставіць пытанне пра закрыццё большасці з гэтых станцый.

Складваецца такое ўражанне, што тутэйшыя музычныя тэле- і радыёстанцыі кінуліся ў апошняе змаганне за важнейшы каланіяльны фарпост у краіне — рускамоўную папсу і яе тутэйшых апалагетаў. На жаль, ім не дадзена зразумець, што іх аднабаковыя культуртрэгерскія закіды толькі ствараюць глебу для далейшых супярэчнасцяў па нацыянальна-моўнаму пытанню. Таму ў перспектыве, калі беларуская дзяржава павернецца да патрэб сапраўднай нацыянальнай культуры, іх «намаганні» будуць мець самае непрыглядае адценне.



Фота аўтара



ВЫСТАВА

# СТАРЫ ВІЦЕБСК НА ПАЛОТНАХ ЮДАЛЯ ПЭНА

Аляксей ХАДЫКА

**Цяжка ўявіць сабе настолькі працавітага мастака, з майстэрні якога пасля смерці ў музей яго горада было б перададзена каля 800 твораў. І гэта далёка не ўсё са зробленага працавітымі рукамі майстра, летапісца Віцебска канца XIX і першай траціны XX стагоддзя, вялікага яўрэйскага жывапісца і настаўніка Юдаля Пэна (1854–1937).**


Юдаль Пэн.

33 працы, што прыехалі ў Мінск з Віцебска на выставу ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры, — толькі невялікая частка творчага набытку патрыярха віцебскай школы, якому сёлета споўнілася 155 год. І таксама частка праекту «Культура не ведае правінцыі». Ды хіба Віцебск — правінцыя?

Так сталася з яўрэйскім мастацтвам Беларусі: большасць яго стваральнікаў набывалі вядомасць па-за яе межамі, там, дзе ў вольным свеце на мастацкім рынку знаходзілі свайго спажыўца творы самага рознага кшталту. Ад поўных кахання і палёту пачуцця жывапісных паэм Марка Шагала да мізантрапічных фантазій Хаіма Суціна.

Прычым, калі славу ў далёкіх землях набывалі «выхадцы» з Беларусі, то Пэн, наадварот, сюды прыехаў. І праславіўся тут найперш сваёй няспыннай, шматгадовай, тытанічнай працай. Народжаны ў Нова-Аляксандраўску Ковенскай губерні, навучаны ў школе П. Чысцякова ў Акадэміі мастацтваў Пецярбурга, ён трапіў у Віцебск у 1891 годзе па запрашэнні губернатара В. Левашова.

Ужо праз год у Віцебску працавала Школа малявання і жывапісу, першая ў Беларусі яўрэйская мастацкая вучэльня, сведчанне нацыянальнага рэнесансу, які перажывалі ў гэты час розныя народы Расіі. Пералічыўшы толькі частку вучняў Пэна, атрымаем амаль энцыклапедычны збор мастакоўскіх імён: Марк Шагал, Лазар Лісіцкі, Саламон Юдовін, Заір Азгур, Восіп Цадкін, Аскар Мешчанінаў, Яфім Мінін. Спіс няпоўны. Але паставім кропку, каб звярнуцца да работ самога Пэна.

Вельмі моцная, спелая акадэмічная традыцыя — гэта тое, што ён прывёз у Віцебск з расійскай паўночнай сталіцы ў 1890-я гады. Тое, чаму захаваў вернасць праз усё жыццё, эвалюцыянуючы да больш фактурнага, каларытнага



жыццёвымі дэталямі мастацтва. На «традыцыю» з гадамі ўсё больш моцны адбітак накладаў узнёслы і прыгожы беларускі горад, з яго сівой даўніной, вытанчанымі архітэктурнымі ансамблямі і простым і абаяльным яўрэйскім жыццём «аднапавярховага» правінцыйнага цэнтра мяжы аселасці.


Марк Шагал. Мастак Юдаль Пэн. 1915 г.

Арганізатары выставы ўдала ўключылі ў экспазіцыю паштоўку, атрыманую Пэнам у 1937 годзе, годзе смерці, ад яго вучня Шагала. «Я б пэўна цяпер не пазнаў яго, — піша пра ўлюблёны Віцебск Марк Шагал. — Мая Пакроўская вуліца змянілася. І як пажываюць мае домікі, у якіх я дзяцінства правёў, і якія мы разам з Вамі калісьці пісалі...»

А Пэн, як і на мяжы стагоддзяў, яшчэ доўга працягваў ствараць летапіс горада — невялікія палотны, эцюды, з выявамі вуліц вакол Віцьбы, млына на рацэ, куткоў родных мясцін.

Прыватны аспект жыцця зафіксаваны яго творчасцю і праз два яго іншыя ўлюбёныя жанры, узоры якіх прадстаўлены на выставе: партрэты і вобразы побытавага характару, ад аднафігурных да групавых. Дробныя рамеснікі — шкляр, тынкоўшчык, гадзіннікар, стары з кошыкам — сацыяльны зрэз жыцця Віцебска на зломе эпох ад расійскай да савецкай імперыі. З часоў першай сусветнай вайны і рэвалюцыі — вобразы шматлікіх бежанцаў, жанчыны, дзеці — найлепшая ілюстрацыя да падручніка гісторыі. Гісторыі цяжкай. Але перададзенай з тыповай пэнаўскай мяккасцю спачування.

З твораў мастака, якія ў Мінску прадставілі дырэктар Віцебскага краязнаўчага музея Глеб Савіцкі і рэстаўратар Юрый Кегелеў, у горадзе, якому Пэн аддаў творчае жыццё і дзе пасля яго смерці дзейнічала галерэя яго імя, сёння захавалася 167 яго палотнаў, 17 графічных аркушаў, дакументы, фотаздымкі.

Досыць вялікае багацце, якое перажыло дзве навалы. Другую сусветную вайну, калі перад прыходам немцаў у горад палотны, зняўшы з рамаў, паспелі дасланць у скрынях на Усход. І дзесяцігоддзі забыцця за савецкім часам, калі жывапіс так і марнаваўся ў вернутых у Віцебск скрынях. І ужо новы беларускі час вярнуў іх да жыцця, таксама як паступова, не без цяжкасцяў і супярэчнасцяў, аднаўляецца сёння зруйнаваны Саветамі стары Віцебск.

Так ці інакш, выстава Пэна — яскравая прыкмета здольнасці да адраджэння і неўміручасці сапраўднай культуры. Да 31 студзеня 2010 года ў гэтым могуць пераканацца яе мінскія наведвальнікі.

ЦІКАВА

# МАНУМЕНТАЛЬНАЯ ШАЎЧЭНКІЯНА

Аляксей ХАДЫКА

**Колькі б, вы думалі, помнікаў Тарасу Шаўчэнку, украінскаму Кабзару, знаходзіцца ў розных краінах? Не толькі на радзіме, але і ў суседніх Польшчы, Беларусі, Расіі і Славакіі, у закаўказскіх краінах, у Францыі, Італіі, Канадзе? Не паверыце — каля тысячы.**

Украінцы пачалі клапаціцца пра памяць свайго вялікага паэта, увасобленую сродкамі скульптуры, яшчэ да 1917 года — адзін з першых манументаў стаіць у Будзілаве ў Івана-Франкоўскай вобласці. Скульптуры ўвасаблялі памяць і паэзіі, і высокага нацыянальнага духу.

Так і атрымалася, што вобраз Шаўчэнкі ў скульптуры — як амбасадар украінскай прысутнасці ў свеце. Можна было сцерагчыся, што выстава 120 фотаздымкаў манументальнай шаўчэнкіяны, адчыненая 18 снежня ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры ў Мінску, — фотаработы маладога фатографа Руслана Тэліпскага, — будзе глядзецца свайго роду афіцыёзным мемарыялам, увасабленнем палітычнага нацыянальна-прапагандысцкага праекту.

Але сама колькасць скульптур дазволіла аўтару прасачыць у манументах адбітак самых розных бачанняў мастацкай задачы. Шаўчэнка — паэт і змагар. Шаўчэнка, убачаны як сын свайго народу, малы хлопец, які выйшаў з натоўпу мільёнаў падобных. Шаўчэнка — штампаваны вобраз з арсеналу абліччаў тыповай «лeнініяны», адрозны ад стандартнага Ільіча хіба што шыкоўнымі вусамі. І розныя лёсы твораў. Дзесьці шанаваныя як цэнтральныя мемарыялы гарадоў, да якіх, быццам у храм, прыходзяць маладыя падчас вяселля. Дзесьці — закінутыя ў старых дварах, часам ужо знішчаныя, гіпсавыя аднадзёнкі. Перапляценне лёсу вобраза з няпростым лёсам народа.

Тым і адметная выстава. У помніку 1973 года ў Рыме, працы італьянца У. Маццэі, Шаўчэнка паўстае ў абліччы рымскага патрыцыя, падманваючы, як знакаміты партрэт Скарыны ў дворыку Падуанскага універсітэта, сваёй «старажытнасцю».

У творы 1935 года ў Харкаве, работы М. Манізера і І. Лангбарда, — таленавітае дапасаванне да мастацкай тэмы канструктывісцкай эстэтыкі. Уласна тое, што робіць працу гэтых жа аўтараў, прысвечаную Леніну на плошчы Незалежнасці ў Мінску, фактам мастацтва, а не толькі палітычнай маніфестацыяй. І што прыемна, паўсталыя ў Беларусі памяткі Шаўчэнку, у Мінску, Слуцку, Брэсце, Магілёве — з шэрагу адметных і творчых увасабленняў тэмы. Як тая вершаваная цытата па-ўкраінску на помніку ў Ромнах: «*І оживу, і думку вольную на волю из домовини воззову*».

Паэзія, прачытаная праз скульптуру і прааналізаваная дапытлівым поглядам фатографа, — цікавае відовішча, на якое музей запрашае па 10 студзеня.


Помнік Тарасу Шаўчэнку ў Рыме. Скульптар У. Маццэі. 1973

## АНОНС

### НА КАЛЯДНЫЯ СВЯТЫ

**Нацыянальны музей гісторыі і культуры** (вул. Маркса, 12) у навагодні час па суботах (26 снежня, 2 і 9 студзеня) запрашае на батлеечныя спектаклі, штогадзіны з 12.00 па 16.00 — агляд экспазіцыі можна спалучыць са знаёмствам з традыцыйным лялечным тэатрам.

**Нацыянальны мастацкі** (вул. Леніна, 20) з 3 снежня па 15 студзеня — не зусім звычайны праект «Дзмітрый Малаткоў. Мастацтва эстампа». Фактычна ён прысвячаецца творчасці суаўтара друку графічных аркушаў, які ўдзельнічае ва ўвасабленні першапачатковай задумы тэхнічнымі сродкамі — рыхтуючы друкарскі станок, паліграфічны камень і іншыя прыстасаванні, звязаныя з рэалізацыяй твора станковай графікі ў розных спосабах друку. Гэта і літаграфія, і афорт, і ксілаграфія, і лінагравюра.

Музей сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) запрашае з 22 снежня па 9 студзеня пазнаёміцца з палотнамі маладых (як заўсёды, у нас гэты статус маюць мастакі да 35 год) выпускнікоў 1999–2000 гадоў Акадэміі мастацтваў Андрэя Пяткевіча і Уладзіміра Зленка на выставе «Рыба Love». Аўтары абяцаюць «мноства асацыяцый, гульні, глыбіні і гумару», якія выявяцца ў суплёце язычніцкіх і хрысціянскіх культурных традыцый.

**Палац мастацтваў** (вул. Казлова, 3) з 23 снежня па 17 студзеня — адпаведны часу мастацкі праект «Каляды фэст» — творы мастакоў, выкананыя ў розных тэхніках на зімовую ці калядную тэматыку. Фармат фэсту не зусім звычайны — да ўдзелу запрошаны не толькі сталыя сябры Саюза мастакоў, але і студэнты мастацкіх вучэльняў і нават таленавітыя аматары. Пройдуць дабрачынныя акцыі ў падтрымку дзеяння «Беларускага дзіцячага хоспісу. Асобна будзе прадстаўлены «Полацкі абярэг», вялізнае палатно 3х25 метраў, якое складаецца з кавалкаў вышытых або выкананых у іншых тэхніках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва фрагментаў, твораў прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў свеце ў гонар нашага найстаражытнага культурнага цэнтра.

**Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны** сумесна з Польскім Інстытутам



у Мінску з 22 снежня па 1 сакавіка знаёміць з экспазіцыяй «Юльюш Славацкі на паштоўках канца XIX — пачатку XX стагоддзяў», прысвечанай жыццю і творчасці знакамітага польскага паэта і драматурга эпохі рамантызму. Гэта чарговая прэзентацыя калекцый У. Ліхадзедава, зборы якога, прысвечаныя гісторыі гарадоў Беларусі, ужо добра вядомыя па шэрагу ранейшых паказаў і публікацыях у шыкоўных сувенірных альбомах.

**Галерэя «Zнята»** ў кінатэатры «Цэнтральны» прываблівае фотааматараў адразу двума паказамі. «Вяртанне з адпачынку» Юрыя Кулікова — імпрэсіяністычны аповед, які злучае пясчаныя пляжы Балгарыі і мінскія вуліцы. А «100% Арабіка» — успаміны фатографаў і спелеолагаў Аляксея Антаненкі, Віталія Раковіча, Дзмітрыя Бельскага пра глыбейшыя ў свеце — да 2191 метраў — пячоры ў Абхазіі, у гарах Заходняга Каўказа і пра самі горы.

### ДЛЯ ДЗЕТАК

**Купалаўскі** 29 снежня аб 11.30 «Прыгоды Заранкі і Янкі», прэм'ера, а 3 студзеня, у нядзелю, у **Тэатры лялек** аб 11 гадзіне — дзіцячая класіка «Піпі — Доўгаяпанчоха» (па-руску), адзін з першых прагонаў



спектакля, які ўжо здабыў добрыя водгукі гледачоў.

Яшчэ адзін прэм'ерны спектакль на галоўнай нацыянальнай сцэне — 28 снежня, «Translations» Б. Фрыла.

6 студзеня на **малой сцэне Купалаўскага** — «Старамодная камедыя» ў пастаноўцы Валерыя Раеўскага і рэжысуры Аляксея Арбузава. Камерную дзею на суд гледачоў прадстаўляюць заслужаная артыстка Аўтаномнай Рэспублікі Крым Ала Ельяшэвіч у дуэце з заслужаным артыстам Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Рагаўцовым.

**Купалаўскі** ў той жа дзень — «Хам» паводле Э. Ажэшкі ў рэжысуры Аляксандра Гарцуева (прэм'ера 10 чэрвеня). Выдатны ансамбль акцёраў — Валянціна Гарцуева, Святлана Зелянкоўская, Ігар Дзянісаў, Аляксандр Абрамовіч, Генадзь Аўсяннікаў. Гісторыя пра каханне, «адвечная і разам з тым незвычайная, складаная і трагічная, але ж і такая простая, бо самае галоўнае ў каханні — гэта разумець адзін аднаго». Цікава, што Купалаўскі тэатр ужо ставіў гэтую п'есу — ажно ў 1921 годзе.

**Падрыхтаваў Аляксей Хадыка**






Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 707
Падпісана да друку 24.12.2009. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.